WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

7 МАЯ 2011 г.
СУБОТА
№ 84
(26948)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

### *Дарагія суайчыннікі!*

**Сардэчна віншую вас са святам — Днём Перамогі**

Гэтая дата навечна ўпісана ў гісторыю нашай краіны. У гераічным летапісе Беларусі не было бітвы больш жорсткай, чым Вялікая Айчынная вайна. Не было подзвігу больш значнага, чым подзвіг савецкага салдата, які абараніў Радзіму ад ворага, выратаваў свет ад нацызму.

Беларускі народ, як ніхто іншы, ведае цану міру і вышэй за ўсё ставіць гонар і свабоду сваёй Айчыны. Мы захоўваем у сэрцах не толькі мужнасць, гераізм, адвагу воінаў і працаўнікоў тылу, але і горыч страт ваеннага ліхалецця. Мільёны беларусаў назаўсёды засталіся на палях бязлітасных баёў, набліжаючы шчаслівы дзень усенароднага трыумфу і славы — дзень Вялікай Перамогі.

Дарагія ветэраны! Мы ў неаплатным даўгу перад вамі. Нізкі паклон і ўдзячнасць усім, хто выпакутаваў і заслужыў Перамогу. Разграміўшы фашызм, вы далі нам магчымасць самім выбіраць свой шлях развіцця і будаваць дастойную будучыню Беларусі.

Сёння нашчадкі пакалення пераможцаў узялі на сябе адказнасць за дабрабыт і бяспеку краіны. Мы захаваем згуртаванасць і сілу духу, каб і надалей разам умацоўваць наш агульны дом.

Шчыра зычу міру, дабра і шчасця вам, паважаныя суайчыннікі.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

### *Дарагія суайчыннікі!*

**Шчыра віншую вас з Днём Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь**

Гэтыя сімвалы дзяржаўнасці ўвасабляюць вечную каштоўнасць Айчыны і пераемнасць гераічнай гісторыі і працоўных дасягненняў беларускага народа, яго адзінства і згуртаванасць, працавітасць і мірны характар.

Павага да галоўных дзяржаўных сімвалаў — гэта праява высокіх грамадзянскіх пачуццяў патрыятызму, адказнасці за сучаснасць і будучыню сваёй краіны, гордасці за гераізм і мужнасць народа, шанавання яго святыняў і добрых традыцый.

У гэты знамянальны дзень зычу вам дабра, шчасця і поспехаў у імя працвітання Беларусі.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАТРАБУЕ НАВЯДЗЕННЯ СТРОГАГА ПАРАДКУ ДЛЯ НЕДАПУШЧЭННЯ ТАКІХ ВЫПАДКАЎ, ЯК ВЫБУХ У МЕТРО

**Аб гэтым ён заявіў 6 мая на нарадзе аб ходзе расследавання абставін выбуху на станцыі «Кастрычніцкая» Мінскага метрапалітэна.**

«Хачу звярнуць увагу ўсіх кіраўнікоў усіх установ, арганізацый, заводаў, фабрык: навядзіце парадак! Рабочы час павінен быць аддадзены толькі рабоце», — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка. Паводле слоў Прэзідэнта, расследаванні тэрарыстычнага акта і іншых крымінальных спраў паказалі слабыя месцы ў беларускім грамадстве. «Аналіз сітуацыі на заводзе, дзе працаваў абвінавачаны, сведчыць аб недапушчальнай практыцы безгаспадарчасці, пратэкцыянізму, абыякавасці, адарванасці кіраўнікоў ад людзей і слабай кадравай і ідэалагічнай рабоце. Усё гэта ў комплексе і стварае пажыўнае асяроддзе для ўзнікнення і фарміравання асацыяльных поглядаў і ідэй». «Гэта непарадак: пачынаем разбірацца — гэты чалавек мог проста пайсці з работы, узяць шарыкі, арматуру і займацца сваімі справамі, у тым ліку выпрабоўваць выбуховыя ўстройствы ў лясах. І ніхто гэтага не бачыў», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Недысцыплінаванасць і расхлябанасць на прадпрыемствах і ў арганізацыях трэба спыніць», — запатрабаваў Прэзідэнт. «У нас ёсць савецкі вопыт часоў Андропава. Падабаецца гэта камусьці ці не, але прыкладна так мы павінны прымусіць кожнага працаваць».

Паводле слоў Прэзідэнта, у грамадстве з'явілася яшчэ адна негатыўная тэндэнцыя. «Працуем з халадком, напалавіну рабочага часу. Даём палавіну таго, што павінны даваць, а жыць хочам добра. Так не бывае», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Звяртаючыся да дзяржсакратара Савета Бяспекі Леаніда Мальцава, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Мы дамовіліся: па выпадках безгаспадарчасці, беспарадку ў бюджэтнай сферы, дзяржаўных структурах, аж да прыватных, рашэнні павінны прымацца імгненна». «Прымусьце ўсіх працаваць, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Каб чарговы раз мы не хапаліся за галаву і не крычалі: давайце цяпер наводзіць парадак у грамадстве».

Паводле слоў Прэзідэнта, папярэднія вынікі праверак паказваюць, што прычыны і ўмовы, якія садзейнічалі злачынствам, заключаюцца не толькі ў недапрацоўцы праваахоўных органаў. «Ва ўстановах адукацыі і на прадпрыемствах беспарадку больш, чым трэба. У прыватнасці, у школах выяўляецца мноства парушэнняў у арганізацыі выхавачага працэсу, пры правядзенні культурна-масавых мерапрыемстваў, абарачэнні боепрыпасаў, хімічных рэактываў. Аб'екты, якія ўяўляюць пагрозу жыццю і здароўю людзей, размешчаны ў непасрэднай блізкасці ад школ», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што даручыў праверыць усе навучальныя ўстановы, у тым ліку сярэднія школы, а таксама прадпрыемствы.

«Але ёсць адваротны бок медаля: мне паступае інфармацыя, што некаторыя нашы чыноўнікі спрабуюць закрыць рот людзям. Вось гэтага дапусціць ні ў якім выпадку нельга», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Чалавек, адпрацаваўшы свой рабочы час, мае права дома або ў пэўных месцах, як у сапраўднай дэмакратычнай дзяржаве, выказваць свой пункт гледжання, і ніхто не мае права гэтаму перашкаджаць», — падкрэсліў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка дадаў, што ў выпадку калі чалавек парушае закон, ён павінен адказваць па ўсёй строгасці. «Калі мы пачнём ціснуць на людзей, вось тады нас не зразумеюць».

На думку Прэзідэнта, у краіне ёсць усё, пачынаючы ад нарматыўнай базы, сучасных электронных тэхналогій і тэлекамунікацыйных сетак і заканчваючы спецыялізаванымі падраздзяленнямі, каб забяспечыць умовы, пры якіх кожны грамадзянін можа быць спакойны за сваё жыццё ў любы час і ў любых сітуацыях. «Гэта значыць, увесь комплекс мер у нас ёсць, нарматыўная база ёсць, дык чаму ж і дзе не спрацоўвае ўвесь гэты комплекс?» — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён таксама дадаў, што рашэнні неабходны не толькі па раскрыцці злачынства, але і стварэнні на практыцы дзейснай сістэмы мер па забеспячэнні бяспекі грамадзян.

Прэзідэнт нагадаў, што выканаўцам выбуху прад'яўлены адпаведныя абвінавачанні, адносна службовых асоб, дзеянні якіх павінны былі прадухіліць трагедыю, заведзены шэраг крымінальных спраў. Звяртаючыся да ўдзельнікаў нарады, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сёння неабходна атрымаць адказы і на іншыя пытанні, звязаныя з гэтым крывавым злачынствам. Але самая галоўная работа, паводле яго слоў, павінна праводзіцца па недапушчэнні такога ў далейшым. Прэзідэнту было даложана аб тым, як ідзе следства і як выконваюцца дадзеныя кіраўніком дзяржавы даручэнні ў сувязі з выбухам у Мінскім метрапалітэне, а таксама іншыя аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы.

## ГЕРАІЧНЫ ПОДЗВІГ САВЕЦКІХ ЛЮДЗЕЙ ЗАХАВАЕЦЦА Ў СЭРЦАХ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншавальныя пасланні з нагоды 66-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне кіраўнікам дзяржаў — удзельніц СНД.**

«Гераічны подзвіг савецкіх людзей, якія адстаялі свабоду і незалежнасць у кровапралітнай барацьбе супраць фашысцкіх захопнікаў, назаўсёды захаваецца ў сэрцах беларусаў і расіян», — гаворыцца ў пасланні Аляксандра Лукашэнкі Прэзідэнту Расійскай Федэрацыі Дзмітрыю Мядзведзеву.

«Памяць пра гады ваенных выпрабаванняў і сёння аб'ядноўвае брацкія народы, садзейнічае плённаму развіццю адносін паміж нашымі краінамі, сумесnaму супрацьстаянню новым выклікам і пагрозам», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

На адрас Прэзідэнта Беларусі таксама паступіла віншаванне ад Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Дзмітрыя Мядзведзева.

«Мы будзем вечна захоўваць у нашых сэрцах памяць пра герояў гэтай страшнай вайны. Цаной уласных жыццяў яны адстаялі свабоду і незалежнасць Айчыны, у жорсткім баі разгромілі фашысцкіх захопнікаў», — гаворыцца ў ім.

Дзмітрый Мядзведзеў таксама перадаў пажаданні моцнага здароўя, шчасця і даўгалецця ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, якія пражываюць у Беларусі, міра і дабрабыту — усяму беларускаму народу.

Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншавальныя пасланні палітычным і грамадскім дзеячам Расіі. У прыватнасці, Старшыні Урада Расійскай Федэрацыі Уладзіміру Пуціну, Старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Сяргею Міронаву, Старшыні Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, Старшыні Дзяржаўнай Думы Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Барысу Грызлову, а таксама Патрыярху Маскоўскаму і ўсяе Русі Кірылу.

Прэзідэнт Беларусі таксама павіншаваў з 66-годдзем Перамогі Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Паўла Барадзіна, Старшыню Выканаўчага камітэта — Выканаўчага сакратара Садружнасці Незалежных Дзяржаў Сяргея Лебедзева, Генеральнага сакратара Еўразійскай эканамічнай супольнасці Таіра Мансурава, намесніка Генеральнага сакратара ЕўрАзЭС, Адказнага сакратара Камісіі Мытнага саюза Сяргея Глазьева, Генеральнага сакратара АДКБ Мікалая Бардзюжу, Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Сяргея Нарышкіна, міністра замежных спраў Расійскай Федэрацыі Сяргея Лаўрова, губернатара Маскоўскай вобласці Расійскай Федэрацыі Барыса Громава, мэра Масквы Сяргея Сабяніна.

На адрас Аляксандра Лукашэнкі працягваюць паступаць віншавальныя пасланні ад палітычных і грамадскіх дзеячаў замежжа.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ВЯНОК АД ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ ЎСКЛАДЗЕНЫ ДА МАГІЛЫ НЕВЯДОМАГА САЛДАТА Ў МАСКВЕ

**Урачыстую цырымонію, прысвечаную 66-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, узначаліў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Расіі Васіль Далгалёў. У ёй прынялі ўдзел прадстаўнікі Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы, Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, беларускія дыпламаты, этнічныя беларусы, якія пражываюць у Маскве.**

Кошыкі з кветкамі былі ўскладзены таксама да памятных знакаў «Мінск — горад-герой» і «Брэсцкая крэпасць-герой», устаноўленых на Алеі гарадоў-герояў у Аляксандраўскім садзе. «Гэта традыцыйная цырымонія, якая характарызуе стаўленне нашага народа да памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, — сказаў журналістам Васіль Далгалёў. — Памятаючы сваю гісторыю, мы ў лепшых традыцыях вучым патрыятызму наша маладое пакаленне».

**БЕЛТА.**

ISSN 1990 - 763X

Палкоўнік у адстаўцы Аляксандр Сцяпанавіч МЕЛЬНІК і ваеннаслужачы Віктар КЛЮЧНІК.

## САМЫ МІРНЫ МУЗЕЙ У СВЕЦЕ

**МУЗЕЙ, адзін з лепшых у свеце па гэтай тэматыцы, пачаў стварацца, калі вайна была яшчэ ў самым разгары. Для нашай краіны гэта не проста музей — гэта і біяграфія беларускага народа, адлюстраванне яго складанага лёсу: гісторыя народнай трагедыі, гераічнай барацьбы і народнай Перамогі. Дакладнае ўвасабленне патрыятызму...**

Сімвалічна, што ў год 65-годдзя Вялікай Перамогі пачаў узводзіцца новы будынак музея, які, без сумнення, стане знакавай з'явай для Беларусі. Кіраўнік нашай дзяржавы ў час мінулагодняга суботніка заклаў капсулу з пасланнем нашчадкам у фундамент новага будынка, які мовай архітэктуры павінен сведчыць аб велічы Перамогі, велічы подзвігу нашага народа.

СТАР. 3



## ІМ БЕЗ ПАДТРЫМКІ ЦЯПЕР УЖО ЦЯЖКА

Міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна наведвае ветэранаў у Рэспубліканскім інтэрнаце ветэранаў вайны і працы ў Ждановічах. Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Паводле звестак Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, у Беларусі засталося ўсяго крыху больш за 35 тысяч ветэранаў Вялікай Айчыннай. Узрост самых маладых з іх ужо перавысіў 85-гадовую адзнаку.**

### Месцы ёсць. Галоўнае — камфорт

Мікалаеўшчынскі дом-інтэрнат для ветэранаў вайны, працы і інвалідаў адкрыўся больш за 30 гадоў таму, а адсюль — і яго асаблівасць. Апошнім часам тут быў праведзены капітальны і бягучы рамонт. Прычым адначасова летась з бюджэту Мінскай вобласці было выдаткавана 55 млн рублёў на набыццё новай мэблі і медыцынскага абсталявання.

— Такім чынам, значна палепшыліся ўмовы пражывання, — распавядае **дырэктар інтэрната Валянціна АТРУШКЕВІЧ**. — Цяпер ветэраны і інваліды могуць жыць у камфартабельных пакоях, як правіла, на аднаго-двух чалавек, а плюс да таго — у нас ёсць магчымасць праводзіць усе найбольш неабходныя для пажылых людзей медыцынскія працэдуры.

Сярод больш чым 300 жыхароў Мікалаеўшчынскага інтэрната статус ветэранаў вайны маюць каля трох дзясяткаў чалавек. І ў кожнага з іх — свой лёс. Хтосьці ніколі не меў сям'і, у другіх дзеці памерлі, трэцім патрабуецца спецыфічны догляд.

— Чаргі на пасяленне ветэранаў вайны ў дамы-інтэрнаты няма, — канстатуе **начальнік упраўлення стацыянарных устаноў сацыяльнага абслугоўвання і капітальнага будаўніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марыя ГАРБАЦЭВІЧ**. — Прычым праблемы з дэфіцытам месцаў не павінны ўзнікаць і надалей: плануецца, што пытанні з пасяленнем як у звычайныя, так і ў псіханеўралагічныя інтэрнаты для ўсіх жыхароў краіны цалкам знікнуць да 2015 года. Апроч таго, у інтэрнатах палепшацца ўмовы пражывання: у шэрагу ўстаноў будзе праведзены капітальны рамонт. А ў Рэспубліканскім інтэрнаце ветэранаў вайны і працы ў Ждановічах пад Мінскам вядзецца будаўніцтва водалячэбніцы з наборам сучаснага медыцынскага абсталявання. Чакаецца, што водалячэбніца будзе здадзена ўжо напрыканцы гэтага года.

### Правілы і выключэнні

Але дом-інтэрнат — выпадак пасапраўднаму крайні. Як зазначыла **міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА**, альтэрнатывай тут з'яўляюцца аддзяленні кругласутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў пры тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва раёнаў — у такіх аддзяленнях магчыма пажыць толькі пэўны, да 6 месяцаў у год, час. Пры гэтым у параўнанні з «класічнымі» інтэрнатамі аддзяленні з'яўляюцца варыянтам нашмат больш танным для бюджэту. Але галоўнае ў тым, што гэты варыянт аказваецца і больш прымальным для саміх ветэранаў: практычна ў любы момант яны могуць проста вярнуцца ў свой дом.

СТАР. 2

## НАЦБАНК ПАШЫРЫЎ КАЛІДОР ВАГАННЯ КУРСУ БЕЛАРУСКАГА РУБЛЯ

**З 12 мая галоўны банк краіны пашырае дапушчальныя межы вагання курсу нацыянальнай валюты да кошыка замежных валют у гэтым годзе з плюс-мінус 8 працэнтаў да плюс-мінус 12 працэнтаў, паведаміў нашаму карэспандэнту намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі Міхаіл Журавовіч.**

Гэтае рашэнне прынятае ў рамках паэтапнага збліжэння абменнага курсу беларускага рубля на розных сегментах валютнага рынку і накіраванае на пашырэнне магчымасцяў Нацыянальнага банка па рэагаванні на ваганні крос-курсаў замежных валют, якія ўваходзяць у кошык. Акрамя таго, гэты крок у цэлым дазволіць праводзіць больш гібкую курсавую палітыку.

## ЗОЛАТАВАЛЮТНЫЯ РЭЗЕРВЫ Ў КРАСАВІКУ ДАДАЛІ

**Паводле звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, за мінулы месяц золатавалютныя рэзервы краіны, разлічаныя па стандартах Міжнароднага валютнага фонду, павялічыліся на 32,1 мільёна долараў, ці на 0,9 працэнта, і склалі на 1 мая 3 мільярды 793,5 мільёна долараў (на 1 красавіка — 3 мільярды 761,4 мільёна долараў).**

У структуры золатавалютных рэзерваў рэзервовыя актывы ў замежнай валюце склалі 1 мільярд 440,7 мільёна долараў і павялічыліся за месяц на 103,2 мільёна (на 1 красавіка — 1 мільярд 337,5 мільёна долараў). Запасы манетарнага золата склалі ў эквіваленце 1 мільярд 546,8 мільёна долараў і за красавік выраслі на 146,4 мільёна долараў (на 1 красавіка — 1 мільярд 400,4 мільёна долараў).

**Ігар ГРЫШЫН.**


## ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО ОАО Ордена «Знак Почета» «Автокомбинат № 4»**

**Лот № 1.** Капитальное строение (административное бытовое здание), общей площадью 717,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Солтыса, 108, инвентарный номер 500/С-27614, стоимостью – 828 361 800 (восемьсот двадцать восемь миллионов триста шестьдесят одна тысяча восемьсот) белорусских рублей.

Стоимость имущества указана с учетом НДС.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости имущества (лота): в размере 41 418 090 белорусских рублей.

**Лот № 2.** Капитальное строение (назначение – автомастерская), общей площадью 214,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Солтыса, 108, инвентарный номер 500/С-27464, стоимостью – 350 053 200 (триста пятьдесят миллионов пятьдесят три тысячи двести) белорусских рублей.

Стоимость имущества указана с учетом НДС.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости имущества (лота): в размере 17 502 660 белорусских рублей.

**Лот № 3.** Капитальное строение (назначение – проходная) общей площадью 15,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Солтыса, 108, инвентарный номер 500/С-24297, стоимостью – 25 212 600 (двадцать пять миллионов двести двенадцать тысяч шестьсот) белорусских рублей.

Стоимость имущества указана с учетом НДС.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости имущества (лота): в размере 1 260 630 белорусских рублей.

**Лот № 4.** Капитальное строение (назначение – диспетчерская автозаправки) общей площадью 14,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Солтыса, 108, инвентарный номер 500/С-27725, стоимостью – 9 135 000 (девять миллионов сто тридцать пять тысяч) белорусских рублей.

Стоимость имущества указана с учетом НДС.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости имущества (лота): в размере 456 750 белорусских рублей.

**Лот № 5.** Капитальное строение (назначение – бытовое здание) общей площадью 34,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Солтыса, 108, инвентарный номер 500/С-29702, стоимостью – 93 177 000 (девяносто три миллиона сто семьдесят семь тысяч) белорусских рублей.

Стоимость имущества указана с учетом НДС.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости имущества (лота): в размере 4 658 850 белорусских рублей.

**Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by/,**
а также в помещении хозяйственного суда г. Минска:
**г. Минск, ул. Академическая, 15/1.**

**Торги состоятся 24.05.2011 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.**

**За дополнительной информацией обращаться: судебный исполнитель Кацуба Н.В., тел.\факс: 294 93 79, м.т. 8029 177 32 83 ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294 93 67.**

**Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет хозяйственного суда города Минска № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 795, УНП 101541763 не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.**

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.



**РАКОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ Воложинского района Минской области (Продавец)**

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:**

■ **лот 1** — земельный участок в деревне Бузуны, участок № 19а площадью 0,1500 гектара, кадастровый номер участка 622085702101000227, начальная цена 7 500 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Удаленность от центра агрогородка Раков 4 километра, асфальтированный подъезд, готовится проект уличных сетей (электричество, дорога, водопровод);

■ **лот 2** — земельный участок в деревне Кучкуны, участок № 8 площадью 0,1537 гектара, кадастровый номер участка 622085708601000190, начальная цена 7 685 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Удаленность от центра агрогородка Раков 4 километра, район индивидуальной застройки, готовится проект уличных сетей (электричество, дорога, водопровод).

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется квитанцией на расчетный счет госказначейства № 3600614140501 Главное управление МФ РБ по Минской области в ЦБУ № 605, г. Воложин, филиал № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 153001601, УНП 600537220. Код платежа 04901.

Аукцион состоится **10 июня 2011 года (пятница) в 10.00** по адресу: а/г Раков, площадь Свободы, 11, 2-ой этаж, зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **до 6 июня 2011 года (включительно) до 17.00** по адресу: а/г Раков, пл. Свободы, 11, кабинет управляющего делами исполкома.

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня подписания протокола.

**Контактные телефоны: (8 01772) 52 2 36, 8 029 140 54 37.**

**АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ**

**WWW.RLT.BY**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Дорожно-строительный трест № 5» (продавец)** проводит повторный открытый аукцион по продаже двухэтажного, кирпичного, незаконченного строительством, законсервированного здания административно-бытового корпуса (готовность – 91%), инв. № 633/U-8105, об. пл. 585,3 кв.м, расположенного по адресу: **Минская обл., Мядельский р-н, Нарочанский с/с, д. Рудошаны.**

**Начальная цена с НДС (снижена на 20%) – 150 440 000 бел. руб.**

**Площадь земельного участка – 0,1819 га.**

**Задаток в сумме 15 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк» БИК 153001369 г. Минск, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

*Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.12.2010.*

Аукцион состоится **25.05.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.05.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

## ЗВЯЗДОВЕЦ — У ЛІКУ ЛАЎРЭАТАЎ КОНКУРСУ «ЗАЛАТАЯ ЛІТАРА»

Намеснік галоўнага рэдактара «Звязды» Уладзімір Здановіч стаў лаўрэатам VII Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая Літара» ў намінацыі «Лепшыя матэрыялы па тэматыцы спорту і здаровага ладу жыцця». Гран-пры «Лепшы творчы праект года рэспубліканскіх друкаваных СМІ, інфармацыйных агенцтваў» VII Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая Літара» ўдастоены праект «На славу Радзімы — 90 гадоў» рэдакцыі Беларускай ваеннай газеты «Во славу Родины». Цырымонія ўзнагароджання адбылася 5 мая — у Дзень друку.

Пераможцам у намінацыі «Лепшыя матэрыялы грамадска-палітычнай тэматыкі» стала рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия», а сярод рэгіянальных і шматтыражных — рэдакцыя газеты «Віцьбічы». Лепшыя матэрыялы эканамічнай тэматыкі былі прадстаўлены рэдакцыямі газет «Рэспубліка» і «Белорусская нива». Першае месца ў намінацыі «Лепшыя матэрыялы сацыяльнай тэматыкі» было прысуджана ААТ «Народная газета». Лепшыя іміджавыя матэрыялы прадаставіла рэдакцыя газеты «The Minsk Times», а рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» стала першай у намінацыі «Лепшыя матэрыялы культурнай і гісторыка-краязнаўчай тэматыкі». Намеснік рэдактара аддзела палітычнай і сацыяльнай інфармацыі БЕЛТА Кацярына Крышэнік стала пераможцам у намінацыі «Лепшы рэпарцёр», вядучы карэспандэнт гэтага агенцтва Генадзь Жынкоў перамог у намінацыі «Лепшы фотакарэспандэнт». Лепшым аглядальнікам стала рэдактар аддзела знешняй палітыкі газеты «Советская Белоруссия» Ніна Раманава. Вярстальшчык гэтай жа газеты Вольга Пак прызнана пераможцам у намінацыі «Лепшы афарміцель-дызайнер». «Залатую Літару» ў намінацыі «За ўклад у развіццё журналістыкі» журы прысудзіла Міхаілу Шыманскаму, у намінацыі «Лепшы аўтарскі блог» — галоўнаму рэдактару часопіса «Беларуская думка» Вадзіму Гігіну. У намінацыі «Партнёрства» ўзнагародай конкурсу адзначана ААТ «Магілёўсаюздрук», у намінацыі «За абарону прафесійных інтарэсаў журналісцкай супольнасці» — Беларускі саюз журналістаў. Віншуем калег!

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЎЧОРА ЎРУЧЫЎ ДЗЯРЖУЗНАГАРОДЫ ЗАСЛУЖАНЫМ ЛЮДЗЯМ БЕЛАРУСІ

Ордэнам «За службу Радзіме» I ступені ўзнагароджаны камандзір ваеннай часці 3403 унутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў палкоўнік Васіль Аляксеенка. Ордэнам «За службу Радзіме» III ступені ўзнагароджаны 7 чалавек. Ордэн «За асабістую мужнасць» атрымаў падпалкоўнік Юрый Пыжык. Медалі за адвагу таксама атрымалі два прадстаўнікі ваеннай прафесіі.

Аляксандр Лукашэнка ўручыў ордэн Айчыны II ступені генеральнаму дырэктару ВА «Гомсельмаш» Валерыю Жмайліку. Ордэнам Пашаны ўзнагароджаны прадстаўнікі вытворчай сферы, у прыватнасці дырэктар РУП «Рэчыцкі метызны завод» Адам Вашкоў. Узнагароджана ордэнам Францыска Скарыны вядучы майстар сцэны Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра Наталля Гайда. Ганаровае званне «Народны артыст Беларусі» прысвоена кінарэжысёру-пастаноўшчыку вышэйшай катэгорыі студыі ігравых фільмаў Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Аляксандру Яфрэмаву. Ганаровае званне «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» прысвоена рэктару Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Міхаілу Батуру.

Звяртаючыся да ўзнагароджаных, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Напярэдадні вялікага свята — Дня Перамогі — мы аддаём даніну глыбокай павагі ўсім, хто мужна змагаўся на франтах і ў партызанскіх атрадах, хто самааддана працаваў на прадпрыемствах і на палях, набліжаючы вызваленне Радзімы ад фашысцкай агрэсіі». Як падкрэсліў Прэзідэнт, у краіне з гордасцю адзначаюць, што гераізм пакалення пераможцаў не сцёрты з памяці, а знаходзіць сваё новае прадаўжэнне ў сучасных умовах у стваральнай працы і ўмацаванні Айчыны.

Шчырага захаплення заслугоўваюць лётчыкі, якія ў экстрэмальнай аварыйнай сітуацыі не кінулі самалёт, а дзякуючы мужнасці і прафесійнаму майстэрству паспяхова пасадзілі яго на свой аэрадром, прадухіліўшы магчымыя разбурэнні і чалавечыя ахвяры. За смеласць і рашучасць яны ўдастоены баявых узнагарод.

«Кіраўніцтва краіны высока цэніць той значны ўклад ва ўмацаванне грамадскага парадку, які ўносяць супрацоўнікі Міністэрства ўнутраных спраў і іншых кампетэнтных органаў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

За дасягненне добрых вытворчых паказчыкаў высокія ўзнагароды ўручаны кіраўнікам, спецыялістам і рабочым аб'яднання «Гомсельмаш», завода «Чырвоны барацьбіт», Рэчыцкага метызнага завода.

«Павінен падкрэсліць, што ў гэтай пяцігодцы асаблівая ўвага ўдзяляецца нарошчванню экспарту, прасоўванню прадукцыі і паслуг на новыя рынкі. Прыклад нашага вядучага прадпрыемства (ВА «Гомсельмаш». — **Заўвага БЕЛТА**) павінен і іншых падштурхоўваць да асваення сучасных метадаў вытворчасці, сэрвісу і рэалізацыі прадукцыі. Галоўнае — трэба пераадолець адмоўнае знешнегандлёвае сальда, каб мы ўпэўнена глядзелі ў будучае».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, пэўныя поспехі ў навуковай і педагагічнай сферах у Беларусі ёсць, аб чым сведчаць і сённяшнія ўзнагароды за дасягненні рэктарам і выкладчыкам ВНУ, супрацоўнікам навукова-даследчых інстытутаў. «Але шчыра скажу — чаканні ў нас значна большыя. Краіне патрэбна больш адкрыццяў, больш укаранення перадавых тэхналогій, больш аддачы ад укладанняў у развіццё нашага навуковага патэнцыялу».

Кіраўнік дзяржавы павіншаваў усіх узнагароджаных з надыходзячым святам — Днём Перамогі — і пажадаў ім шчасця, здароўя, дабрабыту і новых дасягненняў у рабоце і жыцці.

**БЕЛТА.**

**У сувязі са святам наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе ў сераду, 11 мая.**

У адпаведнасці з пунктам 8-1 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 22 сакавіка 2011 г. № 119 у Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, д. 4) наладжана пастаянна дзейная «гарачая лінія» па актуальных для грамадзян пытаннях. **Тэлефон «гарачай лініі» (8 017) 227 21 75**. Ён будзе працаваць з **11 мая 2011 г. у працоўныя дні з 10.00 да 13.00.**

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.05.2011 г. (для б/н разлікаў) | | Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША 3 037,00 | 1 чэшская крона 182,69 | USD 27,6635 | |
| ▼ 1 еўра 4 430,07 | 1 польскі злоты 1 113,68 | 10 UAH 34,7204 | |
| 1 латвійскі лат 6 223,36 | ▼ 1 расійскі рубель 109,78 | 10000 BYR 92,1502 | |
| 1 літоўскі літ 1 278,17 | 1 украінская грыўня 381,17 | EUR 40,2974 | |

17 мая 2011 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестский КСМ».
Повестка дня:
1. О приобретении акций ОАО «Брестский КСМ» на баланс Общества.
Собрание будет проходить по адресу: г. Брест, ул. Московская, 360.
Начало регистрации участников собрания: 13.30.

*УНП 200295903*

**ЗАО «АГРЭСТ» ИНФОРМИРУЕТ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ 20 мая 2011 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Филимонова, 2.**
**Повестка дня:** подведение итогов работы за 2010 год, утверждение годового бухгалтерского баланса, разное.

## ІМ БЕЗ ПАДТРЫМКІ ЦЯПЕР УЖО ЦЯЖКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Зразумела, што аддзяленні кругласутачнага знаходжання перш-наперш карыстаюцца попытам у ветэранаў на вёсцы, — адзначыла Марыяна Шчоткіна. — Не менш актуальная тэма для тых жа вяскоўцаў — і павелічэнне даступнасці сацыяльных паслуг. У прыватнасці, для гэтага за межамі райцэнтраў ствараюцца сацыяльныя пункты, арганізуецца работа гаспадарчых брыгад, якія аказваюць дапамогу з рамонтамі і вырашэннем іншых бытавых праблем па нізкіх цэнах. Нельга скідваць з рахункаў і наша традыцыйнае аказанне паслуг на даму — цяпер сацыяльныя работнікі рэгулярна наведваюць 3866 ветэранаў Вялікай Айчыннай.

Большасць ветэранаў вайны мае сем'і. Адпаведна, паводле заканадаўства, сацыяльныя паслугі ім павінны аказвацца за грошы. Аднак у агульным правіле ёсць шмат выключэнняў. У прыватнасці, міністр падкрэсліла: часцяком мясцовыя ўлады прымаюць рашэнне аб вызваленні ветэранаў, якія жывуць асобна ад дзяцей, ад аплаты.

— Увогуле падтрымка на мясцовым узроўні — адна з асноўных, — адзначыла Марыяна Шчоткіна. — Ужо шмат гадоў у нас існуе практыка: праводзіць абследаванні ўмоў жыцця ветэранаў і высвятляць іх праблемы. Прычым надалей большасць гэтых праблем здымаецца менавіта на ўзроўні выканкамаў.

### «Былых» — няма

Як падкрэсліла міністр, упарадкаванне сацыяльных ільгот не закранула ветэранаў. У прыватнасці, яны па-ранейшаму карыстаюцца правам на бясплатнае забеспячэнне лекамі паводле рэцэптаў урача, на бясплатнае зубапратэзаванне (за выключэннем пратэзавання з выкарыстаннем інавацыйных матэрыялаў), бясплатнае атрыманне тэхнічных сродкаў рэабілітацыі, бясплатны праезд на ўсіх, апроч таксі, відах гарадскога і прыгараднага пасажырскага транспарту, а таксама пры ўмове адсутнасці медыцынскіх супрацівапаказанняў — на першачарговае і бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне.

— Не сакрэт, што асноўным відам даходаў абсалютнай большасці ветэранаў з'яўляецца пенсія, — заўважыла Марыяна Шчоткіна. — У сувязі з гэтым нялішне нагадаць, што наша заканадаўства вызначае для ветэранаў пэўныя «надбаўкі»: для Герояў Савецкага Саюза і поўных кавалераў ордэна Славы памер такой надбаўкі складае 500 працэнтаў, для інвалідаў вайны I і II груп — 400 працэнтаў, інвалідаў вайны III групы і ўдзельнікаў вайны — 250 працэнтаў, блакаднікаў Ленінграда — 100 працэнтаў, а для працаўнікоў тылу, якія атрымалі ўзнагароды, — 50 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросце. А ў сваю чаргу, мінімальная пенсія па ўзросце цяпер адпавядае 85.815 рублям.

Як вынік, памеры выплат ветэранам вайны атрымліваюцца вышэй, чым у цэлым па краіне. Зараз сярэдняя пенсія інваліда вайны складае прыкладна 1 млн 50 тыс., а зноў жа сярэдняя пенсія ўдзельніка Вялікай Айчыннай — 870 тыс. рублёў. Аднак не менш істотны і іншы момант.

— Вельмі добра, што ў новай комплекснай праграме сацыяльнага абслугоўвання пажылых ветэранаў і пажылых людзей на 2011-2015 гады прадугледжана: гарантыі па калектыўных дагаворах павінны распаўсюджвацца не толькі на цяперашніх, але і на былых работнікаў-ветэранаў арганізацый, — заўважыў **першы намеснік старшыні рэспубліканскага савета Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў Міхаіл ЖУКОЎСКІ**. — Прычым для ветэранаў гэта сапраўды важна — і не столькі ў матэрыяльным, колькі ў маральным плане.

**Сяргей ГРЫБ.**

*Стоўбцы — Ждановічы — Мінск.*

## ЛОГОЗИНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**проводит повторно аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. рублей) | Задаток (бел. рублей) | Расходы по документации |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Старое Городище участок № 6 кадастровый номер 623284506101000034 | 0,2226 га | Возможность подключения к водопроводу | 6 233 000 | 623 300 | 1 681 104 |
| 2 | д. Добренево участок № 4 кадастровый номер 623284501101000112 | 0,0969 га | Электроснабжение, возможность подключения к водопроводу | 2 422 500 | 242 250 | 1 681 104 |

Задаток перечисляется на р/с 3600619091105 в ЦБУ № 611 филиале 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, МФО 153001601, УНН 600181551, Логозинский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901 до 26.05.2011 г. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести оплату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Аукцион состоится **01.06.2011 г. в 10.00** по адресу: д. Логоза Логойского р-на Минской обл., здание Логозинского сельского исполнительного комитета. Заявление на участие и необходимые документы принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **26.05.2011 г.** по адресу: д. Логоза Логойского р-на Минской обл. **Контактный телефон: 801774 56436, 56498.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСОВ

**ГОСУДАРСТВЕННЫЙ КОМИТЕТ ПО ИМУЩЕСТВУ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРИНАДЛЕЖАЩИХ РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ АКЦИЙ ОТКРЫТЫХ АКЦИОНЕРНЫХ ОБЩЕСТВ**

Конкурсы состоятся **29 июня 2011 г.** по адресу: г. Минск, переулок Краснозвездный, 12.
Организатор конкурсов – Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12.

| № | Полное и сокращенное наименование, место нахождения акционерного общества | Размер уставного фонда, штук акций | Номинальная стоимость акции, рублей | Доля государства в уставном фонде | | Количество продаваемых акций | | Начальная цена продажи акций, рублей | Условия конкурса |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | штук акций | в % к УФ | штук акций | в % к УФ | | |
| 1 | Открытое акционерное общество «Агропромстроймаш» (ОАО «Агропромстроймаш») 225320, Брестская обл., г. Барановичи, ул. Кирова, 79 | 2264843 | 4200 | 2264843 | 100 | 2264843 | 100 | 15935000000 | Внести в уставный фонд открытого акционерного общества «Агропромстроймаш» в виде вклада денежные средства в сумме, эквивалентной 2,5 млн. долл. США, в течение 1 года с даты подписания договора купли-продажи акций с направлением указанных средств на развитие общества. |
| 2 | Открытое акционерное общество «Бумажная фабрика «Красная Звезда» (ОАО «Бумажная фабрика «Красная Звезда») 211156, Витебская обл., г. Чашники, ул. Гагарина, 20 | 288215 | 20000 | 267765 | 92,9 | 267765 | 92,9 | 12319853595 | Внести в уставный фонд открытого акционерного общества «Бумажная фабрика «Красная Звезда» в виде вклада денежные средства в размере 10 млрд. рублей в течение 2 лет с даты подписания договора купли-продажи акций с направлением указанных средств на развитие общества. Обеспечить сохранение в течение 2 лет с даты подписания договора купли-продажи акций количества рабочих мест и в течение 5 лет профиля деятельности общества. |
| 3 | Открытое акционерное общество «Борисовгрузавтотранс» (ОАО «Борисовгрузавтотранс») 222120, Минская обл., г. Борисов, ул. 3-го Интернационала, 199 | 261861 | 150 | 244147 | 93,2 | 110610 | 42,2 | 1609765143 | Предоставить открытому акционерному обществу «Борисовгрузавтотранс» заем в сумме, эквивалентной 400 тыс. долл. США, под 1% годовых в течение 1 года с даты подписания договора купли-продажи акций. |
| 4 | Открытое акционерное общество «Новогрудский грузовой автомобильный парк» (ОАО «Новогрудский грузовой автомобильный парк») 231400, Гродненская обл., г. Новогрудок, ул. Л.Сечко, 3 | 176207 | 4200 | 171733 | 97,5 | 81866 | 46,5 | 687609913 | Предоставить открытому акционерному обществу «Новогрудский грузовой автомобильный парк» заем в сумме, эквивалентной 142 тыс. долл. США, под 1% годовых в течение 1 года с даты подписания договора купли-продажи акций. |
| 5 | Открытое акционерное общество «Красносельскавтотранс» (ОАО «Красносельскавтотранс») 231911, Гродненская обл., г.п. Красносельский, ул. Зеленая, 1 | 708007 | 3600 | 691225 | 97,6 | 330144 | 46,6 | 3995728765 | Предоставить открытому акционерному обществу «Красносельскавтотранс» заем в сумме, эквивалентной 830 тыс. долл. США, под 1% годовых в течение 1 года с даты подписания договора купли-продажи акций. |
| 6 | Открытое акционерное общество «Пинагрузсервис» (ОАО «Пинагрузсервис») 225710, Брестская обл., г. Пинск, ул. Рокоссовского, 2 | 834768 | 3600 | 827009 | 99,1 | 219543 | 26,3 | 1733475227 | Предоставить открытому акционерному обществу «Пинагрузсервис» заем в сумме, эквивалентной 605 тыс. долл. США, под 1% годовых в течение 1 года с даты подписания договора купли-продажи акций. |

Время проведения конкурсов по продаже принадлежащих Республике Беларусь акций:

ОАО «Агропромстроймаш» – 9.00; ОАО «Бумажная фабрика «Красная Звезда» – 9.40; ОАО «Борисовгрузавтотранс» 10.20; ОАО «Новогрудский грузовой автомобильный парк» – 11.00; ОАО «Красносельскавтотранс» – 11.40; ОАО «Пинагрузсервис» – 12.20.

Для участия в конкурсе по продаже акций соответствующего акционерного общества в срок **до 16.00 14 июня 2011 г.** по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, каб. 401 представляются следующие документы:

заявление на участие в конкурсе по форме, утвержденной Государственным комитетом по имуществу;

юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь – копии устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий организатором конкурса, доверенность представителю юридического лица (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор);

юридическими лицами, иными организациями – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

индивидуальными предпринимателями – резидентами Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором конкурса;

индивидуальными предпринимателями – нерезидентами Республики Беларусь – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителями граждан Республики Беларусь, индивидуальных предпринимателей – резидентов Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителями иностранных физических лиц, индивидуальных предпринимателей – нерезидентов Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в конкурсе физические лица, индивидуальные предприниматели, представители физических лиц, индивидуальных предпринимателей, юридических лиц, иных организаций предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором конкурса.

В случаях, установленных законодательством, дополнительно представляется документ, подтверждающий согласие антимонопольного органа на совершение сделки.

Задатки для участия в конкурсах уплачиваются в размере 10 процентов от начальных цен продажи акций в срок до **25 июня 2011 г.** согласно договорам о задатке, заключаемым с Фондом государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь: в бел. рублях на счет № 3642974000028; в EURO на счет № 3642974005036; в USD на счет № 3642974005052; в рос. рублях на счет № 3642974008046 в филиале № 529 «Белсвязь» ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 720; получатель платежа – Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, УНП 102314789.

Участники конкурсов, выигравшие соответствующий конкурс, обязаны возместить затраты на организацию и проведение конкурсов в течение 3 рабочих дней с даты их проведения.

Договора купли-продажи акций по результатам конкурсов заключаются в течение 20 календарных дней с даты их проведения.

**Контактный телефон Фонда государственного имущества: (017) 284 85 62.**

## Минский районный исполнительный комитет *9 июня 2011 года* проводит открытый *аукцион* на право заключения договоров аренды земельных участков в Минском районе

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 | Лот 6 | Лот 7 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Боровлянский с/с, д. Валерьяново | Минский район, Боровлянский с/с, д. Малиновка | Минский район, Горанский с/с, д. Новоселье | Минский район, Ждановичский с/с п. Ратомка | Минский район, г. Заславль, ул. Заречная | Минский район, Колодищанский с/с, п. Колодищи, ул. Молоковича | Минский район, Колодищанский с/с, п. Колодищи, ул. Путейская |
| 2 | Кадастровый номер | 623680601601000845 | 623680606601000263 | 623681315601000472 | 623681708601002213 | 623650100001004356 | 623683403101007035 | 623683403101007036 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1000 га | 0,1200 га | 0,0073 га | 0,8501 га | 0,0502 га | 0,0100 га | 0,0100 га |
| 4 | Срок аренды (лет) | 50 | 50 | 30 | 40 | 50 | 30 | 30 |
| 5 | Целевое назначение | Для строительства торгового объекта | Для строительства кафе | Для установки торгового павильона | Для строительства физкультурно-оздоровительного комплекса | Для строительства объекта розничной торговли | Для размещения торгового павильона | Для размещения торгового павильона |
| 6 | Сумма убытков и потерь с/х производства (рублей) | - | - | 65 000 | - | - | - | - |
| 7 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 1 464 582 | 1 713 644 | 1 566 035 | 2 151 045 | 1 875 463 | 1 565 102 | 1 565 102 |
| 8 | Начальная цена права заключения договора аренды | 10 673,3 доллара США | 9 164,64 доллара США | 123 доллара США | 33 676,20 доллара США | 3 888,87 доллара США | 368 долларов США | 868 долларов США |
| 9 | Задаток (рублей) | 3 000 000 | 2 500 000 | 30 000 | 10 000 000 | 1 000 000 | 100 000 | 250 000 |

| | | Лот 8 | Лот 9 | Лот 10 | Лот 11 | Лот 12 | Лот 13 | Лот 14 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Колодищанский с/с, п. Колодищи, ул. Минская | Минский район, Колодищанский с/с, п. Городище | Минский район, Крупицкий с/с, д. Дубицкая Слобода | Минский район, Луговослободской с/с, д. Заболотье | Минский район, Луговослободской с/с, а/г Луговая Слобода | Минский район, Луговослободской с/с, д. Обчак | Минский район, Луговослободской с/с, д. Ефимово |
| 2 | Кадастровый номер | 623683403101007037 | 623683402101000437 | 623683903601000064 | 623684104601000192 | 623684108601000484 | 623684109101000670 | 623684104101000218 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,0837 га | 0,3000 га | 0,0386 га | 0,0020 га | 0,0025 га | 0,0030 га | 0,1138 га |
| 4 | Срок аренды (лет) | 50 | 50 | 51 | 30 | 30 | 30 | 50 |
| 5 | Целевое назначение | Для строительства магазина | Для размещения производства строительных материалов и элементов | Для размещения объекта торговли товарами народного потребления | Для размещения торгового павильона | Для размещения торгового павильона | Для размещения торгового павильона | Для строительства магазина |
| 6 | Сумма убытков и потерь с/х производства (рублей) | - | 1 843 170 | 630 300 | - | - | - | - |
| 7 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 1 961 844 | 2 063 992 | 2 156 134 | 1 894 620 | 1 565 975 | 1 894 620 | 1 910 863 |
| 8 | Начальная цена права заключения договора аренды | 10 254 доллара США | 13 793,71 доллара США | 516 долларов США | 29 долларов США | 100 долларов США | 81,64 доллара США | 3 356 долларов США |
| 9 | Задаток (рублей) | 3 000 000 | 4 000 000 | 150 000 | 5 000 | 30 000 | 20 000 | 1 000 000 |

| | | Лот 15 | Лот 16 | Лот 17 | Лот 18 | Лот 19 | Лот 20 | Лот 21 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Луговослободской с/с, а/г Замосточье | Минский район, Новодворский с/с, район п. Гатово | Минский район, Самохваловичский с/с, п. Самохваловичи | Минский район, Сеницкий с/с, район д. Урожайная | Минский район, Сеницкий с/с, район д. Щитомиричи | Минский район, Сеницкий с/с, район д. Урожайная | Минский район, Хатежинский с/с, д. Новая Веска |
| 2 | Кадастровый номер | 623684105101000471 | 623684301601000554 | 623686303601000799 | 623686600001000219 | 623686600001000221 | 623686600001000220 | 623687504601000050 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,4001 га | 0,5001 га | 0,2067 га | 0,3994 га | 1,3473 га | 1,6808 га | 0,2141 га |
| 4 | Срок аренды (лет) | 50 | 50 | 51 | 71 | 51 | 71 | 50 |
| 5 | Целевое назначение | Для строительства административно-складских помещений | Для строительства административно-производственной базы | Для строительства объекта торговли товарами народного потребления | Для строительства оздоровительного центра с административным зданием | Для строительства производственно-складских помещений | Для строительства гостиницы на 100 мест с рестораном на 150 мест | Для размещения садово-строительного центра |
| 6 | Сумма убытков и потерь с/х производства (рублей) | 16 369 100 | 62 514 840 | 4 661 500 | - | 62 722 800 | - | 1 907 110 |
| 7 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 2 018 363 | 1 999 878 | 811 158 | 1 050 643 | 1 597 022 | 833 751 | 2 440 573 |
| 8 | Начальная цена права заключения договора аренды | 8 316 долларов США | 69 784,93 доллара США | 5 587 долларов США | 102 141 296 белорусских рублей | 110 525 долларов США | 429 842 445 белорусских рублей | 5 059,50 доллара США |
| 9 | Задаток (рублей) | 2 000 000 | 20 000 000 | 1 500 000 | 10 000 000 | 30 000 000 | 40 000 000 | 1 500 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 09.06.2011 г. в 10.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов – 03.06.2011 г. Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3641000233719, отделение № 537, г. Минск, ОАО «Белинвестбанк», МФО 153001739, УНП 600068187, получатель – Минский районный исполнительный комитет.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить потери сельскохозяйственного производства, вызванные изъятием сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства и расходы, оговоренные в условиях проведения аукциона. Договор аренды земельного участка заключается с победителем в течение 2-х рабочих дней после внесения им всех причитающихся платежей.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками; ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем.

Документы, необходимые для участия в аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

Кроме того, в комиссию представляются:

• гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

• индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

• представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

• представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

• представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

• представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

ПЛАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 3 (3)



# САМЫ МІРНЫ МУЗЕЙ У СВЕЦЕ

## Менавіта так гавораць пра Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — таму што ён сведчыць і даказвае: вайны не павінна быць, нідзе і ніколі

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)*

**Будынак узводзіцца на рагу праспектаў Пераможцаў і Машэрава, непадалёк ад манумента «Мінск — горад-герой». Музейны комплекс стане гарманічным скульптурна-архітэктурна-ландшафтным ансамблем гэтага куточка беларускай сталіцы, сацыякультурным цэнтрам: побач знаходзіцца Парк Перамогі, закладзены ў 1945-м, і Камсамольскае возера, святочнаму адкрыццю якога 22 чэрвеня 1941 года перашкодзіла вайна.**

**Калісьці наша газета першай паведаміла аб адкрыцці музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску. А напярэдадні Дня Перамогі карэспандэнты «Звязды» разам з дырэктарам музея Сяргеем АЗАРОНКАМ пабывалі на будаўніцтве новага будынка.**

Фота Марыны БЕГУН (ВАІ)

Дырэктар музея Сяргей АЗАРОНАК з Сяргеем ЦІМОШЧАНКАМ і Сяргеем ДЗЯКОВІЧАМ на будаўніцтве новага будынка музея каля манумента «Мінск — горад-герой».

**У 1942 годзе ў Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве на Краснай плошчы прайшла выстава «Беларусь жыве, Беларусь змагаецца...», якая стала своеасаблівай асновай Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, хоць да Перамогі пралягалі доўгія вёрсты вайны. У 1943-м было прынята рашэнне ЦК КП(б)Б аб стварэнні музея, выйшла сакрэтная дырэктыва аб пачатку збору экспанатаў.**

**Ужо 22 кастрычніка 1944 года ў Мінску музей адчыніў дзверы для наведвальнікаў.**

**Зараз гэта найбуйнейшы захавальнік рэліквій вайны: фонды налічваюць звыш 140 тысяч адзінак захоўвання, многія з якіх з'яўляюцца ўнікальнымі і не маюць аналагаў ні ў адным музеі свету.**

### БУДОЎЛЯ

...Майстар будтрэста № 1 будаўнічага ўпраўлення № 5 Сяргей Ігнаценка, плотнікі Сяргей Цімошчанка і Сяргей Дзяковіч працуюць з выдатным настроем: як гаворыцца, работа кіпіць. Ужо ў гэтым годзе плануецца ўзвесці каркас новага будынка і пачаць збудаванне ўнутраных перагародак, перакрыццяў.

Велічная пабудова будзе ўяўляць сабой салют Перамогі, галоўны архітэктар праекта — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прафесар Міжнароднай акадэміі архітэктуры Віктар Крамарэнка (ён аўтар Нацыянальнай бібліятэкі і Мінскага чыгуначнага вакзала).

— Сама закладка новага будынка Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны была вельмі сімвалічнай, — *расказвае Сяргей Азаронак*. — Сэнс быў вялікі: у гэтай падзеі бралі ўдзел тры пакаленні, побач былі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка з сынам Мікалаем і ветэраны. Своеасаблівае сведчанне працягу традыцый: ад тых, хто ваяваў і здабыў Перамогу, да вопытнага кіраўніка дзяржавы і, урэшце, да маленькага хлопчыка — усіх тых, каму ў будучыні працягваць і развіваць набыткі патрыятызму.

Будынак плануецца ўзвесці ў 2012 годзе. А цяпер адбываецца вельмі складаная, тытанічная праца паралельнага праектавання і будаўніцтва: дэталізацыя, паглыбленне архітэктурна-мастацкага праекта. Каласальная мазгавая работа! Штотыднёва збіраецца рабочы штаб.

***— Абмяркоўваецца кожная дэталь, кожны нюанс?***

— Неабходна ўзвесці сучасны магутны будынак, і тут няма і не можа быць дробязяў.

Вось, напрыклад, абмяркоўваем наступнае: каркас купала рабіць чорным металам ці ўсё ж нержавейкай або нават тытанам? Калі зробім з чорнага металу, звычайнага жалеза — гэта нядорага, трывала, дый пры зварцы лягчэй... Але праз 5-7 гадоў трэба будзе ўсё разбіраць, адчышчаць іржу — да таго ж, варта пралічыць, што будзе праз наступныя 10-15 гадоў. А можа, больш гаспадарчым падыходам было б (каб сапраўды — на вякі!) выкарыстаць нержавейку ці тытан — каб наступная эксплуатацыя будынка не была такой надзвычай складанай і шматзатратнай?..

### ЭКСПАЗІЦЫЯ (ДУША МУЗЕЯ)

***— Сяргей Іванавіч, як бы вы абазначылі асноўную канцэпцыю музея?***

— Музей без межаў. Неабходна вырашыць задачу адзінага комплекснага падыходу да архітэктурна-прасторавага і дызайнерскага выканання музейнага комплексу.

***— Узводзіцца будынак, і вы паралельна працуеце над новай экспазіцыяй?***

— Так. Мы ідзём з невялікім спазненнем — гэта залежала ад фінансавання. Сродкі выдзелены, у маі заканчваем правядзенне конкурсу на праект мастацкага і тэхнічнага вырашэння экспазіцыі, потым адбудзецца чарговы конкурс на будаўніцтва экспазіцыі, да гэтага прадметна прыступім ужо сёлета.

***— Праектаванню экспазіцыі ўдзяляецца надзвычайная ўвага?***

— І гэта невыпадкова. Калі будуюцца невялікія музеі, да 100-200 кв.м экспазіцыйнай плошчы, можна ўсё рабіць паралельна. А ў нас велізарная прастора — больш як 3 000 кв. м. Таму калі не падрыхтаваць прадуманы праект, можа атрымацца абсалютная какафонія (ва ўсім і паўсюдна). Такія памылкі недапушчальныя, бо іх выпраўленне будзе каштаваць вялікіх фінансавых сродкаў. Выдаткоўваюцца бюджэтныя грошы, трэба быць вельмі ўважлівымі, каб не было прамашкі.

Таму спачатку ўсё будзе спраектавана — ад «а» да «я», — потым вынесена на суд спецыялістаў. Зацверджаны вучоны савет, у склад якога ўвайшлі вопытныя гісторыкі і навукоўцы, музеязнаўцы, палітолагі.

Гэта надзвычай важна, бо неабходна вызначыць і ўдакладніць нашы пазіцыі ў паказе пэўных нюансаў. Скажам адкрыта: акупацыя — вельмі складаная з'ява сама па сабе, у тым ліку і тэма калабарацыянізму: як яе правільна, асцярожна, дакладна паказаць, без «перагібаў»? Ці памылкі кіраўнікоў у пачатку вайны: вялікая колькасць палонных (калі чатыры арміі раптам перасталі існаваць літаральна ў першыя дні вайны, і дзясяткі тысяч нашых салдатаў апынуліся ў палоне); авіяцыя, якая фактычна была знішчана нямецкімі бамбардзіроўшчыкамі на аэрадромах... Як такое магло здарыцца, нават калі мы не хацелі і не планавалі ваяваць, — але ж ёсць абгрунтаваныя падыходы...

Як усё гэта правільна паказаць? Каб нічога не замоўчваць, не лакіраваць і тым больш не ёрнічаць: гэта вялікая трагедыя — і з яе трэба рабіць граматныя высновы, хоць бы ў настаўленне нашчадкам.

***— Будынак — гэта аблічча музея, а экспазіцыя — яго душа...***

— Такія вялікія экспазіцыі, як наша, у маштабах такой краіны, як Беларусь, будуюцца раз у 30-40 гадоў, а ваенная тэматыкі — яшчэ радзей. Таму, напэўна, давядзецца выйсці на міжнародны ўзровень тэндара, бо наўрад ці ўдасца знайсці вопытнага высакакласнага генеральнага падрадчыка ў Беларусі, які б адказна сказаў: «Так, я асвою сродкі і зраблю экспазіцыю еўрапейскага ўзроўню». Таму што нам не трэба, каб Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны стаў «выпрабавальным палігонам» для бахвальных фірмаў, якія раней не будавалі нічога падобнага.

Мы выходзім на наступнае патрабаванне: каб арганізацыя, якая возьмецца за гэтую адказную дзяржаўную працу, штогод праектавала не менш за 3-4 тысячы кв. м экспазіцыйнай плошчы і каб яна хоць бы ў апошнія гады зрабіла аду-дзве вялікія экспазіцыі ваеннай тэматыкі (такая экспазіцыя істотна адрозніваецца, напрыклад, ад археалагічнай). Тут павінна працаваць сур'ёзная фірма, якая не дазволіць сабе нейкую авантуру. Калі ў краіне такая ёсць, іменна ёй адразу будзе аддадзена перавага. А калі маюцца проста пажаданні і абяцанні... Наша гісторыя ведае, колькі было пустых, не падмацаваных нічым абяцанняў, за якія, на жаль, вымушана была расплачвацца дзяржава. Грошы пайшлі ў пясок, а вынікаў няма. Гэтага мы дазволіць не можам. Бо самае галоўнае ў гэтай працы — прафесіяналізм і трэніроўка, якая дасягаецца шматразовым выкананнем падобных заказаў. (Сцэну Опернага тэатра, напрыклад, пабудавалі замежнікі, яны яе і абслугоўваюць, таму што нават адзін «не той» мікрон можа прывесці да памылкі. У нас не патрабуецца такая дакладнасць, але ж надзвычай важна правільна падаць і падабраць святло, сувымераць прадметы ў драматургіі экспазіцыі і г.д.)

### НАЗВА МУЗЕЯ — СЭНСАЎТВАРАЛЬНАЯ!

***— У новым будынку музей не зменіць назву?***

— Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — у гэтым і заключаецца яго глыбінная сэнсаўтваральная назва. Гістарычная, патрыятычная і сімвалічная.

**(Заканчэнне на 4-й стар.)**

# Школьнікі не забываюць подзвіг выдаўцоў падпольнай «Звязды»

**Сталічныя школьнікі з 78-й і 26-й сярэдніх школ, а таксама жыхары і адміністрацыя інтэрната галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама (што на вуліцы Беларускай) працягваюць шэфстваваць над мемарыяльнай дошкай, якая знаходзіцца на шматпавярховіку па вуліцы Беларускай і ўсталявана ў гонар сям'і Хадасевічаў і нашай газеты-падпольшчыцы. Так, у прафесійнае свята журналістаў, Дзень друку, і напярэдадні Дня Перамогі школьнікі ўсклалі кветкі да гэтага памятнага месца, а выхавальнік інтэрната Іосіф СІВАКОЎ расказаў маладому пакаленню пра «Звязду», пра Пятра Хадасевіча, пра Вялікую Айчынную вайну і подзвіг беларускага народа.**

Адметна, што нядаўна ў інтэрнаце памянялася адміністрацыя, але новыя супрацоўнікі не кінулі справу сваіх папярэднікаў і працягваюць шэфства над мемарыяльнай дошкай:

— Ну а што, я падумаў: будзе непрыгожа, калі мы правялі адзін раз мерапрыемства і ўсё. Так няправільна, трэба працягваць традыцыі. Наогул, самае важнае, што ў гэтым прымаюць удзел дзеці: яны ўсклалі кветкі, трошкі паслухалі і нешта для сябе вынеслі карыснае, — лічыць Іосіф Сівакоў. — Адзінае што няма палічкі пад мемарыяльнай дошкай, кветкі няма куды цывілізавана пакласці. Давялося ўчора перацягнуць сюды клумбу бетонную, пафарбаваць яе. Так хоць больш-менш прыстойна выглядае...

Самае цікавае, што пра адсутнасць палічкі для кветак пад мемарыяльнай дошкай супрацоўнікі інтэрната казалі яшчэ ў верасні мінулага года. Тады «Звязда» звярнулася ў адміністрацыю Савецкага раёна Мінска да начальніка аддзела культуры Сяргея Мядзведзева. Ён абяцаў дапамагчы... Як бачым, сітуацыя не змянілася. Зараз я зноў набраў нумар Сяргея Уладзіміравіча. Ён патлумачыў, што, аказваецца, змяніць нейкую мемарыяльную дошку вельмі складана — шмат паперы трэба перавесці.

— Нават усталяванне палічкі патрабуе складаных узгадненняў з камітэтам архітэктуры і ўпраўленнем культуры Мінгарвыканкама і далей па ланцужку. Бо змены нейкіх культурных ці архітэктурных тонкасцяў патрабуюць складаных прафесійных узгадненняў і прыняцця рашэнняў Мінгарвыканкама і яго адказных службаў. Гэта не проста — прыбіў і усё, — патлумачыў ён...

Нагадаем, што з верасня 2010 года прайшло больш за 7 месяцаў, а нічога з месца не зрушылася. Таму зараз «Звязда» бярэ справу пад сваю пільную ўвагу — мы адпраўляем публікацыю ў Мінгарвыканкам на рэагаванне і будзем сачыць за развіццём сітуацыі. Пагадзіцеся, што пакуль патлумачыць тым жа школьнікам, чаму ім няма куды пакласці кветкі, вельмі і вельмі цяжка...

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# САМ-НАСАМ З НЕБАМ

**КОЛЬКІ дзён таму 61-я знішчальная авіябаза прымала замежных гасцей — прадстаўнікоў з 27 краін свету, а 1 мая адзначыла свой 60-гадовы юбілей.**

Маё дзяцінства праходзіла пад гул самалётаў, якія днём і ноччу пралятралі над нашай вёскай. Вёска знаходзілася за 12-15 км ад аэрадрома ў Баранавічах. Якіх толькі самалётаў не давялося мне пабачыць. У 50-я гады ў небе праносіліся маленькія вёрткія МіГі — тыя, што ваявалі ў Карэі. Паволі плылі «лятаючыя крэпасці», якія засталіся ў нас пасля вайны, — гэтыя бамбардзіроўшчыкі ў Баранавічах не базіраваліся, але нярэдка сюды заляталі. Здаралася, знішчальнікі нізка пралятралі над вёскай, і тады людзі ад нечаканасці нават прысядалі. У той час такое бывала... З самалётаў скідвалі рулончыкі фольгі, і старэйшыя збіралі яе па палях. Затым з той фольгі дзяўчаты рабілі кветкі, абклейвалі абразы...

Пра тое, што ў Баранавічах базіруецца 61-я авіябаза, мала хто ведаў. А вось тое, што аэрадром можа вытрымаць удар атамнай бомбы, што ён самы буйны ў СССР, гаварылася шмат. І ў тых размовах адчуваўся нават гонар. Маўляў, вось побач з якім важным ваенным аб'ектам мы жывём. Праўда, тайна, чуткі... усё ў тагачасным жыцці перамяшалася: была халодная вайна.

*— Сёння ў нас сакрэтаў няма, і мы паказвалі свайім калегам з іншых краін усё, што іх цікавіць, —* сказаў **камандзір 61-й авіябазы падпалкоўнік Аляксандр ПАЦЕХІН**. *— Наша задача — найперш ахоўваць паветраную прастору Беларусі, яе суверэнітэт... Па аб'ёме баявой падрыхтоўкі мы выйшлі на еўрапейскі ўзровень, наш пілот за год налётвае па 60-70 гадзін. Лётчыку неабходна пастаянна трэніравацца — лятаць рэгулярна. Асабовы склад авіябазы здольны выканаць самыя складаныя задачы.*

Асноўная тэхніка на авіябазе — сучасныя знішчальнікі СУ-27 і МіГ-29. Ужо той факт, што ў 2005 годзе на МіГ-29БМ было ўстаноўлена 25 сусветных рэкордаў, сведчыць пра многае.

Мне давялося прысутнічаць пры адпрацоўцы пасадкі самалётаў авіябазы на адрэзку аўтамагістралі паміж Баранавічамі і Івацэвічамі. На першы погляд здавалася, што ў гэтым нічога складанага няма, але аўтадарога — не аэрадромная пасадачная паласа, да якой пілоты прызвычаіліся.

Летась авіябазу, якая знаходзілася ў Бярозе, далучылі да 61-й. Якія праблемы ўзніклі з такім аб'яднаннем?

*— Асаблівых праблем не было, — разважае камандзір авіябазы. — Пілоты ляталі на адных і тых жа тыпах самалётаў, ды і метады падрыхтоўкі не адрозніваліся. Па першым часе ўзнікалі сацыяльныя праблемы. Людзі прыехалі з сем'ямі, ім патрэбна было жыллё, неабходна было ўладкаваць дзяцей у садок, а жонак на працу... Але ўжо сёлета ў лютым быў здадзены дом, і лётна-тэхнічны персанал атрымаў службовае жыллё.*

У ваеннай авіяцыі лётчык незалежна ад пасады і звання ўдзельнічае ў палётах. Узнімаюцца ў неба не толькі камандзір авіябазы і яго намеснікі, але і нядаўнія выпускнікі ваеннай акадэміі Беларусі.

Мяне цікавіў пераходны перыяд, калі пачаў распадацца Саюз, а 61-я авіябаза перайшла ў падначаленне Міністэрства абароны Беларусі. Я сустрэўся з **намеснікам камандзіра па ідэалагічнай рабоце, падпалкоўнікам Мікалаем ШЫРОКІМ і намеснікам камандзіра па лётнай падрыхтоўцы, падпалкоўнікам Юрыем ПЫЖЫКАМ**. Абодва з Гродзеншчыны, і калі першы ў той час толькі паступіў у лётнае вучылішча, то другі ўжо закончыў.

*— З распадам Саюза ўзнікла шмат праблем, —* разважае Юрый Пыжык. *— Я тады служыў у Расіі, а затым вырашыў вярнуцца дамоў. Ды не толькі я адзін, яшчэ разам са мною чалавек 6-7 пайшлі на такі крок. Было няпроста, давялося ехаць у сталіцу і выходзіць на высокапастаўленых асоб. А затым усё наладзілася — за тры гады стаў пілотам 1-га класа.*

*— Тады авіяцыі мала надавалася ўвагі, авіятэхніка старэла, і думалася, што ў нас няма перспектывы, —* працягваў Мікалай Шырокі. *— Але была радасць, што пасля вучылішча трапіў на радзіму. Паступова сітуацыя ў авіяцыі, як і ў цэлым у краіне, нармалізавалася.*

***— Юрый Мікалаевіч, вы адказваеце за лётную падрыхтоўку на базе і ляталі на многіх тыпах самалётаў. Скажыце, а што такое быць пілотам? Неба — яно для многіх ці толькі для выбраных?***

*— Выпадковыя людзі ў авіяцыі — рэдкасць. Але адзін на знішчальніку лятаць можа, а другі — не. Каб быць добрым пілотам — неабходна любіць не толькі неба, але і зямлю, трэба заставацца ў душы рамантыкам і ўмець прыняць рашэнне — узяць адказнасць на сябе.*

*— На бамбардзіроўшчыку ты не адзін — там цэлы экіпаж, і ў цябе ёсць з кім параіцца. А лётчык-знішчальнік сам-насам з самалётам ды небам, —* дадаў М. Шырокі.

***— Мікалай Яўгенавіч, не будзем закранаць усе службы авіябазы. Калі ласка, некалькі слоў пра лётны састаў.***

*— Магу адзначыць толькі адно: калектыў авіябазы цэласны, і для кожнага лётчыка самае важнае — палёты.*

***— А як наконт канкурэнцыі, прафесійнага майстэрства?***

*— Калі прысутнічае здаровы дух канкурэнцыі — гэта нармальна. Канкурэнцыя павінна быць на аснове прафесіяналізму.*

*— У лётнай справе, як у любой іншай, — не ўсе асы, —* удакладніў падпалкоўнік Ю. Пыжык.

***— У кабіне самалёта пілот павінен быць спакойным. Быт не даймае? У сем'ях лад?***

І мае суразмоўцы амаль у адзін голас адказалі, што іх з палётаў чакаюць дома і яны ў сваіх сем'ях упэўненыя. А гэта ўжо нямала.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.**

# БАЯВАЯ ЗАДАЧА ВЫКАНАНА: МОСТ ДЛЯ МЕСЦІЧАЎ НАВЕДЗЕНЫ!

**Напярэдадні святкавання чарговай гадавіны Вялікай Перамогі Заходняя Дзвіна стала месцам правядзення тактыка-спецыяльнага вучэння ваенных чыгуначнікаў маставой роты 77-га асобнага Чырванасцяжнага маставога чыгуначнага батальёна, які, дарэчы, прайшоў баявы шлях з першага да апошняга дня Вялікай Айчыннай вайны: ваеннаслужачыя навялі аўтадарожны мост з маёмасці наплыўнога чыгуначнага моста даўжынёй 183 метры з шырынёй праезнай часткі 4 метры ў горадзе Бешанковічы.**

Вучэнне па аднаўленні вялікага моста праз водную перашкоду прайшло ў адпаведнасці з Планам падрыхтоўкі транспартных войскаў у 2011 годзе. Практычная задача па навядзенні моста была выканана вайскоўцамі за кароткі прамежак часу. Падчас вучэнняў афіцэры, прапаршчыкі, сяржанты і салдаты павысілі палявую вывучку, набылі неабходныя навыкі і прафесіяналізм. Акрамя гэтага, наведзены воінамі-чыгуначнікамі мост акажа вялікую дапамогу ў забеспячэнні паўсядзённага жыцця і дзейнасці арганізацый, прадпрыемстваў і мясцовых жыхароў. Эканамічны эфект для народнагаспадарчага комплексу Віцебшчыны складзе мільёны рублёў: аб'язныя шляхі для сельгастэхнікі і аўтамабіляў скараціліся на 120 кіламетраў.

Зараз злучэнні і часці транспартных войскаў выконваюць вучэбна-практычныя задачы на 10 аб'ектах народнай гаспадаркі краіны. Найбольш значнымі з іх з'яўляюцца ўдзел у будаўніцтве наплыўных і часовых мастоў, рамонт пад'язных чыгуначных пуцей да торфапрадпрыемстваў краіны.

У сакавіку быў пабудаваны часовы мост агульнай даўжынёй 45 метраў на рацэ Туча ў Клецкім раёне. У маі падраздзяленні войскаў пачынаюць навядзенне наплыўнога моста даўжынёй 40 метраў праз раку Сведзь у Рэчыцкім раёне і будаўніцтва аўтадарожнага моста даўжынёй больш за 61 метр. Яшчэ сёлета падраздзяленні войскаў навядуць пешаходны мост даўжынёй 90 метраў у Гродне праз Нёман і аўтадарожны мост даўжынёй больш за 80 метраў у Добрушы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота Юрыя МАЗАЛЕЎСКАГА.**

# Воінам-вызваліцелям горада Заслаўе

Ля мікрафона генерал-маёр танкавых войскаў у адстаўцы А.Ф. Фень.

**НАПЯРЭДАДНІ 66-й гадавіны Перамогі на сцяне будынка чыгуначнай станцыі «Беларусь» адбылася ўстаноўка і ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнай дошкі ў гонар воінаў 31-й Кіраваградскай двойчы Чырванасцяжнай ордэна Суворава 2 ступені танкавай брыгады і 88-й стралковай дывізіі (88 сд) 5-й гвардзейскай танкавай арміі, якія вызвалілі 3 ліпеня 1944 г. горад Заслаўе ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

Задача па вызваленні горада была адной з аперацый стратэгічнага плана 3-га Беларускага фронту па адсячэнні чыгуначнай артэрыі на Мінск і Маладзечна, стварэнні спрыяльных умоў для разгрому войскаў, якія адступалі з Мінска і па вызваленні г. Ракава і іншых населеных пунктаў Мінскай і Вілейскай абласцей.

Цёпла, са шчырай цікавасцю і сардэчнасцю было сустрэта выступленне генерал-маёра танкавых войскаў у адстаўцы Аляксандра Фёдаравіча Феня, удзельніка Сталінградскай і Курскай бітвы (на Прохараўскім полі), члена ВНТ ЦДА, удзельніка ўдарнай аперацыі па авалоданні Заслаўем і баёў за вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У тым баі раптоўнасць удару не дазволіла салдатам нямецкага гарнізона наладзіць абарону, прымусіўшы іх усё кінуць і ўцякаць у лес разам з паліцаямі. Усяго было ўзята ў палон каля 1000 нямецкіх салдат і афіцэраў, захоплена 450 вагонаў і платформаў, 9 паравозаў, каля 200 аўтамашын (на платформах) з боепрыпасамі, ГЗМ і іншым узбраеннем і маёмасцю. Вызвалена больш за 300 савецкіх дзяўчат, зачыненых у таварных вагонах.

**Леанід ЦІТОЎ,**
**член ВНТ ЦДА Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.**

ПАРТЫЗАНЫ Ў БАСАЦІ

ПРЫЕМ РАЗВЕДЧЫКАЎ У ШТАБЕ ПАРТЫЗАНСКАГА ЗЛУЧЭННЯ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ. 1942 г.

*Майскія грамы —*
*гэта мы,*
*Сцежкі у лясах —*
*наш шлях,*
*Рэха ў паднябессі —*
*гэта нашы песні,*
*З імі пераможам,*
*з імі васкрэснем,*
*З імі зноў*
*паўстанем*
*у шыхтах.*

Фотаздымкі — нібы мост, які мы перакідваем цераз рэчку часу. Адны з гэтых фота зробленыя у гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Любанскага раёна — тагачаснага цэнтра партызанскага руху Мінскай вобласці. Другія — сённяшнія, вядуць нас партызанскімі сцежкамі Любаншчыны да святыняў нашай памяці.

# Урад Масквы папоўніў калекцыю музея гісторыі ВАВ новымі кнігамі

У музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прайшла сустрэча ветэранаў і гасцей з Масквы ў рамках выстаўкі «СМІ ў Беларусі».

**Мікалай МАЗАНІК, ветэран Вялікай Айчыннай вайны,** якраз у 1941 годзе, за некалькі дзён да па-

Мікалай МАЗАНІК.

чатку вайны, скончыў пяхотнае вучылішча — 10 чэрвеня атрымаў званне лейтэнанта. 16 чэрвеня прыбыў у штаб Ленінградскай ваеннай акругі, дзе атрымаў прызначэнне ў 708-ы стралковы полк:

— Калі я з Ленінграда прыбыў туды, кіламетры два прайшоў, гляджу — ідзе вялікая калона салдат. Падыходжу, пытаю ў афіцэраў — аказваецца, гэта і ёсць 708-ы полк. Знайшоў камандзіра палка, на хаду прадставіўся, і гэтаксама на хаду я быў прызначаны камандзірам узвода, — расказвае Мікалай Аляксандравіч пра пачатак сваёй яшчэ пакуль мірнай службы. — Ну, а першыя баявыя дзеянні непасрэдна я са сваім узводам пачаў 26 чэрвеня 1941 года. Мне далі ў дадатак кулямётны ўзвод, і мы выконвалі разведку боем. Пры выкананні гэтай задачы мелі страты, у мяне ва ўзводзе было забіта 2 чалавекі і 10 паранена. На «перадку» былі самае

Леанід ЯКАРЭЎСКІ

вы. Ён смяяўся з нас, здзекаваўся. Немцы ў рупары крычалі: «Рускі, што не пяеш «Калі заўтра вайна»?» Ну, вы памятаеце гэтую песню... Яны разглядвалі нас у бінокль і казалі: «Што вы стараецеся, здавайцеся, калі хочаце быць жывымі, заўтра вы ўсе будзеце знішчаны!» Раскідвалі улёткі, што Гітлер будзе сустракаць Новы год у Маскве. Вы ведаеце, гэта было страшна... І вось у дзве гадзіны ночы з 6 на 7 лістапада 1941 года мяне выклікае камандзір дывізіёна: «Цябе запрашае да тэлефона начальнік штаба». Я падышоў, а ён кажа: «Дзеваць чалавек вашага ўзвода вызываюцца ў штаб у поўнай баявой гатоўнасці». Мы і паехалі. Было холадна, ішоў снег. Дваццаць кіламетраў да Масквы ехалі 1,5 гадзіны, бо салдаты замярзалі: грукалі ў кабіну, спынялі машыну, а потым выбягалі і грэліся...

Напрыканцы сустрэчы ўдзельнікі абмяняліся падарункамі: **Дзмітрый РУНГЕ, начальнік упраўлення друку Дэпартамента СМІ і рэкламы Масквы,** падарыў музею гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і ветэранам апошнія выданні пра вайну, выдадзеныя ў Расіі пры падтрымцы ўрада Масквы, а музей у сваю чаргу падарыў маскоўскім гасцям беларускія выданні.

Дарэчы, **вучоны сакратар музея Галіна БАБУСЕНКА** адзначыла, што ў выставачных залах і фондах музея вельмі шмат друкаваных выданняў часоў Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку і «Звязды»:

— СМІ ў гады вайны аказалі вялізную дапамогу нашаму насельніцтву, нашым байцам. І яны ў нас шырока прадстаўлены ў экспазіцыі. Гэта і франтавыя, і дывізіённыя, і армейскія газеты, і проста ўлёткі франтавыя, і партызанскі друк. І, вядома, газета «Звязда», з якой мы сёння актыўна супрацоўнічаем. Дзякуй вам вялікі, вы — дастойныя прадаўжальнікі справы тых людзей, якія пачыналі ў далёкія гады і выдавалі газету ў часы вайны.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# САМЫ МІРНЫ МУЗЕЙ У СВЕЦЕ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

***— Задам пытанне, якое мне самой не падабаецца, але тым не менш яно часам агучваецца асобнымі грамадзянамі... Ці не плануецца пашырыць назву: музей гісторыі Другой сусветнай вайны або ўвогуле музей войн на тэрыторыі Беларусі?***

— Не, мы ўсё-такі музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Мы — гэта Беларусь. Мы — гэта частка Савецкага Саюза, якая больш за ўсё пацярпела, і частка таго Савецкага Саюза, які перамог. А калі Другая сусветная — значыць, і Афрыку трэба паказваць, і сітуацыю ў еўрапейскіх краінах, якія закранула вайна...

Мы будзем гаварыць аб усім у кантэксце Другой сусветнай: пра ленд-ліз; стануць больш шырокімі, разгорнуцца рамкі аперацыі «Багацыён», у гэты час адкрываўся другі фронт, былі скаардынаваны і зладжаны дзеянні саюзнікаў (не толькі ваенных, але і палітыкаў). Глыбей адлюструем і пралог вайны, і вытокі нацызму (таксама трагедыя германскага народа)... Сённяшнія рэаліі, калі ідзе глабалізацыя, інтэграцыя, калі ў Беларусь прыязджае шмат замежных турыстаў, — нам важна аб'ектыўна паказаць усё гэта.

...А наконт другой часткі вашага пытання — мы не пойдзем у гісторыю войнаў, іх класіфікацыю: гэта не музей войнаў. Дый увогуле, ці патрэбны ў Беларусі музеі войнаў? Мы — не мілітарыстычная дзяржава... Прынамсі, з гістарычнага пункту гледжання, адсутнічаюць дакладна вывераныя падыходы і ацэнкі ваенных падзей на Беларусі. Не варта забываць, што за сваю складаную гісторыю наша тэрыторыя ўваходзіла і ў склад Вялікага Княства Літоўскага, і Рэчы Паспалітай, і Расійскай імперыі (я ўжо не кажу пра войны нашых продкаў у складзе Полацкага і Тураўскага княстваў і г.д.) — ваенныя падзеі канкрэтнай гістарычнай эпохі досыць неадназначныя. Тым больш што яны з'яўляюцца прадметам пільнай увагі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, абласных і раённых краязнаўчых музеяў, Гомельскага абласнога музея ваеннай славы, Дзяржаўнага музея ваеннай гісторыі Міністэрства абароны...

Ні ў якім разе нельга «размываць» тэму гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, ставіць яе ў адзін шэраг з іншымі падзеямі ваеннай гісторыі. Для нашага народа гэта была асабліва, трагічная па маштабах вайна, у якой загінуў кожны трэці жыхар і ў якой супраць акупанта ўзняўся, па сутнасці, увесь народ. Ні ў адной краіне свету такога не было.

Перакананы: наш музей — самы мірны музей у свеце. Ён паказвае, сведчыць, што вайны не павінна быць — нідзе і ніколі. Вось чаму такімі важнымі застаюцца ўрокі Вялікай Айчыннай.

### ГАЛОЎНАЕ — ЗАХАВАЦЬ СВЕДЧАННЕ НАРОДНАГА ПОДЗВІГУ

У новай экспазіцыі галоўным і вызначальным застанецца адлюстраванне подзвігу беларускага народа ў гады вайны, салідарнасці і ўзаемадапамогі народаў Савецкага Саюза і краін антыгітлераўскай кааліцыі ў барацьбе з ворагам, паказ вырашальнай ролі СССР у перамозе над фашызмам.

— Цяпер, у XXI ст., прычыны, вынікі, наступствы небывалай па маштабах у гісторыі чалавечай цывілізацыі вайны, набыты гістарычны, палітычны, ваенны вопыт маюць патрэбу ў грунтоўным, у тым ліку і музейным, асэнсаванні, абмеркаванні, у пазбаўленні ад фальсіфікацый, міфаў і падманаў, — адзначае Сяргей Іванавіч. — Неабходна пазбегнуць таксама і лакіроўкі падзей. Будзе шырока прадстаўлена жыццё грамадзянскага насельніцтва ва ўмовах вайны — гэтым узмоцніцца разуменне вайны, што прыносіць гора і беды народам, як жорсткай і непатрэбнай. Ваенныя катаклізмы — гэта і чалавечыя пакутаванні, таму імкнёмся, каб наведвальнікі музея задумаліся аб сваіх каранях, аб лёсе продкаў у кантэксце гістарычнага лёсу Радзімы, аб тым укладзе, які ўносіць кожны чалавек у гісторыю цывілізацыі, фарміруючы яе аблічча і развіццё.

***— За час існавання паступова змянялася і ўдасканальвалася экспазіцыйная палітыка музея?***

— Яна адпавядала патрабаванням канкрэтнага часу. Адразу пасля вайны, калі ў беларускага народа, які прайшоў праз жорны трохгадовай акупацыі, былі яшчэ свежымі раны ад перажытага, ад неймаверных людскіх страт, — у аснову экспазіцыі была пакладзена перш за ўсё ідэя паказу трагедыі, жахаў, гора акупацыі і подзвігу герояў вайны. Дакументы і экспанаты з асаблівым дакументалізмам адлюстроўвалі акупацыйны рэжым і барацьбу народных мсціўцаў, партызан і падпольшчыкаў, з ворагам.

У перыяд «халоднай вайны» (1960-1980-я гады) праз усю экспазіцыю праходзіла злучальная нітка паміж перыядам вайны і барацьбой за мір. Была істотна пашырана франтавая тэматыка, упор рабіўся на праслаўленне подзвігу савецкага народа, які прынёс мір планеце. У экспазіцыі значнае месца займалі асабістыя рэчы палкаводцаў і военачальнікаў (радзей — малодшых камандзіраў і радавых), нярэдка з аднолькавым наборам экспанатаў: узнагароды, кіцель, шашка, планшэт... Тагачасная ідэалагічная ўстаноўка скіроўвала на адлюстраванне кіруючай ролі партыйных і камсамольскіх арганізацый, тады як недастатковая ўвага ўдзялялася беспартыйным удзельнікам вайны, іх укладу ў Перамогу быў адлюстраваны фрагментарна. А роля ваеннаслужачых, якія апынуліся ў 1941 годзе ў акружэнні і сталі арганізатарамі і кіраўнікамі партызанскага руху, практычна замоўчвалася, як і роля мясцовага насельніцтва. Гэтая дыспрапорцыя была часткова выпраўлена пры абнаўленні экспазіцыі ў 1980-я гады і пры рэканструкцыі экспазіцыйных залаў у 1996-2005.

У перыяд «перабудовы» грамадства стала больш адкрытым, набыткам галоснасці сталі раней невядомыя дакументы, што знайшло адлюстраванне і ў музейнай экспазіцыі. Была ўведзена інфармацыя аб праціўніку, змешчаны фотадакументальныя матэрыялы, перададзеныя германскім бокам, і матэрыялы па антыгітлераўскай кааліцыі, аб Арміі Краёвай.

Разам з тым, у гэты час у некаторых СМІ велізарным патокам пайшла і прамая фальсіфікацыя як ходу вайны, так і яе вынікаў у цэлым. Нечакана крэн пазітыву пайшоў у бок нашага праціўніка перыяду вайны. Амаль цалкам знікла інфармацыя аб савецкіх военачальніках і героях вайны, затое змяшчалася вялікая колькасць інфармацыі аб лепшых лётчыках люфтвафэ, камандзірах трэцяга рэйха і г.д. У гэтых складаных умовах музей захаваў гістарычную пераемнасць і патрыятычную скіраванасць — як, дарэчы, і найстарэйшая беларуская газета «Звязда», у вайну — газета-падпольшчыца і партызанка.

### «ЗВЯЗДА» Ў МУЗЕЙНАЙ ЭКСПАЗІЦЫІ

***— У экспазіцыйных планах значыцца: рэканструкцыя партызанскай друкарні і канспіратыўнай кватэры...***

— «Звязда», наша родная беларускамоўная газета, пакінула значны след у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Невыпадкова помнік першаму рэдактару падпольнай «Звязды» Уладзіміру Амельянюку і іншым звяздоўцам-падпольшчыкам стаіць на галоўнай плошчы Мінска, плошчы Незалежнасці.

Некалькі гадоў таму, да 90-годдзя газеты, мы сумесна праводзілі акцыю «Радок «Звязды» ў гісторыі краіны». Тады ж зрабілі інтэрактыўную зону, партызанскую зямлянку-друкарню, дзе кожны можа падысці і «пракатаць» партызанскую лістоўку, узяць водгіск... Менавіта вось так, амаль што ўжывую, мы хочам зрабіць і канспіратыўную кватэру. Каб наведвальнік адразу, што называецца, патрапіў у «асяроддзе пражывання», апынуўся ў тагачаснай атмасферы, абстаноўцы. Ён нібыта ў той сістэме, у падпольнай канспіратыўнай кватэры: інтэр'ер будзе створаны пры дапамозе аўтэнтычных музейных прадметаў.

***— І сапраўды, найгалоўнае ў музеі — жывы экспанат, астатняе можна паглядзець і ў інтэрнэце...***

— Безумоўна! У нас былі калегі з многіх музеяў ваенна-гістарычнай тэматыкі і ўвогуле нацыянальных музеяў з іншых краін — усе ў адзін голас гавораць: найбагацейшы прадметны рад. І замяняць яго «чыстай» тэхналогіяй проста бессэнсоўна і безразважна.

***— Сяргей Іванавіч, мабыць, з'явіцца магчымасць больш расказаць і пра патрыётаў, якія рыхтавалі падпольную «Звязду»...***

— Пастараемся зрабіць так, каб увага наведвальнікаў больш завастралася на гэтых людзях. Таму што, калі зараз ідзеш па зале, прысвечанай падпольнаму руху, назіраецца пэўная аднастайнасць: адзін рад планшэтаў. Так, гістарычна — усё дакладна, класічна — усё правільна, і ўсё ж... А новы падыход дапаможа бліжэй пазнаёміцца з лёсам людзей, якія змагаліся і ахвяравалі жыццямі.

### «ЖЫВАЯ ЭКСПАЗІЦЫЯ» — З УЛІКАМ СУСВЕТНЫХ СТАНДАРТАЎ

***— Музей зрабіў заяўку на ўзроўні сусветных стандартаў?***

— І гэта не перабольшанне. Новая экспазіцыя нашага музейнага храма складзецца з тэматычных блокаў, пры гэтым захаваецца храналагічная паслядоўнасць: перадваенны (міжваенны) перыяд, ваенныя падзеі 1939-1945 гг., акупацыйны рэжым, партызанскі рух і падпольная барацьба, аднаўленчы перыяд. Прычым у кожным з экспазіцыйных блокаў будзе функцыянаваць свой цэнтр з рэканструкцыяй гістарычнага сюжэта і асяроддзя.

Дамінантамі новай экспазіцыі стануць унікальныя калекцыі музея: зброі, баявых сцягоў, друкаваных і рукапісных партызанскіх выданняў, плакатаў, прадметаў абмундзіравання. Экспазіцыю мяркуецца пабудаваць пераважна на сапраўдных, аўтэнтычных

Экспанаты музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

прадметах, але для захавання ўнікальных, далікатных, чуйных да разбурэння прадметаў (фотаздымкі, дакументы, плакаты, газеты, лістоўкі і г.д.) будуць заказаны муляжы, макеты і копіі.

Экспазіцыя стане не проста зборам гістарычных рэліквій, але і рабочай пляцоўкай для ажыўлення гістарычных падзей з выкарыстаннем усіх сучасных тэхналагічных дасягненняў сусветнай музейнай практыкі — менавіта для стварэння «жывой экспазіцыі».

Інтэрактыўныя аб'ёмна-прасторавыя кампазіцыі і дыяграмы «Лагер смерці Трасцянец», «Мінскі кацёл», іншыя прадстаўляюць рэканструкцыю гістарычных падзей — дзеля стварэння ўмоў максімальнага пранікнення наведвальніка ў гістарычнае асяроддзе. Так, у штабной зямлянцы, надзеўшы навушнікі партызанскай радыёстанцыі, наведвальнік пачуе сігналы азбукі Морзэ, зможа паспрабаваць запісаць або расшыфраваць якое-небудзь паведамленне.

Экспазіцыя будзе абсталявана разнастайнымі аўдыя- і відэасродкамі для дэманстрацыі галасоў, шумаў, музыкі, відэаматэрыялаў, выяў дакументаў і даведачных матэрыялаў. Сучасныя тэхнічныя сродкі даюць магчымасць рэканструяваць невялікія сюжэты ці канкрэтныя прадметы ў электронным выглядзе. Напрыклад, на маніторах, убудаваных у экспазіцыйнае абсталяванне, наведвальнікі ўбачаць працэс пабудовы партызанскай зямлянкі і яе ўнутранае ўладкаванне ва ўсіх праекцыях.

Будуць створаны электронныя каталогі і даведнікі для прадстаўлення ў інфакіёсках.

На кожным экспазіцыйным узроўні створым магчымасць для інтэрактыўнага адпачынку. Наведвальнікі змогуць атрымаць дадатковую інфармацыю аб гістарычных падзеях праз інфакіёск ці плазменны экран, побач будуць размешчаны дысплеі, дзе можна будзе запісаць уласныя ўспаміны аб гістарычных падзеях ці выказаць свае адносіны да іх.

Перад музеем запрацуе пляцоўка з баявой тэхнікай і цяжкім узбраеннем Чырвонай Арміі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Самалёт Лі-2, размах крылаў якога складае 28 м, таксама размесціцца на прылягаючай да будынка музея пляцоўцы ў Парку Перамогі і стане цэнтрам экспазіцыі пад адкрытым небам «Партызанскі лагер», дзе для ахвотных будуць арганізаваныя інтэрактыўныя экскурсіі «Самалёты ляцяць да партызанаў».

Тэхнічная інфраструктура забяспечыць надзейнасць абароны музейных прадметаў. Будуць адпаведным чынам абсталяваны фондасховішча і рэстаўрацыйныя майстэрні.

Навукова выверэная экспазіцыя разгорнецца ў прывабным для наведвальнікаў музейным асяроддзі: сёння рынак дыктуе распрацоўку новых форм работы. Сусветная практыка сведчыць, што развіццё музеяў ідзе па шляху ператварэння іх у комплексныя культурна-гістарычныя цэнтры і цэнтры вольнага часу. Гэта істотна змяняе падыход да арганізацыі музейнай прасторы.

Пастараемся забяспечыць усім камфортнае знаходжанне ў музеі, у тым ліку і людзям з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. Сярод аб'ектаў інфраструктуры: буфет (рэстаран), інтэрнэт-кафэ, сувенірны магазін, кінавідэацэнтр з функцыямі прэс-цэнтра, лекцыйная, выставачныя (прэзентацыйныя) залы са зменным абсталяваннем, аўтастаянкі, у тым ліку для аўтобусаў.

***— Сапраўды сусветны ўзровень!***

— Частка залаў будзе абсталявана аўдыясістэмамі ў выглядзе тэлефонных трубак ці навушнікаў для індывідуальнага праслухоўвання музыкі і песень даваенных і ваенных гадоў, а таксама аўдыязапісаў з успамінамі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, паведамленнямі ТАСС, сводкаў Саюзінфармбюро (голас дыктара Юрыя Левітана).

Цікавым будзе і агульнае гукавое афармленне. У залежнасці ад залы гук можа быць нечаканым і гучным (артылерыйская канада, паветраны налёт, гаўканне сабак) альбо цішым і лірычным (гукі лесу, патрэскванне вогнішча, песні і г.д.).

***— У многіх музеях свету для турыстаў прадугледжаны аўдыягід...***

— Наша экспазіцыя таксама будзе абсталявана сістэмай «аўдыягід» на беларускай, рускай, англійскай і нямецкай мовах для самастойнага знаёмства з экспазіцыяй. Для замежных наведвальнікаў будуць устаноўлены ўказальнікі-піктаграмы з тэкстам на англійскай мове.

### ЦЭНТР ГРАМАДСКАГА ДЫЯЛОГУ

— Музей павінен стаць цэнтрам грамадскага дыялогу па пытаннях гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, — перакананы Сяргей Азаронак. — З дня заканчэння Вялікай Айчыннай вайны прайшло 66 гадоў, у дарослае жыццё ўступае ўжо трэцяе пакаленне, якое не зведала вайны, і вельмі важна ўлічваць агульнае светаадчуванне гэтых маладых людзей. Сённяшняй моладзі даступная ўся інфармацыя, якой перапоўнены інтэрнэт. З аднаго боку, гэта дае магчымасць з розных бакоў паглядзець на пэўную праблему, а з другога — маладому чалавеку няпроста разабрацца ў разнастайнасці поглядаў і думак.

Узаемаразуменне, якое ўстанавілася паміж былымі праціўнікамі, садзейнічае захаванню стабільнасці ў свеце. Аднак у апошнія гады, асабліва з адыходам з жыцця ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, узмацнілася проціборства ў ацэнках падзей вайны. На адных вагах — гістарычная праўда, на другіх — фальсіфікацыі...

У новым будынку музея будуць створаны ўсе ўмовы, каб Праўда Гісторыі была неаспрэчна засведчана фактамі, якія самі па сабе з'яўляюцца аксіёматычнымі аргументамі.

**Гутарыла Таццяна ПАДАЛЯК.**

# Вялікая Айчынная вайна ў памяці маёй сям'і

Вайна пакінула крывавы след у гісторыі нашага народа, у кожнай сям'і, у чалавечых лёсах. Бяда не абышла і тых, хто вярнуўся дадому з крывавых палёў вайны. Многія памерлі ад франтавых ран, засталіся інвалідамі. Вайна пакінула меткі на кожным пакаленні. Як шмат у Беларусі сем'яў, дзе боль страты да гэтай пары пячэ... Многім прыйшлі не пахаванкі, а ўсяго толькі паведамленні, што «прапаў без вестак». І такіх сотні тысяч. У першыя гады ваеннага ліхалецця іх, што прапалі без вестак, загінула болей, чым тых, каго пахавалі пасля бою, пасля смерці ў медсанбаце, у тылавым шпіталі, чыя смерць засведчана па ўсіх правілах у спісе незваротных страт.

Невядомымі гінулі салдаты, што прынялі на сябе першы агнявы шквал. Яны палеглі ў прыграніччы, пры адступленні і акружэнні, у так званых «катлах» цэлымі палкамі і дывізіямі. Ніхто не бачыў іх мёртвымі: лётчыкаў, што не вярнуліся з баявога задання, разведчыкаў, якія загінулі ў тыле ворага без сведак, пехацінцаў, ад якіх не заставалася і следу пры пападанні снарадаў і бомбаў ці якіх жывымі засыпала ў траншэях.

Цаной свайго жыцця яны вымотвалі і абяскроўлівалі ворага, выйграючы для Айчыны час. Без іх не было б Перамогі. Проста ім не пашанцавала ў смерці.

Асобны радок у гэтым пераліку — палон, лагеры, дзе бясследна знікалі сотні тысяч паланёных у баях воінаў.

Удовам і маці ваенкаматы давалі афіцыйныя тлумачэнні: прапалыя без вестак — гэта тыя, хто ў ходзе баявых дзеянняў не вярнуліся ў свае падраздзяленні, хоць большасць з іх загінула. Але баявыя дзеянні не дазволілі ўстанавіць гэта.

Не ведаючы пра месца пахавання роднага чалавека, немагчыма пахаваць яго ў сваім сэрцы. Людзі шукалі і працягваюць шукаць, і ў шэрагу выпадкаў знаходзяць сведак — аднапалчан, якія аднаўляюць падрабязнасці гібелі.

У маёй сям'і таксама захоўваецца такое тлумачэнне — «прапаў без вестак», і я вырашыла даведацца, каму яно належыць. Для гэтага мне давялося скласці радавод маёй сям'і. Вось што я змагла даведацца ў сваёй бабулі, Веры Якаўлеўны Падгайскай.

«Мае бацькі, Ліпіцкі Якаў Міхайлавіч, 1909 года нараджэння (нажаль, поўная дата нараджэння невядомая) і Вольга Лявонцьеўна Ілынская (8 верасня 1909 года), нарадзіліся і жылі ў вёсцы Соханава (зараз не існуе) Мсціслаўскага раёна. У сям'і бацькі было чатыры браты і сястра. У 1936 годзе бацькі ўступілі ў шлюб і пераехалі жыць у вёску Глазаўшчына (зараз не існуе) Мсціслаўскага раёна. Пабудавалі невялікую хату. Бацька працаваў у калгасе «Пісарэўшчына» кладаўшчыком, маці — рабочай. У 1937 годзе ў іх нарадзілася першая дачка, якую назвалі Верай (мая бабуля), а ў 1940 — яшчэ адна дачка — Люба.

У канцы чэрвеня 1941 года была аб'яўлена ўсеагульная мабілізацыя, і бацьку прызвалі ў рады Чырвонай Арміі. Разам з іншымі аднавяскоўцамі ён пайшоў на вайну. На памяць аб гэтым дні захаваўся яго фотаздымак у ваенным адзенні. Больш пра яго мы нічога не ведалі. 14 ліпеня 1941 года наша вёска была занята фашыстамі, наступіў цяжкі час акупацыі. Лістоў мы не атрымлівалі і не ведалі, дзе знаходзіўся мой бацька. У 1944 годзе вярнуўся з фронту адзін паранены аднавясковец. Не ведаю, як яго прозвішча. Я памятаю толькі, што яго звалі Змітрок. Ён прыйшоў да нас і расказаў, што ў час бою летам (у канцы жніўня) некалькі салдат, сярод якіх быў мой бацька, трапілі ў фашысцкі палон. Гітлераўцы вельмі здзекваліся з салдат: білі, марылі голадам. У гэтым лагеры мой бацька захварэў на тыф. Група салдат вырашыла зрабіць падкоп і ўцячы з палону. Змітрок гаварыў, што яны клікалі з сабою майго бацьку, але ён быў вельмі хворы і сказаў, што не зможа выбрацца. Так і застаўся ў лагеры для ваеннапалонных. А астатнія салдаты прабіліся да сваіх і выжылі.

Пасля Перамогі мы звярнуліся ў ваенкамат, і адтуль прыйшло паведамленне, што радавы Чырвонай Арміі Ліпіцкі Якаў Міхайлавіч, знаходзячыся на фронце Айчыннай вайны, пры абароне Радзімы прапаў без вестак у жніўні 1944 года. Потым мы шукалі яго: звярталіся і ў архівы, пісалі ў Міністэрства абароны. Але атрымлівалі адзін адказ: прапаў без вестак...»

Я вырашыла паспрабаваць адшукаць якія-небудзь звесткі пра свайго прадзеда. У кнізе «Памяць. Мсціслаўскі раён» знайшла, што Якаў Міхайлавіч Ліпіцкі значыцца як прапалы без вестак.

Звярнулася на расійскі пашуковы сайт obd. memorial, але і там значыцца мой прадзед прапалым без вестак. Але я веру, што калі-небудзь змагу пакланіцца магіле свайго прадзеда. Бо вайна лічыцца скончанай толькі тады, калі будзе пахаваны апошні салдат, а значыць мой пошук будзе працягвацца...

**Наталля ЦІХАНОЎСКАЯ,**
**вучаніца 11-га класа**
**ДУА «Капачоўскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад — сярэдняя школа».**
*Мсціслаўскі раён Магілёўскай вобласці.*

**Глядзі сваё!**

# Крэпасць-герой можа належаць кожнаму

## Фільм «Брэсцкая крэпасць» выходзіць на DVD

Гучны кінапраект Саюзнай дзяржавы стане больш даступны для шырокай аўдыторыі. Пра гэта паклапаціліся Нацыянальная кінастудыя, Дэпартамент па кінематаграфіі Міністэрства культуры і кампанія «Вігма». Літаральна напярэдадні свята Перамогі два дні, 6 і 7 мая, у сталіцы ў буйных гандлёвых цэнтрах «Бігс» і «Гіпа» прадставяць DVD-версію фільма.

Фільм «Брэсцкая крэпасць», які ў якасці рэжысёра зняў Ігар Угольнікаў, прайшоў у кінатэатрах і выклікаў цікавасць як у беларускага, так і ў расійскага гледача: рэальная гісторыя плюс ўсе сучасныя трукі, спецэфекты. Аднак жа каштавала гэта і немалых грошай — праект атрымаўся маштабны і па фінансавых выдатках. Таму адлічэнні ад продажу фільма на DVD-дысках на тэрыторыі Беларусі вернуцца ў бюджэт Саюзнай дзяржавы.

Хочаце набыць фільм? Варта наведаць буйны гіпермаркет. Бачыце там дзяўчат у вайсковай форме з палявымі торбамі? Вам сюды. У торбах — відэапрадукцыя на ваенную тэматыку. А раптам яшчэ што нагледзіце... З'яўленне фільма «Брэсцкая крэпасць» на DVD — добры знак таго, што праца па папулярызацыі айчыннага кінематографа ў нас ідзе. І яшчэ адзін знак, адмыслова важны для Беларусі: наперадзе наша ваеннае кіно. Таму што беларускія пакупнікі змогуць набыць у хатнюю калекцыю такія фільмы, як «Снайпер. Зброя адплаты», «Ваўкі», «Крапавы берэт».

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ПАРЦЯНКІ АБО ШКАРПЭТКІ?

**На працягу некалькіх стагоддзяў яны бездакорна служылі нагам мільёнаў салдат. Парцянкі не толькі абаранялі ад холаду, мазалёў — гэта быў прадмет для паэзіі, салдацкага гумару і фальклору. Вакол замены парцянак на шкарпэткі не спыняюцца спрэчкі. Хтосьці лічыць гэта прагрэсіўным крокам, а нехта, наадварот, з настальгічным шкадаваннем успрымае пераход на шкарпэткі.**

Перш чым ганьбіць альбо абараняць парцянкі, варта ўспомніць гісторыю. І калі вы думаеце, што парцянкі — вынаходніцтва выключна славянскае, то памыляецеся. Аказваецца, прапрадзеды парцянак з'явіліся яшчэ 26-30 тыс. гадоў таму на захадзе Еўразіі. Эрык Трынакаус, гісторык Вашынгтонскага ўніверсітэта, па змяненні касцей ступні даказаў, што тагачасныя людзі насілі абутак, — падобны на парцянку са скуры мядзведзя, са сцілкамі з травы.

Паступова парцянкі сталі важнай часткай ваеннай амуніцыі большасці армій свету. Рымскія легіянеры і тыя абмотвалі ногі кавалкамі тканіны. Гэта даказвае і той факт, што пры будаўніцтве адной са станцый рымскага метро была знойдзена такая «парцянка». Вучоныя прыйшлі да высновы, што насіць яе маглі ў 79 годзе да н.э. Пасля тая парцянка была падорана тагачаснаму прэзідэнту ЗША. Зараз яна ацэньваецца ў 500 тыс. доларaў.

Нешта падобнае на парцянкі было ў рэвалюцыйнай арміі Джорджа Вашынгтана.

Самае цікавае, што нашэнне парцянак рускія перанялі з Захаду. Пётр I пераняў гэтую традыцыю ў галандцаў. Яна настолькі прыжылася ў рускім войску, што спробы замяніць парцянкі на панчохі ў сярэдзіне XVIII стагоддзя (зноў-такі па еўрапейскім узоры) не прынеслі поспеху. Парцянкі былі нашмат больш практычнымі.

Адмаўленне ад векавой традыцыі нашэння парцянак у арміях свету пачало адбывацца ў сярэдзіне XX стагоддзя. Еўрапейская армія перайшла на шкарпэткі досыць хутка. Аднак салдаты вермахта падчас Другой сусветнай вайны яшчэ насілі парцянкі, асабліва на ўсходнім фронце. Шкарпэткі, якія выдавалі нямецкім салдатам, тыя выкарыстоўвалі ў якасці рукавіц, якіх катастрафічна не хапала.

Нашы суседзі, як і мы, пра адмову ад парцянак загаварылі чатыры гады таму. Першай гэта зрабіла Украіна. Там нават збіраліся помнік парцянцы паставіць. Беларускі салдат апошнюю парцянку абмяняў на шкарпэтку яшчэ летась. Расійская армія на шкарпэткі і армейскія боты будзе пераходзіць яшчэ год-два.

Нягледзячы на тое, што парцянкі, здавалася б, закінутыя на гарышча гісторыі, у іх застаецца досыць шмат прыхільнікаў.

Яны адзначаюць, што гэта ўніверсальнае і геніяльнае вынаходніцтва. Маўляў, у палявых умовах парцянкай можа стаць усё што заўгодна, і калі яе правільна заматаць, то цяпло і адсутнасць мазалёў вам гарантаваныя. Да плюсоў парцянак таксама адносяць тое, што ў палявых умовах іх можна проста перакруціць брудным бокам наверх — і ты ізноў у баі. А вось са шкарпэткамі такога не зробіш.

Да мінусаў парцянак адносяць доўгую працэдуру намотвання і вучобу гэтаму, а таксама — негігіенічнасць і праблемы з мыццём.

На прасторах інтэрнэту «парцяначных» спрэчак узнікае вельмі шмат. У рунэце нават створаны спецыяльны форум пад назвай «Развітанне парцянкі». Адназначнай думкі на гэты конт няма. Прынамсі, пакуль камандаванне краін, дзе насіліся парцянкі, прымае рашэнне не на карысць апошніх.

**Што вы думаеце пра пераход на шкарпэткі? Можа, варта было б пакінуць парцянкі? Гэтае пытанне «Звязда» задала беларускім мужчынам.**

**Настасся ЗАНЬКО.**

**Юрый СКВАРЦОЎ, супрацоўнік станцыі тэхнічнага абслугоўвання, адслужыў у вучэбным падраздзяленні ў Печах:**

— Я ў дадзены момант у парцянках. Так, і не здзіўляйцеся. Я да дэмбеля хадзіў у парцянках. Гэта вельмі зручна: ты іх перавярнуў, і ўсё. Пры маёй памяці ў нас дэсантнікі нават у армейскія боты надзявалі парцянкі. У Печах таксама шмат хто парцянкі ў «берцы» насіў. Таму што абутак усё роўна першы час будзе намульваць, а вось пры правільным намотванні парцянак такая сітуацыя можа і не ўзнікнуць. Ды і зімой цяплей у іх, чым у шкарпэтках. І яшчэ на марш-кідках ёсць шэраг нязручнасцяў са шкарпэткамі. Яны могуць злазіць, хутка станавіцца вільготнымі, і што пасля? Вось парцянкі — іншая справа, на прывале памяняў другім бокам, і зноў у форме. Разумееце, наконт шкарпэтак тут такая рэч, калі іх мяняць штодня, то магчыма. А вось калі раз на тыдзень мяняць, як у лазню хадзіць, то, думаю, гэтага будзе недастаткова.

**Аляксандр СЯРЭБРАНІКАЎ, тэлевядучы, праходзіў службу ў ваенна-паветраных сілах:**

— Ну, дзякуй Богу, што ўжо шкарпэткі! Мне яшчэ давялося служыць з парцянкамі. Былі спецыяльныя заняткі па іх намотванні. Калі трэба было апрануцца за 45 секундаў, то на парцянкі траціласа 3-4 секунды. Аднак для таго, каб заматаць парцянкі добра, патрэбна была хвіліна. На працягу першага тыдня асабіста ў мяне былі мазалі. Аднак пасля «дзядоў» паказалі, як правільна закручваць іх, прычым зусім не так, як гэта паказваў старшына, і ўсё было ў парадку. Дарэчы, наконт духу, які нібыта стаяў у казармах, — такога не было. Калі людзі сочаць за чысцінёй (а ў арміі хочаш-не хочаш, а такім будзеш), то ніякіх непрыемных пахаў няма абсалютна. Прынамсі, у нашай казарме нічога такога не было. Што лепш: парцянкі ці шкарпэткі? Разумееце, усё залежыць ад абутку. Напрыклад, у кірзачы нічога іншага ўсунуць нельга. У войску я спрабаваў насіць у кірзавыя боты шкарпэткі. Абсалютна не тое. Таму парцянкі — гэта спецыяльная рэч для кірзавых ботаў.

**Мікалай АПІЁК, мастак:**

— Для таго, каб заматаць парцянку, патрэбна 20-30 секундаў. Для кірзавых ботаў, што сшытыя на манер «кінь — павалюся», парцянка — самая надзейная рэч. Таму што, калі надзець шкарпэткі, то да абеду з іх пальцы павылазяць. Аднак сучасны абутак значна больш лёгкі і зручны, чым ранейшы, таму дзякуй Богу, што ўжо няма парцянак.

**Георгій КАЛДУН, спявак, у войску не служыў, але хацеў бы апынуцца на ваеннай кафедры:**

— На мой погляд, пытанні камфорту і зручнасці ў арміі павінны стаяць на першым месцы. Гэта самае галоўнае. Але пры гэтым мне здаецца, што салдатаў трэба вучыць, як правільна замотваць парцянкі. Сапраўдны салдат павінен гэта ўмець, бо бываюць умовы адсутнасці шкарпэтак.

**Алесь САВІЦКІ, пісьменнік, ветэран Вялікай Айчыннай вайны.**

— У 45-м годзе я прыехаў дадому не ў парцянках нават, а ў абмотках — паласа тканіны даўжынёй 1,5 метра. З іх штонікі для дзяцей нашы жанчыны пасля шылі. А парцянкі мы выкарыстоўвалі

## «МІС «БЕЛАРУСБАНК» ЖЫВЕ Ў БРЭСЦЕ

**Напрыканцы красавіка дзяўчаты-красуні — пераможцы абласных тураў конкурсу «Міс «Беларусбанк» сабраліся ў сталічным Палацы прафсаюзаў, каб вызначыць, хто з іх самая-самая. Самая дасціпная, самая разумная і самая абаяльная.**

Сярод традыцыйных конкурсаў — такіх, як «Дэфіле ў дзелавым касцюме», «Кулінарнае спаборніцтва» ці «Дэманстрацыя нацыянальнага касцюма», — арганізатары пайшлі на эксперымент. Асабліва горача гледачы віталі канкурсантак у конкурсе на лепшую дэманстрацыю народнага беларускага касцюма. Адна за адной, апранутыя ў сукенкі розных арнаментаў, дзяўчаты пад вясёлую песню выходзілі на сцэну з «дарамі»: з хлебам-соллю, снапом жыта, прасам, граблямі і нават з трусяняткамі і казлянятамі.

Прыемна парадаваў і творчы конкурс, дзе прыгажуні дэманстравалі як вакальныя, так і танцавальныя здольнасці. А вось у конкурсе візітовак удзельніцы павінны былі не толькі расказаць пра сябе, але і найбольш выйгрышна распавесці пра тыя філіялы «Беларусбанка», дзе яны працуюць. Геаграфія канкурсантак была вельмі багатай: Мядзел, Горкі, Светлагорск, Гродна, Брэст, Магілёў, Наваполацк — усяго 14 дзяўчат.

У выніку самай-самай журы прызнала Кацярыну Чаркашыну — спецыяліста брэсцкага філіяла ААТ «Беларусбанк», якая працуе ў банку толькі другі год. Хоць вопыту ў дзяўчыны і няшмат, але, як паказалі конкурсы, вучыцца прыгажуня ахвотна, ды і здольнасці ёсць.

Конкурс «Міс «Беларусбанк» пачалі праводзіць не так даўно, і сёлетні год — трэці па ліку.

— Конкурс арганізаваны на годным узроўні, — падзялілася сваімі ўражаннямі са «Звяздой» **Міс Беларусь-2010 Людміла Якімовіч,** якая ўваходзіла ў склад журы. — І мне вельмі даспадобы роля члена журы: гэта ўжо мой другі вопыт, мяне ўжо запрашалі ў журы конкурсу «Міс універсітэт» у Гродне. Ацэньваць старалася аб'ектыўна. Дзяўчаты годныя. На гэтым конкурсе я заўважыла, што дзяўчаты сапраўды прафесіяналкі, прычым не толькі на сцэне, але і ў банкаўскай сферы — вельмі цікавыя візітоўкі. Адразу бачна, што сваю працу яны па-сапраўднаму любяць.

**Мікола БРОВАР. Фота Сяргея ДРАЗДОВА.**

Інфарм-укол

# Анемія спрыяе ішэміі і заўчаснаму старэнню

**САМЫМ распаўсюджаным захворваннем крыві з'яўляецца анемія — з ёю сутыкаецца неверагодна вялікая колькасць людзей. Праўда, у адных выяўляецца сапраўды самастойнае захворванне, а ў другіх размова ідзе пра ўскладненне некаторых хвароб, у тым ліку інфекцыйных і анкалагічных. Анемія (з грэч. — бяскроўе) — гэта зніжаная колькасць гемаглабіну або гемаглабіну і эрытрацытаў у пэўным аб'ёме крыві. Большасць з нас і не задумваецца над тым, што за гэтымі нізкімі значэннямі хаваецца не проста млявасць і апатыя, але і рызыка развіцця ішэміі міякарда, і заўчаснае старэнне, паколькі анемія любога паходжання выклікае гіпаксію — кісларoднае галаданне тканак.**

— Вядома некалькі відаў анеміі, але самай распаўсюджанай з'яўляецца жалезадэфіцытная, — расказвае **ўрач лабараторнай дыягностыкі, загадчыца клініка-дыягнастычнай лабараторыі 18-й гарадской паліклінікі г. Мінска Таццяна СТРАЛЬЦОВА.** — Найбольш частай прычынай жалезадэфіцытнай анеміі з'яўляецца дэфіцыт жалеза, неабходнага для сінтэзу гемаглабіну, які, у сваю чаргу, неабходны для пераноскі належнай колькасці кісларoду да тканак арганізма. Кісларод, як вядома, дапамагае арганізму атрымаць энергію і трываласць, надае скуры здаровы колер. Калі мы трапляем у памяшканне, дзе няма свежага паветра, то праз нейкі час адчуваем толькі адно жаданне — як мага хутчэй пакінуць гэты пакой. Пры анеміі нашы клеткі не здольныя нармальна працаваць...

Гемаглабін — чырвоны, багаты на жалеза бялок эрытрацытаў — робіць магчымым дастаўку кісларoду ад лёгкіх да мозгу, іншых органаў і тканак. Нізкая колькасць гемаглабіну ўказвае на тое, што арганізм або сінтэзуе недастаткова колькасць здаровых эрытрацытаў, або надта шмат іх губляе, або вынішчае іх хутчэй, чым можа аднавіць. У выніку на пачатку захворвання могуць непакоіць невялікая стомленасць і бледнасць скураных покрываў. Лепш за ўсё бледнасць бачная на пазногцевых ложах, далонях, унутранай паверхні павек і губ. Пры фізічнай нагрузцы стомленасць надыходзіць хутчэй, чым звычайна. Можа назірацца і пераднепрытомнасныя станы, пахаладанне кісцяў і стоп. Паступова анемія можа стаць настолькі цяжкай, што сэрцабіццё стане надта частым і заўважным.

Якім жа чынам у арганізме ўтвараецца дэфіцыт жалеза? У першую чаргу гэта назіраецца пры недастатковым паступленні жалеза з ежай. Другая важная прычына — шэраг захворванняў, пры якіх парушаецца ўсмоктванне жалеза ў кішэчніку або якія суправаджаюцца павольнай хранічнай кровастратай (гастрыт, язва страўніка і дванаццаперснай кішкі, паліп тоўстага кішэчніка, рак тоўстага кішэчніка, грыжа страваводу і нават працяглае расстройства страўніка). Страце жалеза будуць спрыяць і моцныя менструацыі. Амаль заўсёды ўсе цяжарныя жанчыны, якія не прымаюць дабаўкі жалеза, перажываюць яго дэфіцыт. Парушаць баланс жалеза здольныя міёма маткі, рэўматоідны артрыт, злаякасныя новаўтварэнні, гепатыты, сепсіс, інфаркт міякарда і нават глісныя інвазіі.

Парушэнне ўсмоктвання жалеза ў тонкім кішэчніку можа быць абумоўлена, напрыклад, прыёмам некаторых лекаў. Да жалезадэфіцытнай анеміі здольны прывесці пастаянны прыём лекаў, якія блакіруюць прадукцыю салянай кіслаты страўніка, — гэта так званыя інгібітары пратоннай помпы. Саляная кіслата патрэбна для пераводу харчовага жалеза ў форму, даступную для хуткага ўсмоктвання.

— Для пастаноўкі дыягназу жалезадэфіцытнай анеміі звычайна прымяняецца даследаванне крыві, — кажа Таццяна Стральцова. — Агульны аналіз крыві выдае нам колькасць эрытрацытаў і гемаглабіну. Здараецца, што на фоне нізкага гемаглабіну колькасць эрытрацытаў можа быць нармальнай. Гэта абумоўлена тым, што пры любой анеміі абавязкова назіраецца кісларoднае галаданне тканак, што вымушае мозг больш актыўна выпрацоўваць эрытрацыты. Паколькі выпрацоўваюцца яны хутчэй, чым належыць, то з'яўляюцца няспелымі, а значыць, недастаткова выконваюць сваю функцыю. Калі агульны аналіз крыві ўказвае на нізкі ўзровень гемаглабіну, неабходна зрабіць яшчэ біяхімічны аналіз крыві на ўтрыманне жалеза ў сыроватцы крыві...

Без лячэння жалезадэфіцытны стан прыводзіць да хуткага і нерэгулярнага сэрцабіцця (арытміі), а ў хворых са звужаным прасветам артэрый, якія харчуюць сэрца (з паталогіяй каранарных артэрый), — і да стэнакардыі. У больш цяжкіх выпадках анемія здольная справакаваць інфаркт міякарда.

Жалезадэфіцытную анемію немагчыма вылечыць за кароткі тэрмін. Для аднаўлення запасаў жалеза можа спатрэбіцца некалькі месяцаў ці нават больш.

Асновай прафілактыкі анеміі, не звязанай са спадарожнай паталогіяй, з'яўляецца правільнае харчаванне. На жалеза багатыя мяса, рыба, хатняя птушка, яйкі, бабовыя, бульба і рыс. Утрымліваецца жалеза і ў гародніне, аднак з яе яно горш засвойваецца. Трэба мець на ўвазе, што гемаглабін — гэта бялковае ўтварэнне. А значыць, у першую чаргу для папаўнення запасаў жалеза нам патрэбны прадукты жывёльнага паходжання, у тым ліку малочныя — творог, цвёрды сыр.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

### Вітамін $B_{12}$ дэфіцытная анемія

**Урач лабараторнай дыягностыкі, загадчыца клініка-дыягнастычнай лабараторыі 18-й гарадской паліклінікі г. Мінска Таццяна СТРАЛЬЦОВА:**

— Мегалабласная (або вітамін $B_{12}$ дэфіцытная) анемія абумоўлена двума фактарамі: дэфіцытам вітаміну $B_{12}$, які ў недастатковай колькасці паступае ў арганізм з ежай, і недастатковай колькасцю спецыяльнага бялку, без якога B12 не ўсмоктваецца.

Вітамін бярэ ўдзел у сінтэзе ДНК і РНК, пры яго дэфіцыце парушаецца кроватварэнне (замест нормабластычнага яно становіцца мегалабластычным). Пры дэфіцыце $B_{12}$ у першую чаргу церпяць абалонкі нервовых клетак. Працягласць жыцця эрытрацытаў пры такога кшталту анеміі скарачаецца ў 2-3 разы. За кошт змяншэння колькасці эрытрацытаў у крыві развіваецца гіпаксія.

У цэлым вітамін $B_{12}$ дэфіцытная анемія праяўляецца парушэннямі з боку стравальнай, нервовай і кроватворнай сістэм. Спачатку можа назірацца зніжэнне апетыту, змяненне пачуцця смаку (можа адварочваць ад такіх прадуктаў, як мяса, хлеб і інш.), пачуццё смылення і болю ў языку (асабліва пры ўжыванні кіслых прадуктаў). Далей узнікае млоснасць, ванітаванне, адрыжка. Часам павялічваецца печань, селязёнка. Хворыя часцей поўныя, скура бледная. Паражэнне нервовай сістэмы праяўляецца аняменнем, пакаленнем, поўзаннем «мурашак», слабасцю ў нагах («ватныя ногі»). У цяжкіх выпадках могуць развівацца псіхічныя расстройствы.

Вітамін $B_{12}$ дэфіцытныя анеміі добра паддаюцца лячэнню. Вітамін утрымліваецца толькі ў прадуктах жывёльнага паходжання — мясе, печані, малацэ, яйках.

Май на ўвазе!

## ЦІ НЕ ПЕРАШКАДЖАЕЦЕ ВЫ СВАЙМУ ЎРАЧУ?

**Гарантыя паспяховай «бітвы» з хваробамі — цесны саюз урача і хворага. Але як на самай справе выконваюцца прадпісанні медыкаў?**

Маштабныя пошукі на гэтую тэму правялі італьянскія псіхолагі. Атрыманая імі статыстыка выклікала здзіўленне: больш чым у палове выпадкаў пацыенты, нават калі ім зусім дрэнна, не прымаюць усе або частку прапісаных лекаў, не прыходзяць на працэдуры і не выконваюць іншыя рэкамендацыі.

А вы — памочнік для свайго доктара ва ўласным вылячэнні або імкняцеся сабе ж уставіць палкі ў колы? Даведайцеся пра гэта, адказаўшы на пытанні тэста.

**Калі ў вас баліць галава, вы:**

А) спрабуеце высветліць і ўстараніць прычыну — 2 балы;

Б) прымаеце болесуцішальнае — 1 бал;

В) трываеце — 0 балаў.

**На прыёме ў доктара вы:**

А) расказваеце пра сімптомы, загадзя прадумаўшы свае скаргі — 2;

Б) часта забываеце паведаміць урачу важную інфармацыю — 1;

В) даяце парады і крытыкуеце прызначанае лячэнне — 0.

**Калі ўрач прызначае вам лячэнне, вы:**

А) старанна выконваеце ўсе рэкамендацыі — 2;

Б) чытаеце анатацыі, правяраючы правільнасць лячэння — 1;

В) часта грэбуеце прызначэннямі — 0.

**Калі лячэнне адразу не падзейнічала, вы:**

А) паведамляеце пра гэта лечачаму ўрачу — 2;

Б) мяняеце ўрача — 1;

В) кідаеце лячэнне — 0.

**Як вы ставіцеся да лекаў?**

А) доктар лепш за мяне ў гэтым разбіраецца — 2;

Б) аддаяце перавагу праверaным сродкам — 1;

В) лічыце, што лекі толькі атручваюць арганізм — 0.

**Чаго вы чакаеце ад урача?**

А) дыягназу і лячэння — 2;

Б) суперажывання і падтрымкі — 1;

В) бальнічнага ліста — 0.

**Калі доктар прычыняе вам фізічны боль, вы:**

А) трываеце (гэта неабходна для вылячэння) — 2;

Б) патрабуеце іншага лячэння або абязбольвання — 1;

В) адчуваеце нянавісць да свайго ката — 0 .

**Якому спосабу дыягностыкі вы давяраеце?**

А) досведу і інтуіцыі доктара — 2;

Б) сучаснай апаратуры — 1;

В) толькі сам хворы можа разабрацца ў сваім арганізме — 0.

**Сумуйце атрыманыя балы.**

**12—16 балаў.** Вы выдатны пацыент — пра такога марыць кожны медык. Сумесныя намаганнямі вы пераможаце любую хваробу.

**6—11 балаў.** Вы занадта спадзеяцеся на ўласнае меркаванне. Больш давярайце медыкам, не мяняйце ўрача падчас лячэння і строга выконвайце ўсе прызначэнні.

**0—5 балаў.** Вы рызыкуеце зарабіць хранічнае захворванне з-за самалячэння або поўнай адсутнасці лячэння.

**ДАРЭЧЫ**

Прыкладна ў 50% выпадкаў няўдач у лячэнні хворы проста не прымаў лекі або рабіў гэта няправільна, у 25% не выконваюцца іншыя рэкамендацыі (дыета, рэжым сну, гігіены, стрэсы і г.д.), 12% звязаны з генетычна і экалагічна абумоўленымі прычынамі (напрыклад, немагчымасць змяніць месца жыхарства пры астме).

Прычыны 8% няўдач у лячэнні звязаны з медслужбай (памылкі медперсаналу, адсутнасць санітарак і несвоечасовы прыезд «хуткай», якасць харчавання і ўмовы ўтрымання ў стацыянарах). А 5% адводзіцца на іншыя, больш рэдкія прычыны.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

17 мая 2011 г. в 16.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Чернавчицкий завод ЖБИ».

Повестка дня:

1. О совершении сделок Общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Брестский р-н, д. Чернавчицы, ул. Трудовая, 1Г.

Начало регистрации участников собрания: 16.00.

*УНП 200034706*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ

**по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности, и права заключения договоров аренды земельных участков для их обслуживания, которые составляют единые предметы аукциона**

**Организатор аукционов:** Фонд «Минскоблгосимущество», г. Минск, ул. Чкалова, 5, тел. (8017) 224 39 76, (8017) 228 60 13

**Место проведения аукционов:** г. Минск, ул. Чкалова, 5

**Сведения о предметах аукционов**

| Дата и время проведения повторного аукциона: | 6 июня 2011 г. в 11.00 *Начальная цена объектов понижена на 50 %* |
|---|---|

**Недвижимое имущество, многолетние насаждения** и право заключения договора аренды земельного участка. **Капитальное строение** (инв. № 614/С-21255) – одноэтажное здание парника общ. пл. 69,7 кв.м, 2003 г/п, стены остекленные с металлическим каркасом. **Капитальное строение** (инв. № 614/С-19146) – одноэтажное здание свинарника общ. пл. 685,5 кв.м, 1983 г/п, стены и перегородки кирпичные, перекрытие чердачное ж/б, деревянное. **Многолетние насаждения** в кол-ве 46 шт. Объекты расположены по адресу: Минская обл., Смолевичский район, д. Пекалин, на земельном участке площадью 0,7309 га. Срок аренды земельного участка – 99 лет. **Подробное извещение** о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23 апреля 2010 г. № 78.

| Начальная цена предмета аукциона: | **51 200 891** белорусский рубль (в т.ч. объект: 38 455 271, право заключения договора аренды земельного участка: 12 745 620). |
|---|---|
| Размер задатка: | **5 000 000** белорусских рублей. |

**Продавец:** Учреждение образования «Академия Министерства внутренних дел Республики Беларусь» (г. Минск, пр. Машерова, 6, тел.: (8017) 289 21 45, 289 21 19). **Арендодатель земельного участка:** Смолевичский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Смолевичи, ул. Советская, 125).

**Задаток** для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 2 июня 2011 г.** включительно. **Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами – **2 июня 2011 г. до 16.00.**

| Дата и время проведения повторного аукциона: | 6 июня 2011 г. в 12.00 *Начальная цена объекта понижена на 50 %* |
|---|---|

**Капитальное строение** (инв. № 630/С-42615) и право заключения договора аренды земельного участка. Шестиэтажное здание инженерного корпуса общ.пл. 4816,9 кв.м, 1987 г/п, стены панельные, кирпичные, перегородки кирпичные, гипсовые, перекрытия междуэтажные ж/б. Объект расположен по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Янки Купалы, д. 130, на земельном участке площадью 0,4756 га. Срок аренды земельного участка – 30 лет. **Условия использования земельного участка:** победителю аукциона разрешено в установленном порядке использовать земельный участок для размещения объектов производственного назначения. Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» за 29 апреля 2010 г. № 82. (Расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка – 1 014 323 белорусских рубля).

| Начальная цена предмета аукциона: | **828 390 371** белорусский рубль (в т.ч. объект: 732 222 604, право заключения договора аренды земельного участка: 96 167 767). |
|---|---|
| Размер задатка: | **80 000 000** белорусских рублей. |

**Продавец:** Производственное республиканское унитарное предприятие «Молодечненский завод порошковой металлургии» (Минская обл., г. Молодечно, ул. Я. Купалы, 130, тел.: (80176) 739010, 732400, 732447). **Арендодатель земельного участка:** Молодечненский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Молодечно, ул. Виленская, 6).

**Задаток** для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 2 июня 2011 г.** включительно. **Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами – **2 июня 2011 г. до 16.00.**

| Дата и время проведения повторного аукциона: | 7 июня 2011 г. в 11.00 *Начальная цена объектов понижена на 50 %* |
|---|---|

**Недвижимое имущество** и право заключения договора аренды земельного участка. **Капитальное строение** (инв. № 610/С-44638) – одноэтажное кирпичное здание столовой с пристройкой, общ.пл. 1194,7 кв.м, 1959 г/п. **Капитальное строение** (инв. № 610/С-44640) – одноэтажное здание овощехранилища, общ.пл. 171,2 кв.м, 1967 г/п, стены – блоки, облицованные кирпичом. **Капитальное строение** (инв. № 610/С-44642) – одноэтажное кирпичное здание КПП с пристройкой, общ.пл. 46,1 кв.м, 1962 г/п. **Капитальное строение** (инв. № 610/С-44644) – одноэтажное здание штаба № 15/111, общ. пл. 229,7 кв.м, 1963 г/п, стены к/засыпные. Составные части и принадлежности: кирпичная уборная (9 кв.м), бетонное крыльцо. **Капитальное строение** (инв. № 610/С-46552) – одноэтажное кирпичное здание штаба 15/91 с двумя пристройками, общ. пл. 579,3 кв.м, 1955 г/п. **Капитальное строение** (инв. № 610/С-47079) – покрытие, 1992 года ввода в эксплуатацию, площадь асфальтового покрытия 3490 кв.м, площадь бетонного покрытия 43 кв.м. **Капитальное строение** (инв. № 610/С-47221) – наружные электрические сети общей протяженностью 1643,6 м. **Капитальное строение** (инв. № 610/С-46965) – инженерные сети теплоснабжения и водоснабжения, протяженностью 104 м и 156,5 м соответственно. **Капитальное строение** (инв. № 610/С-46969) – инженерные сети теплоснабжения: тепловая сеть системы отопления, тепловая сеть водопровода, тепловая сеть конденсатопроводов, тепловая сеть горячего водоснабжения протяженностью 140,8 м каждая. Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Ватутина, военный городок № 15, на земельном участке площадью 4,5508 га. Срок аренды земельного участка – 10 лет. Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» за 25 ноября 2009 г. № 223, за 20 марта 2010 г. № 51.

| Начальная цена предмета аукциона: | **662 108 762** белорусских рубля (в т.ч. объекты: 409 218 912, право заключения договора аренды земельного участка: 252 889 850). |
|---|---|
| Размер задатка: | **60 000 000** белорусских рублей. |

**Продавец:** Государственное учреждение «Борисовское эксплуатационное управление Вооруженных Сил» (Минская область, г. Борисов, ул. Л.Чаловской, 26, тел. (80177) 733349,757659). **Арендодатель земельного участка:** Борисовский районный исполнительный комитет (Минская область, г. Борисов, ул. Чапаева, 6).

**Задаток** для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 3 июня 2011 г.** включительно. **Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами – **3 июня 2011 г. до 16.00.**

| Дата и время проведения повторного аукциона: | 7 июня 2011 г. в 12.00 *Начальная цена объекта понижена на 50 %* |
|---|---|

**Капитальное строение** (инв. № 622/С-29207) и право заключения договора аренды земельного участка. Трехэтажное здание раскройно-заготовительного цеха, общ. пл. 3667,4 кв.м, 1992 г/п, стены – кирпич, силикатные блоки, перекрытия – ж/б плиты. Объект расположен по адресу: Минская обл., Столбцовский район, д. Новый Свержень, ул. Железнодорожная, 8, на земельном участке площадью 0,6600 га. Срок аренды земельного участка – 20 лет. **Условия использования земельного участка**: для обслуживания капитального строения. Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» за 18 мая 2010 г. № 94. (Расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка – 1 268 083 белорусских рубля).

| Начальная цена предмета аукциона: | **666 886 017** белорусских рублей (в т.ч. объект: 660 676 857, право заключения договора аренды земельного участка: 6 209 160). |
|---|---|
| Размер задатка: | **60 000 000** белорусских рублей. |

**Продавец:** Республиканское унитарное производственное предприятие «Новосверженский лесозавод» (Минская обл., Столбцовский район, д. Новый Свержень, тел. (8 01717) 46043, 46400). **Арендодатель земельного участка:** Столбцовский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Столбцы, ул. Ленинская, 45).

**Задаток** для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 3 июня 2011 г.** включительно. **Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами – **3 июня 2011 г. до 16.00.**

| Дата и время проведения аукциона: | 8 июня 2011 г. в 11.00 |
|---|---|

**Капитальное строение** (инв. № 600/С-95491) и право заключения договора аренды земельного участка. Одноэтажное здание склада для хранения грубых кормов общей площадью 2115,2 кв.м, 1998 года постройки, фундамент сборные железобетонные блоки, стены панели из керамзитобетона, перекрытие чердачное железобетонные плиты, крыша рулонная. Объект расположен по адресу: Минская обл., Минский район, южнее дер. Подгорье, на земельном участке площадью 0,5400 га, назначение: земельный участок для обслуживания здания склада для хранения грубых кормов. Срок аренды земельного участка – 30 лет. **Условия использования недвижимого имущества и земельного участка:** победителю аукциона разрешено в установленном порядке изменение назначения недвижимого имущества и использование земельного участка для размещения объектов промышленного и общественного назначения.

| Начальная цена предмета аукциона: | **317 636 322** белорусских рубля (в т.ч. объект: 265 515 212, право заключения договора аренды земельного участка: 52 121 110). |
|---|---|
| Размер задатка: | **30 000 000** белорусских рублей. |

**Продавец:** Учреждение «Республиканский центр олимпийской подготовки конного спорта и коневодства» (Минская обл., Минский район, пос. Ратомка, ул. Корицкого, 136, тел.: (8017) 502 20 50, 502 20 63, 502 20 65). **Арендодатель земельного участка:** Минский районный исполнительный комитет (г. Минск, ул. Ольшевского, 8).

**Задаток** для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 6 июня 2011 г.** включительно. **Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами – **6 июня 2011 г. до 16.00.**

| Дата и время проведения аукциона: | 8 июня 2011 г. в 12.00 |
|---|---|

**Капитальное строение** (инв. № 642/С-21104) и право заключения договора аренды земельного участка. Одноэтажное здание столовой общей площадью 305,8 кв.м, 1976 года постройки, фундамент сборные блоки, стены и перегородки кирпичные, перекрытие чердачное железобетонные плиты, крыша совмещенная, подведены инженерные коммуникации. Принадлежности: бетонная дорожка (26 кв.м), деревянный решетчатый на б/ст. забор. Объект расположен по адресу: Минская обл., Копыльский район, г. Копыль, ул. 50 лет БССР, 13, на земельном участке площадью 0,1469 га, назначение – земельный участок для размещения объектов общественного питания (содержания и обслуживания здания столовой). Срок аренды земельного участка – 50 лет. **Условия использования земельного участка:** победителю аукциона использовать земельный участок без изменения целевого назначения. На часть капитального строения площадью 48,65 кв.м имеется обременение в виде договора аренды сроком по 5 января 2012 г.

| Начальная цена предмета аукциона: | **240 718 963** белорусский рубля (в т.ч. объект: 227 750 803, право заключения договора аренды земельного участка: 12 968 160). |
|---|---|
| Размер задатка: | **24 000 000** белорусских рублей. |

**Продавец:** Министерство промышленности Республики Беларусь в безвозмездном пользовании открытого акционерного общества «Солигорскводстрой» (Минская обл., г. Солигорск, ул. Строителей, 30, тел.: (80174) 22 34 69, 22 05 10). **Арендодатель земельного участка:** Копыльский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Копыль, ул. Ленина, 6).

**Задаток** для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 6 июня 2011 г.** включительно. **Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами – **6 июня 2011 г. до 16.00.**

**Расчетный счет для внесения задатка для участия в аукционах: № 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, ул. Мясникова, 32, код 795, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество». Назначение платежа: задаток для участия в аукционе (без НДС).**

**Заявления на участие в аукционе** с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.30 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 310, 312, тел. (8017) 224 39 76, (8017) 228 60 13.**

Фотографии продаваемых объектов, а также информация об объявленных аукционах и предметах торгов дополнительно размещаются на сайте Минского облисполкома: **www.minsk-region.gov.by** на странице фонда «Минскоблгосимущество».

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Для участия в аукционе граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительства за границей, и лица без гражданства), подают организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, к которому прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

К участию в аукционе допускаются также консолидированные участники (два и более субъекта малого предпринимательства – индивидуальные предприниматели и (или) микроорганизации, заключившие договор о совместном участии в аукционе), которые к соответствующему заявлению прилагают: оригинал и копию договора о совместном участии в аукционе; заверенную банком копию платежного поручения о перечислении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе; сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью. При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Фонд «Минскоблгосимущество» вправе отказаться от проведения аукциона (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала проведения аукциона по каждому объекту, выставляемому на аукцион.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: 1. Подписать протокол о результатах аукциона; 2. В течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка победитель аукциона (претендент на покупку) обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения соответствующими исполнительными комитетами), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка; 3. После совершения победителем аукциона действий, названных в пункте 2, но не позднее 2 рабочих дней, заключить в установленном порядке с Продавцом объектов договор купли-продажи недвижимого имущества, а с Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка; 4. После заключения с райисполкомом договора аренды земельного участка в 2-месячный срок со дня даты принятия решения о передаче победителю земельного участка осуществить государственную регистрацию права на земельный участок. 5. Получить в установленном порядке разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в сроки, установленные решениями местных райисполкомов, и осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

## Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 16 (395)

### Не прастак — пастарнак

Пастарнак патрабуе нейтральных, багатых на перагной, добра ўгноеных, апрацаваных рыхлых глебаў. Лепшыя папярэднікі для пастарнака — гэта капуста, агуркі, бульба або таматы, і каб пад іх былі ўнесены вялікія дозы арганічных угнаенняў. На шчыльных, бедных, кіслых глебах з блізкім заляганнем грунтовых водаў ці пасля ўнясення свежага гною караняплоды атрымліваюцца «барадатымі» і дробнымі.

Агратэхніка падобна на агратэхніку моркву. Сеяць можна вельмі рана, як толькі растане зямля (у канцы красавіка ці пачатку мая), або пад зіму. На глыбіню 1,5—2 см, змяшчаючы ў гняздо па 3—4 семачкі, калі яны пасля 2—3 гадоў захоўвання. Пасля пасеву паверхню градкі ўтрамбоўваюць. Пасля ўсходаў у гняздзе пакідаюць па адной расліне. Насенне на 3—4 сутак замочваюць у адкрытым посудзе: суткі ў растворы марганцоўкі, двое-трое — у растворы ўгнаенняў з мікраэлементамі. Перад сяўбой насенне прамываюць і злёгку падсушваюць.

Догляд заключаецца ў рэгулярных палівах, пазакаранёвых падкормках угнаенні з мікраэлементамі 1—2 разы ў месяц, пасля падкормак паліваюць. Асабліву ўвагу ўдзяляюць пасевам першыя 20—25 дзён, калі з'яўляюцца ўсходы. Расліны холадаўстойлівыя і вытрымліваюць замаразкі да мінус 8 градусаў. Каб атрымаць буйны караняплод, рыхліце глебу на глыбіню 15—20 см.

### Падымаем дрэва

У маі неабходна праверыць, ці не зацягнула маладыя дрэўцы і ягадныя кусты ў глебу разам з аселай зямлёй.

Амаль ва ўсіх садовых культур каранёвая шыйка (месца, адкуль пачынаюць расці карані) не павінна размяшчацца ніжэй за агульны ўзровень зямлі на ўчастку.

Прыўзнімаць заглыбленую расліну лепш за ўсё ўтрох. Спачатку трэба адкапаць траншэю вакол каранёў, затым падкапаць знізу, падвёўшы дзве рыдлёўкі з супрацьлеглых бакоў, потым падняць камяк на патрэбную вышыню. Трэці ўдзельнік аперацыі падсыпае пад яго глебу. Пасля гэтага добра паліце зямлю па перыметры пасадачнага месца і замульчыруйце.

Падымаць дрэвы трэба, пакуль яны маладыя, не спадзеючыся, што «і так добра». А потым узнікаюць сумненні: што здарылася, дрэўца быццам бы прыжылося, але вось занядужала і... Заглыбленыя дрэвы з засыпанай карой «паміраюць стоячы».

### ЯК ВЫЗНАЧЫЦЬ ВАГУ БЕЗ ВАГІ

**АДНО ВЯДРО НА 10 Л ЗМЯШЧАЕ (кг):**

- гною свежага — 8
- птушынага памёту — 5
- перагною — 8
- сухога торфу — 5
- зямлі:
- дзярновай — 12
- старой парніковай ці кампоснай — 10
- драўнінnага попелу — 5

**АДНА ГРАНЁНАЯ ШКЛЯНКА (г):**

- аміячнай салетры, сернакіслага амонію — 160—180
- суперфасфату — 185—215
- фасфарытнай мукі — 310—360
- хлорыстага калію — 185—190
- сернакіслага калію — 260
- драўнінnага попелу — 90—120
- пладова-ягаднай, агароднінnай сумесі — 180—200

**АДЗІН ЗАПАЛКАВЫ КАРАБОК ЗМЯШЧАЕ (г):**

- аміячнай салетры, сульфату амонію — 17
- мачавіны — 15
- салетры:
- кальцыевай — 18
- натрыевай — 22
- калійнай — 25
- суперфасфату:
- парашкападобнага — 24
- грануляванага — 22
- фасфатнай мукі — 34
- калію:
- хлорыстага — 18
- сернакіслага — 25
- калійнай солі, калімагнезіі

Школьны трэнер Аляксандр Сцепчанка і ягоныя алімпійскія надзеі.

Жыхар Забялышына Мікалай Баеў дапамагае сыну садзіць бульбу.

Рабочы Цэнтра культуры Аляксандр Нахаеў уладкоўвае «бярозавую» шпакоўню ў вясковым парку.

# ПРЫПЫНАК У ЗАБЯЛЫШЫНЕ

**Кропка на планеце**

**ПАЎН. ШЫР. 32°38´**
**УСХ. ДАЎЖ. 53°50´**

Апрацоўкі даўнейшых і сучасных песень, якія робяць Ігар Абушкевіч і Васіль Трубнікаў, надзвычай добра ўспрымаюцца слухачамі-аднавяскоўцамі. А ансамбль «Спадчына», у якім яны ўдзельнічаюць, атрымаў ганаровае званне народнага.

Ключы ад амбараў — праца колішніх майстроў-кавалёў.

Арэлі на школьным двары -- любімае месца вясковай дзятвы.

Значная частка гісторыі Хоцімскага раёна прыпадае на колішні валасны цэнтр, а цяпер аграгарадок Забялышын. Першы літаратар краю нарадзіўся менавіта тут. Гэта Якаў Брайцаў — аўтар невыдадзенага рамана «Сярод балот і лясоў». Да гонару забялышынцаў вёска дала радзіме ажно чатырох прафесараў. Поўнага кавалера ордэна Славы Іосіфа Ляскоўскага таксама лічаць сваім, хоць герой нарадзіўся ў суседнім Прудку, а памёр наогул ва Украіне. Калісьці ў вёсцы была карэтная майстэрня, вялікая царква, жылі багатыя людзі. Мясцовы краязнавец, настаўнік гісторыі Мікалай Каткоў, стварыў музей і заўсёды падкрэслівае гэтыя красамоўныя факты з жыцця вёскі, якая ўдала ляжыць якраз на шляху ў Расію праз самы што ні ёсць усход Беларусі. Тыя, хто мінаюць населены пункт, не могуць не заўважыць і дату заснавання ці першага ўзгадвання на вялікім валуне — 1715 год. Як не могуць не адзначыць, што Забялышын выглядае па-сучаснаму дагледжаным, прывабным, зялёным.

У школе, якой сёлета спаўняецца ажно 140 гадоў, вучыцца 118 дзяцей. Школа сёння — сапраўдная кузня пераможцаў рэспубліканскіх спаборніцтваў, асабліва па лыжах. Вучаніца Марыя Бараноўская стала васьмікразовай чэмпіёнкай краіны сярод дзяцей і моладзі.

Ёсць у вёсцы дзіцячы сад, школа мастацтваў. Хапае працы старэйшаму насельніцтву, бо існуе філіял «Бабулінай крынкі» — «Бабулін падворак», працуюць спіртзавод, вінзавод, лясніцтва, вясковая амбулаторыя і прытулак для адзінокіх і састарэлых. Перад майскімі святамі вяскоўцы спяшаюцца ўправіцца з агародамі і бульбянымі соткамі. Але тут як Бог дасць: халодныя дзянькі перашкаджаюць як след разгарнуцца прысядзібнай сяўбе.

З вокнаў і дзвярэй СДК, якім шмат гадоў кіруе Ігар Абушкевіч, чутны гукі музыкі, галасы спевакоў: народны ансамбль «Спадчына» ладзіць апошнія рэпетыцыі перад святам Перамогі. Кожны раз гэты мастацкі калектыў радуе вяскоўцаў самымі рознымі музычнымі творамі і заўсёды спявае для іх сваю песню, створаную мясцовай настаўніцай Марыяй Прэзідэнтавай:

*Мы праслывім Забялышын*
*Верша нашага радком.*
*Вёска наша прыгажэ,*
*Стала аграгарадком...*

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**

# «Прынцып мінімалізму — не для Беларусі!»

## XX Міжнародны фестываль моды і фота «Млын моды» сабраў прадстаўнікоў вядучых мастацкіх школ Еўропы

**Прадстаўнікі дзесяці вядучых еўрапейскіх школ дызайну, акадэмій мастацтваў і школ моды з Масквы, Берліна, Вільнюса, Мілана, Барселоны, Рыгі, Капенгагена сталі гасцямі і міжнароднымі экспертамі юбілейнага Міжнароднага фестывалю моды і фота «Млын моды-2011».**

Фестываль будзе дзейнічаць тры дні і адначасова стане паўфіналам Міжнароднага конкурсу маладых дызайнераў адзення «Рускі сілуэт». На працягу двух дзён дызайнеры-пачаткоўцы — студэнты беларускіх ВНУ і прафесійных каледжаў — будуць дэманстраваць аўтарскія калекцыі, якія спецыяльна для фестывалю былі адабраны вядомым дызайнерам, аўтарам праекта «Млын моды» Сашам Варламавым. Гледачы і госці ўбачаць каля 170 калекцый, з якіх міжнароднае журы вызначыць 25 лепшых. Іх аўтары будуць запрошаны на вучэбныя стажыроўкі за мяжу.

Трэці дзень фестывалю прадэманструе прысутным калекцыі замежных гасцей, большасць з якіх — таксама вучнёўскія праекты. Завершыцца «Млын моды» паказамі маладых беларускіх дызайнераў, якія калісьці таксама пачыналі з «Млына» і ўжо паспелі зарэкамендаваць сябе ў свеце моды. Закрые фестываль праект Вольгі і Андрэя Смалякоў «Ажыўшыя карціны».

### Замежнікі: «Нашы калекцыі пра ежу, кухню і архітэктуру...»

Італьянскія дызайнеры **Мікеле Гуацонэ і Франчэска Вінья** выкладаюць **у Еўрапейскім інстытуце дызайну ў Мілане (Італія).** Выкладчыцкую працу актыўна спалучаюць з рознага кшталту моднымі праектамі, якія ладзяцца ў вучэльні.

— Мы прывезлі з сабою шэсць мадэляў дызайнера Барбары Г., — расказалі «Звяздзе» Мікеле і Франчэска. — Натхненнем для стварэння калекцыі стаў раман французскага пісьменніка Барберы, які расказвае там пра кухню і ежу. Назва калекцыі «11-12 Рудакаранелі» — гэта вуліца ў Францыі. Гэта калекцыя якраз і ілюструе густ Італіі. Там яскрава прасочваецца колер мяса, цукру — калекцыяй мы вельмі задаволеныя.

Варта адзначыць, што дызайнеры з Мілана, адной са сталіц сусветнай, упершыню за гісторыю існавання «Млына моды» наведваюць гэты фестываль.

— Пра Беларусь раней мы чулі няшмат, але, нягледзячы на гэта, чакаем убачыць тут штосьці натхняльнае, бо апошнія гады вельмі шмат натхнення дызайнеры бяруць якраз з вашага боку — усходняе замежжа, — прызнаюцца дызайнеры. — Мы чакаем убачыць тут штосьці абсалютна новае, не падобнае на Італію, бо гістарычная аснова — ход гісторыі — тут абсалютна розны, таму і культурны складнік адрозніваецца ад італьянскага і мае свае асаблівасці. Якраз іх мы і хочам убачыць.

А вось **студэнткі пятага курса Уэльскага ўніверсітэта па спецыяльнасці «Дызайн адзення» Клэр Эндру, Бэк Какрэйн і Ферн Сміт** прывезлі ў беларускую сталіцу свае выпускныя працы: у сваіх калекцыях маладыя дызайнеры ўвасобілі тэму супраціўлення (Бэк), тэму прыроды (Клэр) і тэму формы (Ферн). Увогуле дзяўчаты ў захапленні ад фестывалю «Млын моды».

А вось прадстаўнікі **дацкай школы дызайну з горада Капенгаген** прывезлі ў Мінск калекцыі сваіх першакурснікаў.

— Гэта вельмі скандынаўскія калекцыі, — гаворыць рэктар школы Гітэ Хрыстаферсан. — Іх арыгінальная рыса ў тым, што яны не столькі надзяляюць увагу фігуры чалавека, колькі структуры адзення. Калекцыя архетэктанічная — валадарства ліній і граняў. Пры падрыхтоўцы дызайнераў мы робім стаўку на канцэптуальнае мысленне. Перш-наперш вучым студэнтаў думаць ідэйна. Гэтая якасць нашмат важнейшая за ўменне шыць, і гэта, відаць, адна з асноўных рыс дацкай школы.

— Мы прыехалі ў Мінск, каб паказаць сябе і паглядзець на іншую творчасць — творчасць нашых равеснікаў з Беларусі, — расказвае студэнтка школы дызайну з Капенгагена Ірына Бенетытэ. — Спадзяёмся ўбачыць тут новыя ідэі і новыя думкі.

— Убачыць, як працуюць з колерам і фактурай тут, — дадае яе калега Нэда Таніят. — Цікава тое, што на фестывалі мы паглядзім, як шыюць маладыя калегі з Беларусі, і мы спадзяёмся атрымаць задавальненне.

Паводле слоў рэктара школы моды з Капенгагена Гітэ Хрыстаферсан, у скандынаўскіх краінах у праектаванні адзення і ў дызайне ўладарыць прынцып мінімалізму, таму часам стракатыя калекцыі беларусаў — як мінімум незвычайна.

— Гартаючы каталог, я пабачыла шмат каляровых рашэнняў, нязвыклых для скандынаўскага вока. Наша задача — заўважыць найбольш цікавыя з іх, каб паспрабаваць прыўнесці гэтыя матывы ў Данію. Мы спадзяёмся пабачыць тут цікавыя працы — у такім выпадку будзем весці перамовы з нашым кіраўніцтвам, каб запрасіць беларускіх дызайнераў да нас і такім чынам скааперавацца, каб папрацаваць разам.

**Ілья ЛАПАТО. Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

Сучасная мода вачыма беларускіх студэнтаў.


**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 8 июня 2011 г. ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН № 06-А-11 НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МИНСКЕ**

Минский городской центр недвижимости

**Вид аукциона:** открытый (на повышение цены продажи).
**Предмет аукциона:** право заключения договора аренды земельного участка.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право аренды на 5 лет 4 земельных участков для строительства объектов недвижимости в г. Минске:

| № п/п | Место расположения земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Функциональное назначение предполагаемого объекта строительства | Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона (бел. руб.) | Условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | ул. Радиальная | 500000000002007532 | 0,1500 | Станция технического обслуживания | 40 796 022 | 4 000 000 | 5 822 967 | Возмещение потерь сельхозпроизводства в размере 879 232 бел. руб. |
| 2. | ул. Радиальная | 500000000002007531 | 0,1000 | Мойка автомобилей | 27 135 078 | 2 000 000 | 5 045 897 | Возмещение потерь сельхозпроизводства в размере 586 155 бел. руб. |
| 3. | ул. Южная, в районе жилого дома № 24 | 500000000001005365 | 0,1091 | Объект общественного питания (мини-кафе) | 75 655 287 | 7 000 000 | 4 531 926 | – |
| 4. | Микрорайон Каменная Горка-2 | 500000000006005862 | 0,3695 | Блок бытового обслуживания на 23 рабочих места с кафе на 50 посадочных мест и общественным туалетом на 10 приборов по генплану № 20 | 277 066 588 | 27 000 000 | 5 622 178 | Возмещение затрат УКСу Мингорисполкома в размере 27 505 071 бел. руб. |

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **8 июня 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток (не позднее 2 июня 2011 г.)** в размере, указанном в графе 7 (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

**представить в УП «Минский городской центр недвижимости» – организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере (без НДС);

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, которому по результатам аукциона в установленном порядке предоставляется земельный участок, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.

Дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6 с 12 мая 2011 г. по 2 июня 2011 г. по рабочим дням в рабочее время.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются как единственным, подавшим заявление на участие в аукционе) в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков обязаны:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);
- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком заключает с победителем аукциона (в установленных законодательством случаях – с его участником) договор аренды земельного участка сроком на 5 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком может предоставить победителю аукциона рассрочку по внесению платы за предмет аукциона в установленном порядке.

После истечения срока аренды земельного участка (5 лет), предоставленного по результатам аукциона, лицо, которому он предоставлен, в установленном порядке обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого по решению исполкома ему предоставляется земельный участок на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории).

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон: + 375 (17) 226 16 72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by.**



Минский городской центр недвижимости

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 23 мая 2011 г. проводит открытый аукцион № 02-Сф-11 по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь**

**Вид аукциона:** открытый (на повышение цены продажи).
**Предмет аукциона:** право частной собственности на земельный участок.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляются 4 земельных участка, расположенных в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, № 3 для строительства и обслуживания одноквартирных (блокированных) жилых домов:

| № п/п | № участка по генплану | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 1 | 22 | 500000000008005076 | 0,0736 | 162 204 832 | 16 000 000 | 1 864 388 |
| 2 | 27 | 500000000008005372 | 0,0700 | 154 270 900 | 15 000 000 | 1 864 388 |
| 3 | 32 | 500000000008005371 | 0,0638 | 140 606 906 | 14 000 000 | 1 864 388 |
| 4 | 45 | 500000000008005373 | 0,0700 | 154 270 900 | 15 000 000 | 1 864 388 |

Сведения о наличии инженерных коммуникаций и сооружений на указанных земельных участках содержатся в составе землеустроительной документации. Земельные участки расположены в водоохранной зоне водных объектов г. Минска, имеют пониженный рельеф местности, высокий уровень залегания грунтовых вод, представлены торфяными почвами.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.

Инженерно-геологические условия территории ограниченно благоприятные для строительства на естественном основании. Осложняющими факторами являются условия поверхностного стока, во влажные периоды года возможно застаивание атмосферных и талых вод в понижениях микрорельефа.

**Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона:**

внесение победителем аукциона платы за земельные участки;

возмещение им расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона и формированием этих земельных участков, в том числе с государственной регистрацией создания земельных участков;

осуществление в двухмесячный срок после принятия Минским горисполкомом решения о предоставлении победителю аукциона земельных участков государственной регистрации прав на них в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;

получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

занятие (освоение) земельных участков осуществить не позднее одного года после получения свидетельства о государственной регистрации прав на них.

**Аукцион состоится 23 мая 2011 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов**.

Для участия в аукционе необходимо:

**внести задаток (не позднее 17 мая 2011 г.)** в размере, указанном в графе 6 (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04901, получатель – финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

представить в УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы;

заверенную банком копию платежного документа о внесении задатка в установленном размере;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, которому по результатам аукциона в установленном порядке предоставляется земельный участок, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

**дополнительно представляются:**

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане и представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6 с 10 по 17 мая 2011 г. по рабочим дням в рабочее время.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются как единственным, подавшим заявление на участие в аукционе) в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков обязаны:

внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;

возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком выдает выписку из решения о предоставлении земельного участка в частную собственность.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком может предоставить победителю аукциона рассрочку внесения платы за земельный участок, предоставляемый в частную собственность, в установленном порядке.

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон: + 375 (17) 226 16 72,** официальный сайт организатора торгов **www.mgcn.by.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЖЫЦЦЁ — ГЭТА ПАДАРУНАК БОГА

## Рэлігійна-этычная экспертыза праекта Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогіях і гарантыях правоў грамадзян пры іх ужыванні»

Трэба сказаць, што наша краіна ўжо даўно мае патрэбу ў заканадаўчай норме такога роду. У Беларусі метады дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій (далей ДРТ) ужываюцца ўжо 16 гадоў, але да гэтага дня ў нас няма закона, які б рэгуляваў гэтую сферу медыцынскай дзейнасці. І ў гэтым мы значна адстаём ад многіх краін і нават нашых бліжэйшых суседзяў. У Літве падобны закон быў прыняты ў 2000 годзе, у Эстоніі — у 1997, у Арменіі — у 2002, у Казахстане — у 2004, а ў ФРГ яшчэ 20 гадоў таму — у 1990 годзе.

Да таго ж, практыка ўжывання метадаў ДРТ у Беларусі мае шматгадовую гісторыю і працягвае актыўна развівацца.

На сёння ў Беларусі ДРТ ужываюць у чатырох спецыялізаваных медыцынскіх цэнтрах.

Пры садзейнічанні Цэнтра дапаможнай рэпрадукцыі «Эмбрыа» сёлета быў адкрыты кабінет ЭКА ў клініцы Віцебскага медуніверсітэта. Віцебскія медыкі праводзяць дыягностыку і працэдуры падрыхтоўчага этапу праграмы ЭКА.

У хуткім часе чакаецца адкрыцьцё цэнтра дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій у Гродне на базе Гродзенскага абласнога перынатальнага цэнтра.

Вострая неабходнасць прыняцця закона, які рэгулюе ўжыванне метадаў ДРТ, абумоўлена таксама шэрагам сур'ёзных прававых, медыцынскіх і этычных праблем, якія ўзнікаюць у сувязі з ужываннем ДРТ.

Першай спробай падвесці прававую базу пад такога роду дзейнасцю сталі папраўкі ў Кодэкс аб шлюбе і сям'і, прынятыя беларускімі дэпутатамі ў 2006 годзе. Тады ўпершыню ў беларускім заканадаўстве з'явіліся такія паняцці, як «сурагатная маці», «донар» генетычнага матэрыялу. Першыя афіцыйныя дагаворы аб сурагатным мацярынстве ў Беларусі былі заключаны ў 2007 годзе.

Нягледзячы на тое, што падрыхтоўка Закона «Аб дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогіях і гарантыях правоў грамадзян пры іх ужыванні» знаходзіцца зараз практычна на завяршальнай стадыі, тэма ўжывання ДРТ у Беларусі так і не стала прадметам сур'ёзнага і ўсебаковага грамадскага абмеркавання. У СМІ можна было сустрэць толькі агульную інфармацыю аб падрыхтоўцы законапраекта і аб некаторых яго асаблівасцях. Не была ініцыявана грамадска-этычная дыскусія па палажэннях закона, які рыхтуецца. Афіцыйных кансультацый з вядучымі хрысціянскімі канфесіямі Рэспублікі Беларусь таксама не праводзілася.

Якія ж палажэнні праекта закона і якую этычную адзнаку з пункту погляду Праваслаўнай Царквы ім можна даць?

У першым артыкуле закона звяртаюць на сябе ўвагу два моманты. Па-першае, у законапраекце адсутнічае азначэнне «генетычнага бацькі» наравне з азначэннем «генетычнай маці». У пэўных спрэчных сітуацыях гэта можа прывесці да дыскрымінацыі мужчыны, які прадаставіў свае паловыя клеткі для стварэння эмбрыёна метадам ЭКА.

Па-другое, у азначэнні «эмбрыёна» за ім прызнаецца статус «жывога арганізма»(!). Гэтая акалічнасць мае далёка ідучыя этычныя вынікі, у супярэчанне з якой, як не цяжка пераканацца, уступаюць наступныя палажэнні дакумента.

У артыкуле 3 законапраекта сярод прынцыпаў (законнасць; павага да правоў, свабод і інтарэсаў; даступнасць; добраахвотнасць, канфедэнцыяльнасць; прафесіяналізм), на падставе якіх ужываюцца метады ДРТ, няма прынцыпу «этычнасці»! Магчыма, гэта не выпадкова? Бо ў законапраекце ёсць цэлы шэраг вельмі спрэчных з этычнага пункту погляду палажэнняў. Таму, мабыць, заканадаўцы і не сталі абмяжоўваць сябе этыкай. Але, тым не менш, пры рашэнні такіх важных пытанняў, як зараджэнне чалавечага жыцця і яго развіццё, жыццёва неабходна грунтавацца і на прынцыпе этычнасці ў тым ліку. Прытым, несумнеўна, этычнасць, як кіруючы прынцып, усё ж прысутнічае і ў вышэйназваным дакументе. У адваротным выпадку цяжка было б патлумачыць некаторыя абмежаванні (з утылітарнага пункту погляду зусім не абавязковыя), якія накладаюцца законапраектам.

З рэлігійнага і этычнага пункту погляду, важна, што ў 7 артыкуле закона, які рыхтуецца, дакладна азначана, што «ўжыванне дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій дазваляецца ў дачыненні асобаў, якія маюць медыцынскія паказанні». Тым самым адсякаецца магчымасць, напрыклад, скарыстацца паслугамі сурагатнай маці жанчыне, якая проста не жадае нараджаць і якая мае матэрыяльную магчымасць пазбегнуць гэтага, заплаціўшы «маці па найме». Збольшага гэтая норма таксама не дае магчымасці скарыстацца метадамі ДРТ так званым «не гетэрасэксуальным парам».

**Нягледзячы на тое, што падрыхтоўка Закона знаходзіцца на завяршальнай стадыі, тэма ўжывання ДРТ у Беларусі так і не стала прадметам сур'ёзнага і ўсебаковага грамадскага абмеркавання.**

У 8 артыкуле законапраекта можна лічыць станоўчым абмежаванне максімальнай колькасці перасаджваемых эмбрыёнаў: не больш за два для пацыенткі, якая не дасягнула 35, і не больш за тры для пацыенткі, якая дасягнула 35 гадоў. Гэтая мера ў многіх выпадках папярэджвае практыку так званай рэдукцыі, г.зн. абартавання «непатрэбных» эмбрыёнаў пры многаплоднай цяжарнасці. Але абмежаванне гэта прынята, хутчэй за ўсё, не па прычыне этычных перакананняў, а каб пазбегнуць нежаданых медыцынскіх ускладненняў. Сама па сабе практыка рэдукцыі прадугледжваецца ў гэтым артыкуле законапраекта і можа быць праведзена на жаданні пацыенткі. Палажэнне спрэчнае з агульнага этычнага і недапушчальнае з рэлігійнага пункткаў погляду. Эмбрыён, які застаецца пасля рэдукцыі, павінен будзе развівацца сярод свайго роду «могілак» яго «братоў» і «сясцёр». Забойства эмбрыёна на любой стадыі яго развіцця з рэлігійнага пункту погляду ёсць аборт, г. зн. забойства жывога арганізма (менавіта так азначаецца эмбрыён і ў самім законапраекце). Этычная сумніўнасць такой практыкі яшчэ больш падкрэсліваецца фактам адвольнага выбару доктарам эмбрыёнаў, якім наканавана нарадзіцца або якім наканавана яго воляй і дзеяннем быць забітымі, хоць і ў іх былі роўныя шанцы на жыццё і паўнавартаснае развіццё.

У 9 артыкуле законапраекта гаворыцца, што «звесткі аб ужыванні дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій, а таксама аб асобах пацыента, донара складаюць урачэбную тайну». У прадугледжаных заканадаўствам выпадках дазваляецца паведамленне гэтай інфармацыі без згоды пацыента і донара. Мяркуючы па ўсім, у заканадаўчым актах дакументе ўжо прапісаны выпадкі, калі ўрачэбная тайна (не толькі ў дачыненні ўжывання ДРТ) можа быць раскрыта. Большую цікавасць выклікае іншая акалічнасць. Згодна з тэкстам законапраекта, чалавек, які нарадзіўся пры ўжыванні метадаў ДРТ, не атрымлівае права ведаць аб сваім «генетычным» паходжанні і аб сваіх «генетычных бацьках».

Адна з самых спрэчных частак закона, які рыхтуецца, — 3 глава: «Донарства палавых клетак. Захоўванне і выкарыстанне донарскіх палавых клетак».

Гаворачы аб донарстве семені, мы маем дачыненне да вельмі сур'ёзных этычных, рэлігійных, медыцынскіх і юрыдычных праблем. У такім выпадку не да месца казаць пра донарства як такое. Донарства мае на ўвазе бязвыплатную ахвяру. Тут жа ідзе гаворка аб гандлі палавымі функцыямі (арт.11 законапраекта), што зближае гэтую практыку з прастытуцыяй. Бо і там, і тут гаворка ідзе аб продажы сваіх палавых функцый. Цікавая дэталь законапраекта таксама ў тым, што «донары за прадастаўленне сваіх палавых клетак могуць атрымліваць грашовае ўзнагароджанне ад арганізацыі аховы здароўя, якая ажыццявіла забор донарскіх палавых клетак». Натуральна, арганізацыі аховы здароўя, прадастаўляючы донарскія палавыя клеткі пацыентам, будуць атрымліваць з гэтага сумніўнага роду гандлю сваю камісію. І так званымі донарамі, і медыкамі ў гэтым выпадку рухаюць выключна інтарэсы матэрыяльнай карысці. (Бо меркаванні пра іншыя матывы, якія падахвоцілі так званых ананімных донараў, непазбежна прыводзяць да вываду аб іх псіхічным нездароўі, а псіхічна хворы чалавек, паводле законапраекта, быць «донарам» не можа). Нельга зваць донарствам тое, што па азначэнні (!) такім не з'яўляецца. Гандаль ёсць гандаль, а донарства ёсць донарства. У нашым жа выпадку адбываецца абуральная падмена паняццяў, калі за азначэннем сапраўды высакародная уласцівасці хаваюцца вельмі спрэчныя з пункта погляду этыкі дзеянні карыснага характару. Тым больш што такая падмена недапушчальная ў заканадаўчым акце. Па якіх прычынах заканадаўцы не жадаюць назваць рэчы сваімі імёнамі?

Пры агульнай этычнай ацэнцы гэтай з'явы неабходна адзначыць наступнае.

Пры выкарыстанні донарскіх палавых клетак парушаецца прынцып адзінства і непарушнасці сямейнай пары. У працэсе зачацця ўдзельнічае трэці бок. У Асновах сацыяльнай канцэпцыі Рускай Праваслаўнай Царквы даецца адназначна адмоўная адзнака гэтай практыцы: «Маніпуляцыі, звязаныя з донарствам палавых клетак, парушаюць цэласнасць асобы і выключнасць шлюбных адносін, дазваляючы ўмяшанне ў іх трэцяга боку. Акрамя таго, такая практыка заахвочвае безадказнае бацькоўства або мацярынства, загадзя вызваляючы ад усякіх абавязацельстваў у дачыненні да тых, хто з'яўляецца «плоццю ад плоці» ананімных донараў. Выкарыстанне донарскага матэрыялу парушае асновы сямейных узаемасувязяў, паколькі мае на ўвазе наяўнасць у дзіцяці, акрамя «сацыяльных», яшчэ і так званых біялагічных бацькоў»(XII.4).

**Ужыванне донарскага матэрыялу ў ДРТ і ўтойванне інфармацыі аб донарах робіць сваяцка-кроўныя сувязі нябачнымі. У бліжэйшыя дзесяцігоддзі мы рэальна можам страціць магчымасць ведаць, хто каму прыходзіцца сваяком, што не выключае, напрыклад, блізкароднасных шлюбаў з усімі іх негатыўнымі вынікамі.**

Небяспечнасці падвяргаецца і само дзіця, якое можа так або інакш даведацца аб гісторыі свайго нараджэння. Акрамя таго, дзіця загадзя пазбаўляецца права ведаць праўду аб сваім нараджэнні. Усякі чалавек мае права ведаць, хто яго бацькі. Нельга выключыць сямейных калізій і з боку сацыяльнага бацькі, калі той ведае, што ў жылах народжанага яго жонкай дзіцяці цячэ чужая кроў. Ён аказваецца ў двухсэнсоўным становішчы ў дачыненні дзіцяці ў параўнанні з яго маці. Усё гэта можа адбіцца на адносінах бацькі і дзіцяці, жонкі і мужа.

Акрамя ўсяго іншага, практыка донарства палавых клетак і яе шырокае ўжыванне ў рашэнні праблем бясплоддзя ствараюць праблему грамадскага характару. Ужыванне донарскага матэрыялу ў ДРТ і ўтойванне інфармацыі аб донарах робіць сваяцка-кроўныя сувязі нябачнымі. У бліжэйшыя дзесяцігоддзі мы рэальна можам страціць магчымасць ведаць, хто каму прыходзіцца сваяком, што не выключае, напрыклад, блізкароднасных шлюбаў з усімі іх негатыўнымі вынікамі. Заканадаўцы хутчэй робяць выгляд, чым спрабуюць папярэдзіць гэтую сітуацыю. Але ні абмежаванне выкарыстання палавых клетак аднаго донара 20 спробамі апладнення (што само па сабе нямала) (арт.13), ні стварэнне адзінага рэгістра донараў палавых клетак (арт.14) не здольныя рэальна папярэдзіць негатыўныя генетычныя вынікі.

Важна таксама, з этычнага пункту погляду, пакінуць для так званага донара магчымасць адмовіцца ад выкарыстання яго донарскага матэрыялу.

Законапраект забараняе выбар полу дзіцяці (арт. 16), што апраўдана з этычнага пункту погляду. Але спакусы яўгенікай усё ж не атрымалася пазбегнуць у поўнай меры. Так, 18 артыкулам закона, які рыхтуецца, прадугледжваецца права на выбар донара. Выбар можа быць заснаваны на інфармацыі, якая прадстаўляецца пацыентам па спецыяльным каталогу, які змяшчае апісанні донараў па наступных паказчыках: узрост, рост, вага, колер валасоў і вачэй, расавая і нацыянальная прыналежнасць, адукацыя, група крыві і рэзус фактар. Калі такія паказчыкі, як узрост, расавая прыналежнасць, група крыві і рэзус-фактар, цалкам зразумелыя пры вызначэнні донара, то паказчыкі росту, вагі, колеру валасоў і вачэй (і асабліва адукацыйны ўзровень) выклікаюць сур'ёзныя падазрэнні ў яўгеністычным падыходзе аўтараў дакумента пры распрацоўцы гэтых палажэнняў.

**Пры этычнай ацэнцы сурагатнага мацярынства мы можам сказаць, што яно цалкам параўнальна з практыкай пакупкі і продажу дзяцей. Дзіця робіцца таварам.**

Сур'ёзныя этычныя апасенні ўзнікаюць у сувязі з 19 артыкулам законапраекта: «Абмежаванне на выкарыстанне палавых клетак, эмбрыёнаў у навуковых мэтах». Галоўная праблема тут не ў характары абмежаванняў, а ў легалізаванні самой магчымасці падобных даследаванняў. Даследы над эмбрыёнамі, з пункту погляду хрысціянства, ёсць знявага вартасці чалавечай асобы. І розніцы няма, ці праводзяцца такія эксперыменты да 14-дзённага ўзросту эмбрыянальнага развіцця (менавіта такі перыяд вызначаны праектам закона для магчымасці навуковых эксперыментаў, арт. 19) або ў больш позні перыяд прэнатальнага развіцця. Любы эмбрыён пры нармальных умовах валодае ўсімі якасцямі, неабходнымі для развіцця і пераўтварэння ў паўнавартаснага чалавека, няма падстаў бачыць у ім аб'ект эксперыменту або іншай працэдуры, загадзя недапушчальнай і беззаконнай у дачыненні да народжанага дзіцяці. Бо і самі аўтары праекта прызнаюць за эмбрыёнам статус «жывога арганізма».

Да таго ж, у праекце закона «навукова-даследчыя мэты» (арт.19) не абмяжоўваюцца якімі-небудзь пэўнымі задачамі — скажам, задачамі паляпшэння рэпрадуктыўных тэхналогій. А гэта значыць, што яны могуць мець самыя розныя мэты, не выключаючы мэт геннай інжынерыі або яўгенікі.

Важна, што законапраект забараняе гадаваць эмбрыёны адмыслова для навукова-даследчых мэт (арт.19).

Да недахопаў законапраекта можна аднесці і тую акалічнасць, што пры азначэнні ўмоў і парадку ўжывання ДРТ (гл. 5). не ўлічваюцца магчымыя спрэчныя сітуацыі паміж мужам і жонкай або былымі мужам і жонкай, якія ўзнікаюць у дачыненні эмбрыёнаў, якія змешчаны на захоўванне. Праект не вызначае прававых вынікаў, калі, скажам, адзін з сужэнцаў або былых сужэнцаў пажадае спыніць захоўванне эмбрыёнаў, а другі — не. Напрыклад, ці мае права жанчына, якая пакінула на захоўванне эмбрыёны падчас знаходжання ў шлюбным саюзе, скарыстацца імі пасля таго, як адбыўся развод? Падобных сітуацый у гэтым кантэксце можа быць шмат, і праект закона не дае неабходнай прававой базы для іх вырашэння.

У артыкуле 19 законапраекта ў дачыненні эмбрыёнаў, якія не былі выкарыстаны пры экстракарпаральным апладненні, не прадугледжваецца магчымасць іх дарэння іншым бясплодным парам у выпадку, калі генетычныя бацькі не жадаюць больш паўтараць спроб ЭКА. Такі варыянт усё ж больш пераважны (пры ўсёй сумніўнасці прычын, якія прывялі да такога выніку), чым знішчэнне эмбрыёнаў.

21, 22, 23 і 24 артыкулы законапраекта рэгулююць адносіны, якія ўзнікаюць пры ўжыванні методыкі сурагатнага мацярынства.

Пры этычнай ацэнцы сурагатнага мацярынства з пункту погляду этыкі мы можам сказаць, што яно цалкам падобна на практыку пакупкі і продажу дзяцей. Дзіця робіцца таварам. Акрамя таго, у выпадку з сурагатным мацярынствам бурыцца сама існасць мацярынства і бацькоўства, парушаюцца першаасновы жыцця чалавечага грамадства. Дзіця нараджаецца кандыдатам на пакутлівы крызіс ідэнтычнасці ў будучыні. Хто яго сапраўдная маці? Тая, што нарадзіла? Або тая, што дала генетычны матэрыял? І «сурмаці», і генетычныя бацькі аказваюцца пад пагрозай пакутлівых сумневаў. Шмат сведчанняў пра тое, што «маці, якая выношвае» ў большасці выпадкаў перажывае пакутлівы псіхалагічны стрэс, аддаючы народжанае ёю дзіця. У сусветнай практыцы здаралася і так, што ад дзіцяці адмаўляліся ўсе.

Спынімся на некаторых палажэннях закона, які рыхтуецца. Па-першае, сурагатная маці пазбаўляецца ўсялякіх правоў на народжанае ёю дзіця (арт.24). Па-другое, беларускі закон прызнае магчымасць аплатнай здзелкі між так званымі генетычнымі бацькамі і сурагатнай маці (арт.22), што ўвогуле пярэчыць разумнаму этычнаму погляду на праблему вартасці або, лепш сказаць, бясцэннасці чалавечага жыцця. Беларускія заканадаўцы не захацелі ўлічыць пункт погляду аўтарытэтных медыцынскіх арганізацый. Напрыклад, у заяве Сусветнай медыцынскай асацыяцыі адназначна гаворыцца: «СМА безумоўна абвяргае любы камерцыйны падыход, пры якім яйцаклеткі, сперма і/або эмбрыён з'яўляюцца прадметам куплі-продажу».

Паводле законапраекта, сурагатная маці на час цяжарнасці абмяжоўваецца ў свабодзе перамяшчэння, абавязваецца выконваць усе загады ўрача, рэгулярна рабіць справаздачу аб стане здароўя перад так званымі генетычнымі бацькамі. Відавочна, што ўмовы дагавора, які прадугледжвае праект закона, ставяць сурагатную маці ў празмерную залежнасць ад урача і генетычных бацькоў. Матэрыяльнае ўзнагароджанне, атрыманае за ўсе гэтыя пазбаўленні, толькі падкрэслівае этычную сумніўнасць такой практыкі. З ужываннем практыкі сурагатнага мацярынства ўзнікае рэальная пагроза дэгуманізацыі прэнатальнга перыяду развіцця дзіцяці.

Напрыканцы хацелася б выказаць спадзяванне на тое, што заканадаўцы да афіцыйнага зацвярджэння закона ўсё ж паспрабуюць узгадніць яго спрэчныя палажэнні з меркаваннем грамадства ў цэлым і рэлігійных арганізацый паасобку. Настолькі важныя па сваім значэнні і выніках рашэнні павінны мець больш шырокае і паглыбленае абмеркаванне. Пытанні рэпрадукцыі датычацца глыбінных асноў чалавечага быцця, і таму неасцярожныя, добра не ўзважаныя рашэнні могуць самым негатыўным чынам адбіцца на нашым жыцці і жыцці нашых нашчадкаў. Дакранаючыся да таямнічых крыніц чалавечага жыцця, небяспечна кіравацца толькі ўтылітарнымі меркаваннямі і матэрыяльнай карысцю. У канчатковым выніку важна памятаць, што жыццё — гэта падарунак Бога і яго зараджэнне — сфера Яго таямнічай творчай сілы.

**Протаіерэй Георгій РОЙ,**
**выкладчык Мінскай духоўнай акадэміі, настаяцель Свята-БарысаГлебскага храма в. Накрышкі, кандыдат багаслоўя.**

# «ДЗІЦЯ НЕ МОЖА БЫЦЬ ПРАДМЕТАМ ЖАДАННЯЎ»

**АРЦЫБІСКУП Тадэвуш Кандрусевіч, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі Рыма-Каталіцкага Касцёла ў Беларусі, звярнуўся з заявай у сувязі з прыняццем Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу 27 красавіка 2011 года ў першым чытанні законапраекта аб рэпрадуктыўных тэхналогіях.**

Тэкст заявы размешчаны на афіцыйным сайце Касцёла catholic.by. У ёй праводзіцца паралель паміж кланаваннем чалавечых эмбрыёнаў і рэпрадуктыўнымі тэхналогіямі.

«Каталіцкі Касцёл, раздзяляючы занепакоенасць праблемай бясплоднасці і заахвочваючы да пошуку новых метадаў яе лячэння, у той жа час катэгарычна выступае супраць выкарыстання тэхналогій, якія супярэчаць хрысціянскаму паняццю годнасці сям'і, бацькоўства, дзетанараджэння і чалавечага эмбрыёна, а таксама значэння чалавечай сэксуальнасці, — гаворыцца ў заяве. — Тэндэнцыя аддзялення паняцця жыцця ад паняцця сям'і як натуральнага асяроддзя, дзе зараджаецца і развіваецца жыццё, з'яўляецца адным з найбольш згубных наступстваў культуры смерці . Чалавечае жыццё ўзнікае ў выніку рэалізуемага падчас акту сужэнскай любові ўзаемнага аддавання мужчыны і жанчыны. Сужэнцы пры гэтым не з'яўляюцца гаспадарамі, а толькі слугамі ў справе любові Стваральніка. Таму зачаты чалавек — гэта плод любові бацькоў, і ён не можа быць прадметам жаданняў або прадуктам зачацця ў выніку медыцынскага ці біялагічнага ўмяшання».

Таму кланаванне чалавечых арганізмаў і выкарыстанне рэпрадуктыўных тэхналогій нясе ў сабе сур'ёзныя супярэчнасці маральнага і антрапалагічнага характару, а таксама вядзе да дэвальвацыі каштоўнасці чалавечага жыцця і сям'і, лічыць арцыбіскуп.

Мітрапаліт выказаў заклапочанасць у сувязі з тым, што законапраект рыхтаваўся без удзелу рэлігійных арганізацый, якія маюць шмат напрацовак у гэтай галіне, і заклікаў дзяржаўныя ўлады, грамадскія і навуковыя сілы, а таксама рэлігійныя арганізацыі звярнуць увагу на гэтую праблему і «не дапусціць парушэння галоўнага права чалавека на жыццё і абразу яго годнасці».

У адказ на гэтую заяву **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі Святлана ШЫЛАВА** заўважыла, што законапраект аб дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогіях накіраваны на лячэнне бясплоднасці і не звязаны з кланаваннем чалавека.

«Беларусь — свецкая дзяржава, і мы не можам пры распрацоўцы законапраектаў улічваць меркаванне толькі рэлігійных арганізацый, — цытуе словы дэпутата С. Шылавай БелаПАН. — Я рада, што Касцёл імкнецца ўдзельнічаць у грамадскім жыцці, аднак лічу, што гэта неабходна рабіць не ў такой катэгарычнай форме».

Сёння ў Беларусі бясплоднымі лічацца 15 адсоткаў сужэнскіх пар. Вядучым накірункам дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій з'яўляецца экстракарпаральнае апладненне (ЭКА). Штомесяц да ЭКА звяртаецца каля 200 жанчын, штогод у выніку гэтага метаду нараджаецца каля 700 дзяцей. Распрацоўшчыкі законапраекта падкрэсліваюць, што Беларусь — адна з апошніх краін, дзе рэпрадуктыўныя тэхналогіі даўно выкарыстоўваюцца, але адпаведнага закона не існуе.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## НЕНАРОДЖАНЫЯ ДЗЕЦІ ПА ЗАКОНЕ БУДУЦЬ ГІНУЦЬ У ВЫНІКУ ЭКСПЕРЫМЕНТАЎ: СМЯРОТНЫ ПРЫГАВОР ПАДПІСВАЕЦЦА БАЦЬКАМІ

*У артыкуле 19-м (Абмежаванні на выкарыстанне палавых клетак, эмбрыёнаў у навуковых даследаваннях) праекта Закона «Аб дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогіях і гарантыях правоў грамадзян пры іх ужыванні» гаворыцца:*

*«Незапатрабаваныя ў выніку ўжывання дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій эмбрыёны могуць быць выкарыстаны ў навукова-даследчых мэтах толькі тады, калі тэрмін іх развіцця не перавышае 14 дзён і пры наяўнасці пісьмовай згоды пацыентаў, з палавых клетак якіх утварыўся эмбрыён».*

*Каментаваць падобнае рашэнне залішне. Падобна, што ў Беларусі жадаюць легалізаваць дзейнасць «нацыстаў» у белых халатах, якія будуць на законных падставах праводзіць эксперыменты.*

*Гісторыі ўжо вядомы «ўклад» у навуковыя даследаванні, якія ігнаруюць этычныя меркаванні. Тое, што рабілася ў канцлагерах у гады Другой сусветнай вайны ў навуковых лабараторыях, дагэтуль выклікае жах!*

*Не думаю, што жанчына, якая шмат гадоў жадала мець дзіця, пагодзіцца, каб яго раздзіралі на часткі для навуковых мэт!*

*Дарэчы, абаронцы жыцця ў ЗША дабіліся таго, каб закон не дазваляў праводзіць эксперыменты над незапатрабаванымі эмбрыёнамі.*

*Давайце і мы, беларусы, выступім у абарону ненароджаных дзяцей!*

**Юлія ЧЫРВА,**
**тэолаг-рэлігіязнаўца, матуля ў дэкрэтным водпуску.**

**Информация о проведении аукциона без условий по продаже имущества, обращенного в доход государства**

| ЛОТ № 1 | |
|---|---|
| Адрес объекта и его наименование | - Ангар (инв. № 16-00091) общей площадью 394,4 м², год постройки 1979, фундамент кирпичный, стены металлические, крыша металлическая, полы бетонные. Объект расположен по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67. **Начальная цена: 109 512 000 белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5 % от предыдущей цены. |
| Порядок оплаты | Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 2 месяцев и 25 дней на р/с СИКУП «УКС-Сервис» |
| Сумма задатка | 10 % от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-Сервис» |
| Продавец | Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Молодечненском райисполкоме |
| Организатор аукциона | СИКУП «УКС-Сервис» |
| Документы, представляемые для участия в аукционе | Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, индивидуальным предпринимателям – нотариально заверенное свидетельство о государственной регистрации, физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность |
| Конечный срок и адрес приема заявок | **20.05.2011 г. до 16.00**, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел. (8 0176) 73 00 13, (факс) 75 19 20, 8 044 710 74 60 |
| Дата, время и место проведения аукциона | **23.05.2011 г. в 15.00,** г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1. СИКУП «УКС-Сервис» |

**ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ФАБРИКА «БЕРЕЗКА»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**
**по продаже капитального строения склада (инв. № 630/С-65854) общей площадью 363,2 кв. м, расположенного по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Виленская, д. 12, корп. 1.**

Начальная цена с НДС — 170 000 000 бел. руб. Площадь земельного участка — 0,0409 га. Задаток в сумме 20 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с 3012192090011, отделение 932 ОАО «Белинвестбанк» г. Молодечно, код 739 пр. Партизанский, 1 ОАО «Фабрика «Березка», УНП 600136873.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **08.06.2011 г. в 12.00** по адресу: г. Молодечно, ул. Виленская, д. 12, каб. директора. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 07.06.2011 г. включительно до 17.00** по вышеуказанному адресу.

**Тел. (80176) 77 24 02.**

**Открытое акционерное общество «Радиотехника»**

проводит внеочередное общее собрание акционеров **20 мая 2011 года в 15.00** по адресу: **Гродненская обл., г. Ошмяны, ул. Я. Коласа, 1.**

*Повестка дня собрания:*

1. Об утверждении распределения и использования прибыли и убытков, выплате дивидендов за 2010 год.

УНП 500227068

**Управляющий в производстве по делу о банкротстве ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ по продаже дебиторской задолженности ОДО «Гранат-М» г. Мозырь**

| № лота | Наименование дебитора | Сумма задолженности (руб.) | Стартовая цена (руб.) | Сумма залога (руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 1. | ЧПТУП «Вита Мозырь» УНП 400083607 | 13 299 697 | 11 970 000 | 800 000 |

Организатор торгов: управляющий.

Торги проводятся в форме открытого аукциона без условий.

Сумма залога: до 10% от начальной цены на р/с № 3012137010006 ОАО «Белвнешэкономбанк» ЦБУ в г. Светлогорске, код 226, получатель ЗАО «Пульс», УНП 400019906.

Победителем торгов признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

Форма, порядок оплаты: одноразовый безналичный платеж.

Документы, предоставляемые для участия в торгах: заявление на участие, копии платежных документов, подтверждающих внесение залога, копия устава, доверенность представителю юридического лица, паспорт физическому лицу.

**Торги состоятся 25 мая 2011 года в 12.00 по адресу: г. Мозырь, пер. 1-ый Интернациональный, 27.**

**Заявки принимаются до 12.00 24 мая 2011 года по адресу: г. Мозырь, пер. 1-ый Интернациональный, 27.**

**Справки по телефону: 8 029 663 84 96.**

# БОЛЬШ АЛЕРГІКАЎ — БОЛЬШ АСТМАТЫКАЎ

**Штогод у маі па ініцыятыве Сусветнай арганізацыі аховы здароўя праводзіцца Міжнародны астма-дзень. Кожныя дзесяць гадоў колькасць хворых на бранхіяльную астму ўзрастае — прыкладна ў 1,5 раза. Па колькасці выпадкаў апошняя знаходзіцца на пятым месцы пасля хваробаў сэрца, інсульту, цукровага дыябету і раку. Астма можа істотна знізіць якасць жыцця і нават прывесці да інваліднасці. Наогул астма з'яўляецца самай распаўсюджанай хранічнай хваробай сярод дзяцей. У паловы хворых паталогія развіваецца ва ўзросце да 10 гадоў, яшчэ у трэці — да 30-40 гадоў. Сярод дзяцей яна бывае ў 2 разы часцей у хлопчыкаў, аднак бліжэй да 30 гадоў суадносіны палоў выраўноўваюцца.**

Паводле слоў **урача-алерголага 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска, галоўнага пазаштатнага алерголага камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Галіны РАЧЫНСКАЙ**, толькі ў другой палове мінулага стагоддзя была даказана запаленчая прырода астмы і пацверджана генетычная схільнасць да яе. Запаленне і, як вынік, звужэнне бронхаў, можа ўзнікнуць у выніку ўздзеяння нейкага алергена, пасля віруснага захворвання, эмацыянальнага перанапружання і г.д. Абсалютная большасць выпадкаў астмы мае алергічнае паходжанне, а алергія — паталогія, як вядома, маладога ўзросту. Дзеці з групы рызыкі па бранхіяльнай астме павінны знаходзіцца на грудным кармленні.

Сучасныя метады лячэння пры ўмове своечасовага і правільнага прымянення здольныя забяспечыць хвораму паўнавартаснае актыўнае жыццё. Лекі, якія прымяняюцца для лячэння астмы, бываюць двух відаў: прэпараты хуткай дапамогі (інгалятары, якія пашыраюць бронхі) і прэпараты лячэбныя, інгаляцыйныя (глюкакортыкастэроіды). Прэпараты першай групы прымяняюць па неабходнасці, а другой — штодзённа і працягла, незалежна ад самаадчування. Добры эфект дае і выкарыстанне ў стане рэмісіі магчымасцяў Салігорскай спелеалячэбніцы. Нярэдка пацыенты, якія пачалі добра сябе адчуваць, самастойна спыняюць прыём лекавых сродкаў, аднак праз нейкі час хвароба вяртаецца. Астма — хранічная паталогія і нікуды не знікае. З ёю трэба вучыцца жыць. Навучанне ў межах спецыяльных астма-школ на базе амбулаторных і стацыянарных медустаноў з'яўляецца важным складнікам у падтрымцы якасці жыцця хворага.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Новыя паслугі

### ПРАПАНОВА, АД ЯКОЙ ЦЯЖКА АДМОВІЦЦА...

**З 5 мая лінейку пакетных прапаноў «Белтэлекама» дапоўніў новы пакет «Універсал». Гэта першы пакет, які ўключае адразу тры асноўныя паслугі: тэлефонную сувязь, доступ у інтэрнэт і інтэрактыўнае тэлебачанне.**

У рамках пакета «Універсал» абанентам будуць прадастаўлены 1500 хвілін тэлефоннай сувязі, у тым ліку 1000 хвілін мясцовай сувязі, 300 хвілін тэлефонных размоў у межах вобласці, 200 хвілін размоў у межах краіны, нелімітаваны доступ у інтэрнэт на хуткасці 1024/512 Кбіт/с і паслугі тэлебачання з інтэрактыўнымі сэрвісамі.

Кошт пакета складзе 90 тысяч рублёў у месяц. Падключыцца на пакет «Універсал» можна у любым сэрвісным цэнтры і пункце «Белтэлекам». Пакет прапаноўваецца толькі прыватным абанентам.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Сённяшняя наша рубрыка цалкам прысвечана вялікаму святу — Дню Перамогі!**

### ФРАНТАВЫ КУЛЕШ (РЭЦЭПТ 1943 ГОДА)

Бяром паўкіло грудзінкі на костках (можна замяніць на тушонку). Зразаем мяса, а косці варым хвілін 15 у кіпячай вадзе (вады наліць 1,5—2 літры). Дадаём 250—300 г проса і варым да гатоўнасці.

3—4 ачышчаныя бульбіны наразаем буйнымі кубікамі і адпраўляем туды ж. Зрэзанае з касцей мяса абсмажваем з цыбуляй (2—3 цыбуліны) на патэльні і дадаём у каструлю. Варым страву да гатоўнасці, хвілін 10. Атрымліваецца смачная і сытная ці то вадкая каша, ці то густы суп.

### МАКАРОНА БАЛТЫЙСКАЯ

**Нам спатрэбіцца:** *500 г макароны, 500 г мяса (пажадана на рабрынках), 2—3 цыбуліны.*

Мяса варым да гатоўнасці, наразаем кубікамі. Адварваем да гатоўнасці макарону. Цыбулю пасіруем на патэльні да «залацістага» колеру. Мяса, макарону і цыбулю змешваем у казанку або каструлі. Дадаём трохі мяснога булёну і адпраўляем на 10—20 хвілін у гарачую духоўку (210-220 °С).

### САЛЯНКА ТЫЛАВАЯ

У чыгунок укласці пароўну квашаную капусту і ачышчаную, нарэзаную скрылікамі бульбу. Потым заліць ваду так, каб яна пакрывала капусна-бульбяную сумесь. Пасля гэтага чыгунок паставіць на агонь — тушыцца. А за 5 хвілін да гатоўнасці трэба дадаць у чыгунок падсмажаную на алеі шаткаваную цыбулю, пару лаўровых лісцікаў, паперчыць, а пасля, пры неабходнасці, пасаліць. Калі ўсё гатова, трэба накрыць пасудзіну ручніком і даць патаміцца з паўгадзіны.

### ГАРОХАВЫ СУП

Замачыць гарох на ноч у халоднай вадзе. Можна дадаць у яго ячныя крупы. На наступны дзень адварыць, незадоўга да гатоўнасці дабавіць бульбу і папярэдне абсмажаныя на сале цыбулю і моркву (падчас вайны дадавалі і проста так, без смажання). У апошнюю чаргу дабавіць тушонку.

### КАША З ЧАСНАКОМ

**Вазьміце:** *1 шклянку проса, 3 шклянкі вады, алей, часнок, цыбулю і соль.*

Абсмажваем цыбулю на алеі. Заліваем крупы халоднай вадой і ставім на агонь. Як толькі вада закіпіць, дадаём туды нашу смажанку, солім кашу і варым яшчэ хвілін 5. Чысцім і дробна наразаем галоўку часнаку. Здымаем кашу з агню, дадаём у яе часнок і, закрыўшы накрыўкай, захутваем у коўдру — няхай распарыцца. Каша атрымліваецца духмянай, мяккай і далікатнай.

### ГРЭЦКАЯ КАША

**Нам спатрэбіцца:** *1 слоік тушонкі, 300 г грэцкіх круп, 3—4 шклянкі вады, 3—4 цыбуліны, соль, лаўровы ліст.*

Цыбулю абсмажыць на сале. Змяшаць у каструлі тушонку, грэцкія крупы і смажаную цыбулю. Заліць вадой, пасаліць і варыць, памешваючы, да гатоўнасці.

### ХЛЕБ РЖЭЎСКІ

Адварыць бульбу ў мундзіры, ачысціць, прапусціць праз мясарубку. Атрыманую масу выкласці на бляху, пасыпаную вотруб'ем і астудзіць. Дадаць яшчэ вотруб'е, пасаліць, хутка замяшаць цеста і, змясціўшы ў змазаную алеем форму, выпякаць да гатоўнасці.

### МАРКОЎНАЯ ГАРБАТА

Ачышчаную моркву надзіраліна тарцы, сушылі і прасмажвалі ў духоўцы з чагай (драўняны грыб), пасля чаго выкарыстоўвалі як гарбату, заварваючы кіпенем. Морква давала такой гарбаце саладкавы смак, а чага — асаблівы прысмак і прыемны цёмны колер.

### КАКТЭЙЛЬ ВАЕННЫ

**Вазьміце:** *30 мл спірту і 70 мл агурочнага расолу.* Змяшаць і піць.

## ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

**Нядзеля, 8 мая**

Сёння можна займацца справамі, якія патрабуюць разумовай работы. Добра будаваць планы на перспектыву, праводзіць аналіз вынікаў працы. Трэба пазбягаць пустой балбатні. Для давядзення пачатай справы да канца давядзецца праявіць мэтанакіраванасць і настойлівасць.

**Панядзелак, 9 мая**

Даволі спакойны дзень, які вельмі падыходзіць для заняткаў паўсядзённымі справамі, і чым больш цікавымі будуць гэтыя справы, тым весялей пройдзе працэс іх вырашэння. Плённай будзе калектыўная праца на зямлі ці рамонтныя работы.

**Аўторак, 10 мая**

Сёння забараняецца сядзець склаўшы рукі. Час дзейнічаць. Можна смела ставіць амбіцыйныя мэты і пачынаць іх ажыццяўленне. Усе незавершаныя справы пры гэтым нельга кідаць на паўдарозе і трэба неадкладна з імі разабрацца.

**Серада, 11 мая**

Стабільны дзень, адмоўнай рысай якога можна лічыць толькі зніжэнне актыўнасці. Займайцеся паўсядзённымі справамі, чытайце. Самы час надаць больш увагі дзецям.

**Чацвер, 12 мая**

Дзень вызначаецца даволі нявызначанай устойлівым эмацыянальным фонам. Сёння варта пазбягаць спраў, якія патрабуюць шматлікіх кантактаў з іншымі людзьмі. Вырашэнне канфліктных пытанняў катэгарычна забараняецца. Можна схадзіць у тэатр ці паглядзець добры фільм.

**Пятніца, 13 мая**

Разбуральны дзень. Яго трэба правесці стрымана і спакойна. Пазбягайце любых сутыкненняў. Займіцеся справамі, якія можна рабіць у адзіноце. Сёння не варта хадзіць у госці ці прымаць іх у сябе.

**Субота, 14 мая**

Дзень падыходзіць для зносін. А вось у пытаннях, якія патрабуюць канкрэтыкі, разліку і сабранасці, на поспех разлічваць не даводзіцца. Дзень лепш за ўсё правесці плаўна і размерана, а новыя здзяйсненні адкласці на наступны тыдзень.

**Дарагая братавая, сястра, сяброўка, былая настаўніца Марыя Герасімаўна СМОЛІЧ з Мінска!**

Прымі нашы сардэчныя віншаванні з нагоды юбілейнага дня нараджэння. Зычым павагі ад родных і блізкіх, жыццёвага аптымізму, здароўя.

**Твае сяброўкі Яновіч, Каладоўская, Ляневіч, Новік.**

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

### СТРАЛЬЦЫ МОГУЦЬ ПАЙСЦІ НА АБДУМАНУЮ РЫЗЫКУ, А ЛЬВАМ НЕАБХОДНА ПРАЯВІЦЬ РАЗУМНУЮ АСЦЯРОЖНАСЦЬ

**ВОВЕН**. Тыдзень абяцае быць спакойным, але пры гэтым атмасфера ў найбліжэйшым асяроддзі будзе цалкам залежаць ад вас. Паспрабуйце не заводзіць новых знаёмстваў, бо ўсе яны будуць павярхоўнымі і не прынясуць карысці. Не ўзвальвайце на свае плечы непад'ёмны груз чужых праблем. Нешматслоўнасць дазволіць пазбегнуць пэўных праблем.

**ЦЯЛЕЦ**. Тыдзень давядзецца без астатку прысвяціць працы. Вельмі многае трэба зрабіць, каб думаць аб адпачынку. Паспрабуйце быць больш стрыманымі і сачыць за тым, што і каму кажаце. Не расходуйце дарма свае сілы, устрымайцеся ад мітусні і балбатлівасці. Таксама варта знізіць аб'ём працы. Ініцыятыва будзе ацэнена па вартасці.

**БЛІЗНЯТЫ**. Неабходна завастрыць увагу на працы з фінансавай дакументацыяй. На вашым шляху могуць паўстаць перашкоды, пераадолець якія будзе вельмі цяжка. У пачатку тыдня непажадана планаваць адказныя справы і сустрэчы — лепш перанесці іх на другую палову тыдня. Вельмі спатрэбіцца цярпенне. Падвышаная нервовасць і стамляльнасць можа прывесці да зрываў і сварак з блізкімі людзьмі.

**РАК**. У панядзелак удала пройдуць дзелавыя сустрэчы і перамовы. Паспрабуйце не адмаўляць у дапамозе людзям, якія жывуць у нястачы, калі, зразумела, гэта будзе па сілах. Можаце ўпэўнена пачынаць рэалізацыю сваіх праектаў. Зносіны з сябрамі і аднадумцамі пацешаць вас новымі ідэямі і далягляднасцю. Адносіны са сваякамі могуць ускладніцца.

**ЛЕЎ**. У пачатку і канцы тыдня могуць паўстаць напружаныя сітуацыі, таму праяўляйце разумную асцярожнасць. У панядзелак з'явіцца магчымасць вырашыць раздражняльную праблему, але для ўдалага завяршэння справы неабходна сканцэнтравацца і паслядоўна пераадольваць перашкоды, якія ўстаюць перад вамі. У аўторак добра было б пачаць пошукі другой працы, халтуры або іншага дадаткоўга заробку. А вось у сераду паспяшайцеся разабрацца са справамі на асноўным працоўным месцы.

**ДЗЕВА**. Нават калі ў вас цяпер няма ніводнай вольнай хвіліны, не варта грэбаваць зносінамі з новымі людзьмі. Знаёмствы, набытыя на гэтым тыдні, саслужаць неблагую службу пасля, калі вы ўжо забудзецеся, пры якіх абставінах яны адбыліся. А абставіны могуць быць самымі нечаканымі — і, часам, нават даволі няёмкімі. Любая спроба падумаць пра будучыню выльецца ў мары аб вандраванні і адпачынку ў камфортным становішчы — будаваць бізнэс-планы бескарысна.

**ШАЛІ**. Пажадана сувымяраць свае жаданні з магчымасцямі і не абяцаць таго, чаго вы ніяк не зможаце зрабіць. Гэтыя дні могуць прынесці шмат праблем і непаразуменняў тым, хто не схільны думаць пра наступствы уласных дзеянняў. Паспрабуйце засяродзіцца на самай галоўнай справе, а не распыляцца на некалькі дробных адначасова. Вам неабходна рэальна ацаніць сітуацыю, якая склалася, і паспрабаваць дасягнуць выгадных дамоўленасцяў з партнёрамі. Надыходзіць новы віток духоўнага развіцця, таму не забывайце пакідаць досыць часу для сябе.

**СКАРПІЁН**. Вам будзе проста катэгарычна проціпаказаны фанатызм у любых жыццёвых аспектах. Ведайце меру, таму што цяпер нястрымнае імкненне да мэты, якой бы яна ні была, нічога добрага не абяцае. Лепш раскажыце блізкім людзям і сябрам пра свае планы — тым самым вы зробіце яшчэ адзін крок да іх рэалізацыі. Напярадзе шматабяцальныя прапановы, але поспех не прыплыве ў рукі сам, вы павінны праявіць актыўнасць.

**СТРАЛЕЦ**. Асабліва добра будзе атрымлівацца праца па складанні планаў. Дэталі будуць вымалёўвацца як ніколі выразна, графікі будуць стройныя і вывераныя да дробязяў. Няблага таксама прымацца за гэтую працу ў цесным супрацоўніцтве з калектывам аднадумцаў. Паездкі будуць удалымі. Лёс прапануе пайсці на абдуманую рызыку і дапаможа дабіцца поспеху. Філасофскае разуменне жыцця і стрыманасць ва ўсіх сітуацыях дазволіць дасягнуць выдатных вынікаў. На працы, напэўна, назапасіліся пытанні, якія вырашыць пад сілу толькі вам. Не ўзвальвайце ўсё толькі на сябе, пашукайце сабе памочніка. Вырашаючы свае праблемы, не забывайце аб інтэрасах блізкіх людзей: калі яны ўвойдуць у супярэчнасць з вашымі, давядзецца сур'ёзна пашкадаваць аб зробленым.

**КАЗЯРОГ**. У любой сітуацыі разлічвайце толькі на сябе. У аўторак варта вылучыць час для планавання найбліжэйшай будучыні, бо менавіта ў гэты дзень вас могуць наведаць цікавыя і перспектыўныя ідэі. Другая палова тыдня — добры час для рашэння канфліктных пытанняў мірным шляхам: верагодны кампраміс без шкоды для вашых інтарэсаў. Магчыма прыняцце пазітыўных рашэнняў, якія вызначаць вашу бліжэйшую будучыню, паспрабуйце праявіць рашучасць і прынцыповасць. Можа пашанцаваць, у тым ліку і ў грошах, — толькі не пераацаніце сваіх сіл. Шукайце новыя, неардынарныя шляхі ў асабістым жыцці.

**ВАДАЛЕЙ**. Пераконваць і пераўтвараць супернікаў у саюзнікаў — вось галоўная і, мабыць, адзіная задача тыдня. Паспрабуйце, каб паміж вамі і навакольнымі не засталося недасказанасцяў і крыўдаў — усе адносіны лепш высвятляць у адкрытую. У другой палове тыдня для развіцця вашай справы спатрэбяцца пэўныя фінансавыя рэсурсы. У нядзелю магчымыя памылкі, няўзгодненасць і цалкам непрадказальны паварот падзей, таму ў гэты дзень не варта планаваць нічога сур'ёзнага і адказнага.

**РЫБЫ**. Спрыяльны час для плённай працы і дзелавых сустрэч. Працаваць будзе цікава і лёгка, а ідэі, якія прыйдуць у галаву, могуць стаць пачаткам сапраўды грандыёзных здзяйсненняў у будучыні. Не варта ставіць на карту ўсё, што ў вас ёсць, нават калі раптам вам падасца, што наступіў час перамен. Звярніце ўвагу на падзеі, якія адбудуцца з вамі ў нядзелю. Яны не выпадковыя, варта аб гэтым задумацца.

## Крыжаванка

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ. *г. Дзяржынск.*

# З Днём Перамогі!




**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1.** Не толькі …— і колас ворага коле (прык.). **4.** "… снайпера". Верш Пімена Панчанкі. ( "У … снайпера, нібы ў дом прасторны"). **8.** "… твой увіты \\ Непадкупнай ласкай,\\ Штык у гліну ўбіты, а паблізу – каска". З верша "Ружа і штык" Васіля Віткі, якому 16-га мая споўнілася б 100 гадоў з дня нараджэння. **9.** "… Перамогі". Верш Анатоля Астрэйкі. ("Тым, што загінулі ў баях \\ Салдатам, народ вянкі да помніка кладзе"). **10.** "Слава Вам, … !". Верш Алега Лойкі, якому 1 мая споўнілася б 80 гадоў з дня нараджэння. **14.** Хто смерці не баіцца, таго і … не бярэ (прык.). **15.** "Стрэўся з цёмнаю варожай сілай \\ Смелы … Алесь Гаравец". З "Песні пра Гараўца". (Словы М. Шушкевіча, музыка У. Алоўнікава). **16.** "Паўстаў народны … і помста, \\ Паўсталі грозна партызаны". З верша Янкі Купалы "Зноў будзем шчасце мець і долю". **19.** "Але мінулі дні. …адышоў далёка.\\ І вярнуўся з вайны земляроб - салдат". З верша Кастуся Кірэенкі "Поле". **20.** Снежны барс. **21.** "… сорак пятага года". З песні " Майскі вальс" (Сл. М. Ясеня, муз. І. Лучанка). **22.** "Гэта было ў … першым на рыдняпроўскай зямлі". З верша Уладзіміра Караткевіча "Партызанская балада". **23.** Родная зямля - …, чужая старонка–мачаха (прык.). **24.** "Лясная …". Верш Адама Русака, пакладзены на музыку. ("Ой, бярозы ды сосны -\\ Партызанскія сёстры"). **26.** Ідзі ў родны …, там і пад ёлкаю рай (прык). **32.** "…, … \\ Адна ў Марата\\ І маці – Радзіма \\ У Марата адна". З кантаты "Памяці Марата Казея" (Сл. А. Вольскага, муз. У. Алоўнікава). **34.** Невялікае возера. **35.** "Трэццяя …". Апавяданне Васіля Быкава. **36.** Тое, што войска (уст.). **37.** "Заныла ад болю \\ Салдацкае сэрца— \\ Не выпала …\\ З каханай сустрэцца". З верша Пятруся Броўкі "Дарогай салдата".

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 2.** "Стаіць, снарадамі прабіты, \\ Нямецкі абгарэлы …". З верша Алеся Бачылы "Танк". **3.** Частка рукі ці нагі, якая засталася ў цяжка параненага воіна. **4.** Сукупнасць ведаў. **5.** "… за …, а смерць за смерць". З верша Я. Купалы "Беларускім партызанам". **6.** Творы народнай творчасці – гераічныя сказанні, песні. **7.** "Радзей бярэ акардэон \\ І ўжо не так іграе …". З верша Януся Малеца "9 Мая". **11.** Партовае збудаванне для рамонту суднаў. **12.** Пётр … Герой Савецкага Саюза, які паўтарыў подзвіг А. Матросава. Увекавечаны разам з маці і братамі-героямі ў помніку, у г. Жодзіна. **13.** Сяргей … Беларускі скульптар, аўтар скульптурнай кампазіцыі "Няскораны чалавек" у Хатыні, адзін з аўтараў манумента Перамогі ў г. Мінску і інш. **17.** Вайсковая група. **18.** "Родны … я пакінуў, нямецкай бамбёжкаю гнаны". З паэмы Аркадзя Куляшова "Сцяг брыгады". **25.** "Канстанцін Заслонаў – наша слава, \\ Беларусі – партызанскі…". З "Песні пра Заслонава". (Сл. А. Астрэйкі, муз. У. Алоўнікава). **27.** Не смейся, …, сам будзеш салдат (прык.). **28.** Каманда страляць. 29. "Ён помніць сорак першага трывогу \\ І ў сорак пятым радасны …". З песні "Шумяць бярозы ў парку Перамогі". (Сл. Ю. Свіркі, муз. Ю. Семянкі). **30.** Орган кіравання войскамі. **31.** Горад, дзе ўпершыню прагучаў першы залп легендарных "Кацюш". **33.** Места, дзе што-небудзь адкалолася.

**АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ**

**Па гарызанталі:** 1. Цытрык. 4. Воха. 8. Томік. 9. Пішуча. 10. Сардатэл. 14. Кулі. 15. Скокан. 16. Гнеў. 19. Фронт. 20. Ібіс. 21. Вясна. 22. Сорак. 23. Маці. 24. Леснік. 26. Крык. 32. Граната. 34. Азярко. 35. Ракета. 36. Рабі. 37. Доля.

**Па вертыкалі:** 1. Цыбік. 2. Танк. 3. Кухса. 4. Вопыт. 5. Клоў. 6. Эпас. 7. Тата. 11. Док. 12. Курцавацяў. 13. Сапуцянку. 17. Атрад. 18. Мінск. 25. Сын. 27. Брат. 28. Агонь. 29. Парад. 30. Цітка. 31. Орша. 33. Скон.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.23 | 20.51 | 15.28 |
| Віцебск — | 5.07 | 20.46 | 15.39 |
| Магілёў — | 5.13 | 20.41 | 15.28 |
| Гомель — | 5.15 | 20.32 | 15.17 |
| Гродна — | 5.39 | 21.05 | 15.26 |
| Брэст — | 5.45 | 21.00 | 15.15 |

**Месяц**

***Першая мая 10 мая. Месяц у сузор'і Рака.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Елізаветы, Аляксандра, Аўсея, Аляксея, Валянціна, Савы, Фамы.*

***К.*** *Даніцэлі, Людмілы, Ружы, Бенядзікта, Вінцэнта, Людаміра.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## Дзве даты

## 7 мая

**1794 год** — кіраўнік нацыянальна-вызваленчага паўстання Тадэвуш Касцюшка выдаў так званы Палянецкі ўніверсал, якім абвясціў усіх сялян Рэчы Паспалітай вольнымі ад прыгоннай залежнасці.

**1895 год** — рускі фізік і электратэхнік А.С. Папоў упершыню прадэманстраваў прыбор, які быў здольны ўлоўліваць радыёхвалі — прататып сучаснага радыёпрыёмніка. І хоць на першай дэманстрацыі не было перадатчыка (ён з'явіцца толькі праз год), менавіта гэты дзень стаў лічыцца днём нараджэння радыё.

## Цытата дня:

***«Цывілізацыя ў сапраўдным сэнсе слова заключаецца не ў памнажэнні багацця, а ў свабодным і добра прадуманым абмежаванні сваіх патрэб».***

**Махатма Карамчанд Гандзі (1869—1948), адзін з лідараў індыйскага нацыянальна-вызваленчага руху, яго ідэолаг.**

## ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БАБУЛІНЫ РЭЦЭПТЫ

### Тортавая бабка

**Гэтым печывам частавала мяне бабуля, калі я прыязджала да яе ў вёску на канікулы.**

А называецца яно так, бо менавіта з гэткага цеста выпякалі тарты на вяселлі, хрысцiны і іншыя ўрачыстасці. Толькі тады іх выразалі кругамі, прамазвалі рознымі варэннямі, складвалі з іх нешта падобнае на вежу і упрыгожвалі мноствам кветак, якія рабілі з бялку, жэлацiну і цукровай пудры з дабаўленнем розных фарбавальнікаў. Сцяблінку такой кветкі рабілі з доўгай тоўстай макароны (я зараз і не бачу нідзе такіх). Букеты гэтых кветак пасля яшчэ доўга стаялі ў сервантах. Бабуля ж проста пякла вялікі пірог, які разразала на кавалачкі рознай формы і частавала нас. З малаком было вельмі смачна.

З трох яек, шклянкі смятаны, шклянкі цукру, дробкі соды і солі, мукі трэба зрабіць цеста крыху гусцейшае, чым на бліны. Форму змазаць алеем, выліць цеста і выпякаць у не вельмі гарачай духоўцы хвілін 30. Пасля таго, як пірог астыне, парэзаць яго на кавалачкі (напрыклад, у выглядзе ромбаў), выкласці на вялікае блюда і зверху (па жаданні) пасыпаць цукровай пудрай. Цяпер можна частаваць і ўнукаў, і дзяцей, і сяброў, і родных. Думаю, што у такім пірагу не будуць лішнімі і ванілін, і разынкі, і здробненыя арэхі, і карыца, і нават крышку кардамона. Але гэта ўжо варыяцыі на тэму.

***P.S. Паважаныя чытачы, напэўна ў кожнай сям'і ёсць стравы, якія гатавалі яшчэ бабулі ці матулі. Будзем вельмі ўдзячныя, калі вы падзеліцеся сакрэтам іх прыгатавання з намі і нашымі чытачамі. Чакаем лістоў. Абяцаю ўсё паспрабаваць прыгатаваць і прынесці на дэгустацыю ў рэдакцыю. Аўтара самай смачнай стравы чакае прыз.***

ПАРАДАК У ДОМЕ

### Правілы адбору

**Прымаючы рашэнне, ці варта захоўваць тую або іншую рэч, задайце сабе наступныя пытанні.**

*Ці браў я ў рукі гэтую рэч хоць раз за апошні год?* Калі адказ «не», то ці мае яна для мяне сентыментальную каштоўнасць? Паспрабуйце лагічна падысці да ацэнкі гэтай рэчы: ці з'яўляецца яна фамільнай каштоўнасцю, ці захочаце вы пакінуць яе ў спадчыну дзецям і ўнукам, ці можаце вы выставіць яе на ўсеагульны агляд і ганарыцца ёю? Калі не можаце даць ясны адказ на падобныя пытанні — выкідвайце!

Калі хочаце навучыцца прыводзіць у парадак усе свае «камеры захоўвання», прыміце да ўвагі наступныя парады.

Спачатку дастаньце ўсё, што ёсць.

**Падзяліце ўсе рэчы на чатыры часткі:**

- тое, чым вы карыстаецеся штодня;
- тое, чым вы карыстаецеся хоць раз у тыдзень;
- тое, што вы бераце не радзей як адзін раз у месяц;
- тое, да чаго вы ўжо не дакраналіся як мінімум месяц.

**Уважліва разбярыце рэчы, якімі вы не карыстаецеся ўжо месяц:**

- сезонныя рэчы, якія спатрэбяцца вам наступнымі зімой, летам, вясной, восенню;
- рэчы, што не залежаць ад сезону, якія вы паклалі ў шафу, а потым папросту пра іх забыліся.

Складзіце забытыя «міжсезонныя» рэчы ў дзве вялікія скрынкі. Адну скрынку назавіце «Аддаць» — у яе вы будзеце збіраць рэчы, ад якіх даўно час пазбавіцца, але выкінуць рука не паднімаецца. Другая скрынка пад назвай «Выкінуць».

«Сезонныя рэчы», якія не спатрэбяцца наступныя некалькі месяцаў, складзіце ў самым далёкім куце шафы.

Пасля гэтага пакладзіце назад у шафу рэчы, «якія вы бераце не радзей як адзін раз у месяц». Пачніце з прадметаў, якія выкарыстоўваеце радзей за ўсё.

Потым кладзіце «тыя, якімі карыстаецеся не менш чым адзін раз у тыдзень».

І ў самую апошнюю чаргу размяшчайце рэчы, якія патрэбныя штодня. Рабіце гэта так, каб было лёгка дастаць іх пры першай неабходнасці.

Паўтарайце гэтую працэдуру кожныя паўгода. Пасля рэарганізацыі прасторы для захоўвання вас здзівіць колькасць рэчаў, без якіх папросту абышліся, хоць раней думалі, што жыць без іх не зможаце.

ЁСЦЬ ІДЭЯ!

### Хлебны дом

**Для захоўвання хлеба сёння выкарыстоўваюць разнастайныя хлебніцы з металу, дрэва, пластыку. Але няма нічога лепш для захавання свежасці і смаку хлеба, чым ільняныя хлебніцы і мяшочкі для хлеба.**

Хлеб у льняным мяшочку можа захоўвацца 2-3 дні і не страціць водар і свежасць. Гэта адбываецца дзякуючы асаблівым якасцям ільну — ён стварае адмысловы мікраклімат для доўгага захоўвання хлеба.

А ў чым падаць хлеб на стол? Вельмі хораша выглядае падача хлеба ў ільняной хлебніцы. Яе можна афармiць гэтак жа, як і абрус або іншыя тэкстыльныя элементы сервіроўкі кухні. Такая хлебніца можа стаць прыемным сюрпрызам-падарункам. А зрабіць іх вельмі проста. Мяшочкі можна ўпрыгожыць вышыўкай або малюнкамі. А хлебніцы ажывіць яркай тасьмой. А можна проста пашыць ільняныя сурвэткі і класці іх на дно посуду, у якім звычайна падаецца хлеб да стала.

-2748-

-2749-

САЛОН ПРЫГАЖОСЦІ

### Выбіраем лак для пазногцяў

**Можна выбраць лак у тон памадзе ці сумачкі з туфлямі, але значна больш граматна падбіраць тоны, якія спалучаюцца з вашай скурай.**

Для ўладальнікаў скуры персікавага колеру, колеру слановай косці ці залаціста-карычневай падыходзяць усе цёплыя тоны — аранжавы, медны, цёмна-чырвоны і інш.

Для тых, у каго скура руковая, падыдзе ружовы любога адцення, аранжава-чырвоны і каралава-чырвоны.

Да аліўкавай і бледнай скуры будуць пасаваць цёмна бардовыя адценні, цёмныя адценні руковага, белы і чырвоны тоны. Аднак будзьце ўважлівыя: некаторыя адценні візуальна стараць скуру.

## СІМВАЛ МУЖЧЫНСКАГА ПАЧАТКУ

**Шлюбная ці сямейная сімволіка барон была перадвызначана іх сельскагаспадарчым прызначэннем — павялічваць урадлівасць зямлі. Барану як сімвал мужчынскага пачатку супрацьпастаўлялі зямлі (жаночаму пачатку). Таму іх часам выкарыстоўвалі і ў вясельным абрадзе. Напрыклад, у выпадку адмовы сватам у калёсы клалі барану. На баронах вазілі свата, які не здолеў засватаць дзяўчыну.**

- Калі нявеста была «нячэснай», барану закідвалі на дах хаты бацькоў ці па вёсцы на баране вазілі яе маці. У Віцебскай вобласці па гэтай жа прычыне свякроўка пры народзе прымушала нявестку перастуліць цераз барану.
- На Масленку ў пакаранне за тое, што не знайшлі сабе нявесту, на баронах па вёсцы вазілі хлопцаў.
- Лічылася, калі хтосьці з аднавяскоўцаў забудзецца на полі барану, на працягу года вёску абыдуць усе сваты і ніводная дзяўчына не возьме шлюб, а вёска вымра. Каб «перакрыць» такія дзеянні, незамужнія дзяўчаты цягалі па вёсцы старую барану, потым ламалі яе і кідалі па ўскрайках дарогі.
- Часам дзяўчаты выкарыстоўвалі барану ў магічных рытуальных дзеяннях, каб паўплываць на свой шлюб. Напрыклад, у Пятроў дзень барану насілі на галаве з адной вёскі ў другую. Лічылася: дзе барана застанецца — там і замуж выйдзеш.
- Каб прыехалі доўгачаканыя сваты, у ноч пад Ражство дзяўчаты ламалі і секлі старыя бароны і раскідвалі па полі, імітуючы тым самым веснавы сеў.
- На Масленку старыя бароны спальвалі на скрыжаванні шляхоў і прасілі даслаць сватоў: «Барана, дагарай, нашых дзевак разбірай».
- У той жа час зуб ад бараны мог стаць і сямейнай трагедыяй, калі хтосьці з нядобразычліўцаў у пэўны дзень года забіваў яго ў кут хаты. Тады дзяўчына назаўсёды застанецца жыць з бацькамі і не народзіць дзіця.
- Лічылася, што асаблівай магічнай сілай валодае барана, выраблената з асіны, ці барана з жалезнымі зуб'ямі.
- Бароны, якія прыйшлі ў заняпад, нельга было выкідаць: гэта лічылася грахом. Іх не выкарыстоўвалі ў рытуальных дзеяннях, часам замацоўвалі на слупах ці старых дрэвах, каб буслы маглі скарыстаць іх для будаўніцтва сваіх гнёздаў. Такое гняздо прадказвала гаспадарцы асаблівую ахову і дабрабыт.
- «Зубам» ад барон народныя лекары замаўлялі зубны боль.
- Для таго, каб «выклікаць» доўгачаканы дождж у час летняй засухі, барану неслі да ракі, возера, дзе ўдовы «бараналі» ваду.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся

**— Што робяць людзі, калі ім адключылі святло?**

**— Правільна, бягуць да акна паглядзець, якім яшчэ дамам электрычнасць вырубілі.**

☺

Вельмі поўная жанчына, якая хацела пахудзець, павесіла ў сябе ў кухні напамінак: «Я не ем пасля шасці». Муж дапісаў: «РАНІЦЫ!».

☺

**Інспектар ДАІ заспеў жонку з палюбоўнікам, але за 50000 рублёў заплюшчыў вочы на інцыдэнт.**

☺

Жонка пілуе мужа:

— Нічога ў хаце не робіш... Хоць бы ўрокі раз з дзіцем зрабіў!

Муж, вінавата:

— Сын, ідзі сюды. Што там табе па ядзернай батаніцы задалі?..

☺

**Адэская перасцярога:**

**— Не дай вам Бог убачыць, як эстонец падымаецца па Пацёмкінскай лесвіцы.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 2175. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12